WWW.ZVIAZDA.BY — на 12 гадзін раней

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

11 СТУДЗЕНЯ 2011 г.
АЎТОРАК
№ 4
(26868)

Кошт 650 рублёў

ВЫДАЕЦЦА З 9 ЖНІЎНЯ 1917 г.

Фота БЕЛТА.

АЛЯКСАНДР ЛУКАШЭНКА ЗАПАЛІЎ КАЛЯДНУЮ СВЕЧКУ Ў ХРАМЕ-ПОМНІКУ Ў ГОНАР УСІХ СВЯТЫХ

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка 7 студзеня запаліў калядную свечку ў Храме-помніку ў гонар Усіх Святых у Мінску.

Кіраўнік дзяржавы наведаў ніжні прыдзел храма-помніка ў гонар Іаана Хрысціцеля, які быў асвячоны ў снежні 2010 года, дзе разам з Мітрапалітам Мінскім і Слуцкім, Патрыяршым Экзархам усяе Беларусі Філарэтам запаліў калядную свечку. Аляксандр Лукашэнка таксама агледзеў інтэр'ер прыдзела, яго алтарную частку.

Прэзідэнт паслухаў песнапенні ў выкананні хору Усіхсвяцкага прыхода і паразмаўляў з яго ўдзельнікамі.

Прэзідэнт падзякаваў Мітрапаліту Філарэту і ўсім свяшчэннаслужыцелям Беларусі за тытанічную работу па захаванні і адраджэнні духоўнай спадчыны. Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што яму вельмі падабаецца гэты храм, паколькі ён любіць кампактныя невялікія храмы, дзе ўтульна і можна пабыць аднаму і з Госпадам Богам. У сваю чаргу Мітрапаліт Філарэт благаславіў Аляксандра Лукашэнку на паспяховае прэзідэнцкае служэнне беларускаму народу.

Кіраўнік беларускай дзяржавы і Мітрапаліт Філарэт таксама абмяняліся падарункамі. Аляксандр Лукашэнка перадаў у дар Беларускай праваслаўнай царкве так званае напрастольнае Евангелле. Гэта кніга выдадзена спецыяльна для выкарыстання ў богаслужэбных мэтах. Евангелле выкарыстоўваецца ў час літургіі для чытання свяшчэннаслужыцелем. Кніга надрукавана ў выдавецтве Украінскай праваслаўнай царквы. Пазалочаная аправа выраблена на прадпрыемстве «Софрына» Маскоўскай патрыярхіі.

Мітрапаліт Філарэт падарыў Аляксандру Лукашэнку абраз Іаана Прадцечы.

Потым Аляксандр Лукашэнка азнаёміўся з ходам будаўніцтва і аддзелачных работ храма-помніка. На гэтым унікальным аб'екце многія будаўнічыя тэхналогіі і прыёмы выкарыстоўваліся ўпершыню. Храм-помнік стаў своеасаблівай эксперыментальнай пляцоўкай для ўкаранення новых будаўнічых ДАСТаў. Аляксандр Лукашэнка адзначыў высокую якасць работ і падкрэсліў, што для будаўнікоў гэта ўзор таго, як трэба правільна, разумна і эканомна будаваць.

Аляксандр Лукашэнка наведаў адміністрацыйны будынак храма-помніка, дзе азнаёміўся з арганізацыяй работы ў ім. Потым кіраўнік беларускай дзяржавы і Мітрапаліт Філарэт прадоўжылі размову за чаяпіццем.

Комплекс храма-помніка будуецца пры значнай фінансавай падтрымцы дзяржавы. Ён павінен стаць агульнанацыянальным мемарыялам, у якім натуральна пераплятаюцца царкоўныя традыцыі, гістарычнае мінулае і сучаснае краіны. Храм-помнік мае форму шатра, увянчанага крыжом. Шацёр сімвалізуе Божую Маці і Хрыста на чале Царквы. Злева ад шатра знаходзяцца два бакавыя прыдзелы храма-помніка — ніжні і верхні.

Усе сцены ніжняга прыдзела ў гонар Іаана Хрысціцеля распісаны сцэнамі, што расказваюць пра падзеі з зямнога жыцця святога. Роспісы і абразы, размешчаныя ў прыдзеле, выкананы мастакамі расійскай майстэрні «Палехскі Іканастас». Намаляваныя на сценах фігуры крыху меншыя за чалавечы рост, што стварае адчуванне расшыранай прасторы, некаторай аддаленасці адлюстраванага сюжэта. У гэтай жа майстэрні выраблены іканастас, элементы алтара і рэчаў: бажніц, прастола, трона, вынасных крыжа і харугваў і іншыя. Для іканастаса прыдзела ў гонар Іаана Хрысціцеля выкарыстаны каштоўныя пароды чырвонага дрэва, а таксама сусальнае золата для частковай пазалоты разьбы і царскіх дзвярэй.

Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

Аляксандр ЛУКАШЭНКА:

«НАЦЫЯНАЛЬНАЯ КУЛЬТУРА НАБЫВАЕ ЎСЁ БОЛЬШАЕ ЗНАЧЭННЕ ЯК НАДЗЕЙНЫ ГАРАНТ ЗАХАВАННЯ САМАБЫТНАСЦІ НАРОДА»

Нацыянальная культура набывае ўсё большую палітычную сілу і значэнне як надзейны гарант захавання ідэнтычнасці і самабытнасці народа, каштоўнейшая канкурэнтная перавага ва ўмовах глабалізацыі. Аб гэтым заявіў Аляксандр Лукашэнка 8 студзеня ў Палацы Рэспублікі на цырымоніі ўручэння прэмій Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь «За духоўнае адраджэнне» і спецыяльных прэмій Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь дзеячам культуры і мастацтва.

Кіраўнік дзяржавы адзначыў, што ўручэнне прэмій не выпадкова праводзіцца ў калядныя святы. Па добрай традыцыі ў гэтыя дні на самым высокім дзяржаўным узроўні падводзяцца вынікі мінулага года. Уручэнне калядных прэмій — гэта, па сутнасці, усенародны агляд творчых сіл краіны, красамоўнае сведчанне таго, якім грамадскім прызнаннем карыстаецца кожнае дасягненне, кожны значны крок на шляху мастацтва, міласэрнасці, маральных пошукаў, служэння людзям і Айчыне.

Прэзідэнт падкрэсліў, што спрадвеку Беларусь па праву славіцца як зямля падзвіжнікаў і мудрацоў, дзе вышэй за ўсё цэняць духоўнасць, асвету і, вядома ж, кнігу. «Вялікую ролю ў гэтым адыграла Праваслаўная царква, якая з часоў прападобнай Еўфрасінні Полацкай нязменна несла беларусам святло дабра і прыгажосці», — адзначыў ён.

Беларускія храмы і замкі, абрады і легенды, літаратура і бясцэнныя шэдэўры мастацтва складаюць неад'емную частку сусветнай спадчыны, падкрэсліў Прэзідэнт.

«Мы разглядаем нацыянальную культуру як стратэгічны рэсурс краіны, краевугольны камень нашай незалежнасці, без якога не можа быць суверэннай і квітнеючай дзяржавы», — заявіў кіраўнік дзяржавы.

СТАР. 2

БЕЛАРУСБАНК

Открытое акционерное общество
«Сберегательный банк «Беларусбанк»,
расположенное по адресу: 220050, г. Минск, ул. Мясникова, 32,

СООБЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ 17 ЯНВАРЯ 2011 ГОДА ВНЕОЧЕРЕДНОГО ОБЩЕГО СОБРАНИЯ АКЦИОНЕРОВ В ЗАОЧНОЙ ФОРМЕ СО СЛЕДУЮЩЕЙ ПОВЕСТКОЙ ДНЯ:

1. Об оказании безвозмездной (спонсорской) помощи.
2. О внесении изменения в решение Общего собрания акционеров по вопросу об оказании безвозмездной (спонсорской) помощи.
3. Об утверждении нормативов расходования средств из прибыли в 2011 году.
4. О внесении изменений и дополнений в Устав ОАО «АСБ Беларусбанк».

Акционеры ОАО «АСБ Беларусбанк» могут ознакомиться с информацией по вопросам повестки дня и заполнить бюллетень для заочного голосования (до 14 января), а также с решениями, принятыми внеочередным Общим собранием акционеров банка (после 17 января) по адресу: г. Минск, ул. Мясникова, 32, комн. 704(в), а также в филиалах – областных (Минском) управлениях, филиалах банка.

Дата окончания приема бюллетеней – 14 января 2011 года.
Телефоны для справок: (8 017) 218 84 65, 218 84 73.

Лицензия на осуществление банковской деятельности № 1 от 28.08.2008 г., выданная Национальным банком Республики Беларусь. УНП 100325912.

ISSN 1990 - 763X

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 11.01.2011 г. (для б/н разлікаў)				Курсы замежных валют для безнаяўных разлікаў Цэнтрабанк РФ	
▲ 1 долар ЗША	3 015,00	1 чэшская крона	158,08	USD	30,3505
▼ 1 еўра	3 886,94	1 польскі злоты	996,84	10 UAH	38,0929
1 латвійскі лат	5 542,79	▲ 1 расійскі рубель	98,93	1000 BYR	10,1135
1 літоўскі літ	1 126,18	1 украінская грыўня	378,53	EUR	40,4876



ПРАКАВЕТНАЕ

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

РЫХТУЙЦЕСЯ, ДА ВАС ІДЗЕ «КАЗА»!

Сустракаць «казу» трэба весела, пажадана ўсёй сям'ёй за багатым сталом. Нельга забываць, што каза можа ўпасці пасярод хаты і без падарунка-пачастунка не ўстане. Сімвал урадлівасці і дабрабыту, яна можа дазволіць сабе розныя свавольствы. А яшчэ трэба ведаць, дзе каза ходзіць — там жыта родзіць, дзе каза рогам — там хлеб стогам, дзе каза нагою — там жыта капою..! Дбайнаму і гаспадарліваму жыхару не будзе лішне пасябраваць з чароўнаю жывёлай і з тымі, хто правядзе яе ад хаты да хаты. Бо з калядніками прыходзіць на нашу вуліцу сапраўднае свята, якому тысячы і тысячы гадоў.

СТАР. 3

ГАЛАЛЁДЗІЦА, А ПАДМАРОЗІЦЬ ТОЛЬКІ БЛІЖЭЙ ДА ВЫХАДНЫХ

Сёння на тэрыторыю Беларусі завітае халодны атмасферны фронт і зноў падмарозіць, паведаміла рэдакцыі галоўны сіноптык Рэспубліканскага гідраметцэнтра Мінпрыроды Вольга ФЯДОТАВА.

Тэмпература паветра ўдзень 1—6 марозу, толькі на поўдні Брэсцкай і Гомельскай абласцей на працягу сутак каля 0. На паўднёвым усходзе краіны будзе ісці мокры снег. У паўднёвых раёнах туман, на дарогах галалёдзіца.

А вось у сераду—чацвер да нас зноў прыйдзе цёплае паветра з боку паўднёвага захаду Еўропы. Часам чакаюцца ападкі ў выглядзе мокрага снегу і дажджу. Месцамі туман і галалёд, на дарогах галалёдзіца. Тэмпература ўдзень ад мінус 5 на поўначы да плюс 2 градусаў на поўдні, удзень ад 3 марозу да 4 цяпла.

Аднак ужо ў пятніцу ў Беларусь зноў завітае арктычны холад з боку Скандынавіі. Уначы паўсюдна, а ўдзень на ўсходзе краіны пройдзе снег. Падмарозіць. Уначы будзе 2—9, пры праясненні да мінус 12 градусаў, удзень 0—7 марозу. Захаваецца мароз і ў суботу. Часам месцамі будзе ісці снег. Уначы маразы ўзмацняцца да 6—13, пры праясненнях да мінус 15—18 градусаў, на паўднёвым захадзе Брэсцкай вобласці 1—5 марозу. Удзень 0—7 марозу, на паўднёвым захадзе краіны — 1—3 цяпла.

Сяргей КУРКАЧ.

Грошы

ПОПЫТ НА ВАЛЮТУ ЗНІЗІЎСЯ Ў НЕКАЛЬКІ РАЗОЎ

Напачатку года беларусы штодня куплялі валюты ў сярэднім амаль у 15 разоў менш, чым у снежні

Фантастычнага ўзлёту ні курсу долара, ні курсу еўра ў краіне не адбылося, што, трэба думаць, істотна паўплывала і на сітуацыю на валютным рынку: у «абменніках» зараз няма таго ажыятажнага попыту на цвёрдаканверсоўную, які назіраўся напярэдадні 2011 года. Менавіта з дэвальвацыйнымі чуткамі і чаканнямі насельніцтва спецыялісты звязваюць тэндэнцыю апошніх месяцаў мінулага года, калі людзі пайшлі ў пункты абмену валюты і пачалі ліхаманкава скупляць долары і еўра: чакаючы непрыемных сюрпрызаў з нацыянальнай валютай, яны такім чынам спрабавалі засцерагчы свае сродкі.

Аднак сёлета курс беларускага рубля, калі параўноўваць кошт валютнага кошыка ў апошні дзень 2010 года з тым, які ўстаноўлены сёння, умацаваўся — на 0,39 працэнта. Гэта значыць, істотнага аслаблення нацыянальнай валюты ў першыя дні ўжо новага года, чым пужалі насельніцтва ў асобных «прагнозах», не адбылося. Што адбілася і на рынку наяўнай валюты, дзе «апетыт» насельніцтва значна ўпаў. Як паведамілі карэспандэнту «Звязды» ва Упраўленні інфармацыі Нацыянальнага банка Беларусі, калі ў снежні фізічныя асобы штодня ў сярэднім куплялі на 22,1 мільёна долараў у эквіваленце больш, чым прадавалі, то ў студзені попыт на цвёрдаканверсоўную значна знізіўся — на чыстай аснове ў сярэднім купляецца каля 1,5 мільёна долараў. У галоўным банку ўпэўненыя ў тым, што неўзабаве рынак наяўнай валюты выйдзе на станоўчае сальда, гэта значыць, людзі будуць прадаваць валюты больш, чым купляць.

Між іншым, дэвальвацыйныя чаканні насельніцтва летась паўплывалі і на велічыню золатавалютных рэзерваў краіны. Золатавалютныя рэзервы Беларусі, разлічаныя па методыцы Міжнароднага валютнага фонду, на пачатак студзеня гэтага года склалі 5 мільярдаў 30,7 мільёна долараў, скараціўшыся за мінулы год на 11 працэнтаў. Пры гэтым у снежні яны скараціліся на 11,8 працэнта — больш як на 674 мільёны долараў. Значная іх частка, падкрэслілі ў Нацыянальным банку, пайшла на тое, каб задаволіць узросшы попыт беларусаў на замежную валюту.

Ігар ШЧУЧЭНКА.

Як нас дураць!

АБЯЦАЎ АДРАМАНТАВАЦЬ АЎТО

Махляр «уціраўся» у давер да аўтааматараў і багацеў за кошт прасцякоў.

Спецыялізаваўся ж 36-гадовы мінчанін на падмане жанчын, пэнсіянераў аўтамабілістках і аўтаўладальніцах: паводле звестак прэс-афіцэра Савецкага РУУС Вольгі Яскевіч, са сваімі ахвярамі прайдзісвет знаёміўся на вуліцы ці праз знаёмых і ўваходзіў да іх у давер. А потым прапаноўваў ім даставіць з-за мяжы аўтамабіль альбо адрамантаваць «жалезнага каня», калі такі меўся. Зразумела, не за дзякуй, а браў у клієнтаў грошы. Калі ж такія паслугі не патрабаваліся, то абяцаў уладкаваць у аўташколу. І таксама не за дарма — прасіў 150 тысяч рублёў за гэткую паслугу. Аднак ні ў адным з выпадкаў не трымаў сваё слова, ды і грошай не вяртаў. Паводле звестак праваахоўнікаў, такім чынам ён пабагацеў на 6 тысяч долараў. Прычым гэта не канчатковая сума, бо, мяркуецца, хітрун «зарабіў» куды больш. Махляр затрыманы, у дачыненні да яго заведзеная крымінальная справа, прадпрымальнай асобе «свеціць» да 7 гадоў пазбаўлення волі.

Ігар ГРЫШЫН.

ГУЛЬНЯ НА ЧУЖЫЯ ГРОШЫ

29-гадовы жыхар Мінска, які працаваў на гомельскім прыватным прадпрыемстве па ўстаноўцы вокнаў і дзвярэй з ПВХ па вуснай дамоўленасці, тройчы заключыў ад імя фірмы дагаворы на абслугоўванне грамадзян. Аднак грошы ў суме 4 мільёны 300 тысяч рублёў прысвоіў. Яго наймальнік звярнуўся ў міліцыю. Высветлілася, што працаўнік не вытрымаў спакусы вялікімі грашыма і добра бавіў час у мясцовых казіно. Пасля высвятлення абставін здарэння «гулец» чужымі сродкамі кампенсаваў нанесены ўрон.

НАСВАЙ ПАД ВЫГЛЯДАМ СУХАФРУКТАЎ

У кардонных скрынках з-пад сухафруктаў гамяльчанін захоўваў у сябе дома 400 кг насваю.

Небяспечнае рэчыва знойдзена і канфіскавана ў ходзе аператыўна-вышуковых мерапрыемстваў па выяўленні парушэнняў у сферы незаконнага абарачэння тавараў падакцызнай групы, — паведамілі ў прэс-службе УУС Гомельскага аблвыканкама. «Тавар», які належаў індывідуальнаму прадпрымальніку, ураджэнцу Таджыкістана, ацэньваецца прыкладна ў 150 мільёнаў беларускіх рублёў. Старшы оперупаўнаважаны ўпраўлення па раскрыцці цяжкіх эканамічных злачынстваў УУС Гомельскага аблвыканкама Аляксандр Кушняроў адзначае, што гэта самая буйная партыя такога рэчыва, выяўленая на тэрыторыі Беларусі: «Хутчэй за ўсё, яна ўвезена з краін Сярэдняй Азіі, магчыма Таджыкістана, транзітам праз Расію пад выглядам сухафруктаў. Гэты прадукт планавалася расфасаваць у поліэтыленавыя пакункі, кожны вагой 5-8 грамаў для наступнай рэалізацыі на рынках Гомеля і вобласці».

Ірына АСТАШКЕВІЧ.

ЗА ШТО ФЕРМЕРЫ ПРАПАНОЎВАЮЦЬ ПРЫЦЯГВАЦЬ ДА АДКАЗНАСЦІ МЯСЦОВЫХ ЧЫНОЎНІКАЎ?

Днямі ў сценах Міністэрства сельскай гаспадаркі і харчавання абмеркавалі праект Дзяржаўнай праграмы развіцця і падтрымкі сялянскіх (фермерскіх) гаспадарак на 2011-2015 гады. Прыняцце (дарэчы, упершыню за гісторыю фермерскага руху. — Н. Д.) такой праграмы, спадзяюцца фермеры Беларусі, дапаможа пазбавіцца ад набалелых праблем. Пра тое, што сёння хвалюе кіраўнікоў фермерскіх гаспадарак і як на іх прапановы адрэагаваў міністр сельскай гаспадаркі і харчавання Міхаіл РУСЫ, чытайце ніжэй.

«Дык у паветры ці дзе нам вырошчваць гародніну?..»

Самым праблемным пытаннем, паводле слоў кіраўнікоў фермерскіх гаспадарак, з'яўляецца выдзяленне зямлі. І справа тут нават не ў заканадаўчай базе, а хутчэй у адносінах мясцовай улады да фермераў.

— Нашы законы дазваляюць выдзяляць зямлю фермерам, — кажа **кіраўнік фермерскай гаспадаркі «АВС-агра» Маладзечанскага раёна Уладзімір АРЦЮКЕВІЧ**. — Аднак мясцовыя органы чамусьці робяць гэта з асцярогай.

— Тут у зале сядзіць фермер, які б'ецца з гэтай праблемай ужо цэлы год, — дадаў **Уладзімір УШКЕВІЧ, генеральны дырэктар Гродзенскай абласной асацыяцыі фермераў**. — Ён не раз звяртаўся і ў райвыканкам, і ў СВК з просьбай вылучыць яму ўчастак. Пытанне і дагэтуль не вырашылася толькі з-за таго, што работнікі СВК з перавагай у тры галасы без тлумачэння прычын адмовілі яму ў выдзяленні зямлі... Фермеры не разумеюць, чаму для атрымання зямлі іх адпраўляюць узгадняць гэтае пытанне з кіраўніком гаспадаркі? Ён жа не ўласнік, а такі ж землекарыстальнік, як кожны з нас.

З акрэсленай праблемай не раз сутыкалася і кіраўнік фермерскай гаспадаркі **«Фартуна-агра» Баранавіцкага раёна Галіна МАТУС**. Каб расшырыць свае ўладанні, ёй з мужам давялося не адзін год абіваць парогі дзяржаўных арганізацый. Улады як быццам ідуць насустрач, але... Прыходзіш да старшыні райвыканкама — ён не адмаўляе, ідзеш да кіраўніка гаспадаркі, а ён кажа: «Я нікому нічога не даю». Пасля зноў да старшыні райвыканкама. І так па коле. Жанчына звязвае гэта з тым, што «як добраму, так і «ляжачаму» СВК не патрэбны паспяховы фермер, які б блытаўся ў іх пад нагамі ці сядзеў, як скула, пад носам».

— Добра было б, калі б у дакументах прапісалі, што мясцовыя ўлады павінны даваць, напрыклад, 10 адсоткаў зямельных угоддзяў у карыстанне фермерам, — выступіла з прапановай Галіна Матус. — Тады б усе пытанні адпалі самі сабой. І нам не трэба было б марнаваць свае нервы і час на безвыніковыя паходы па кабінетах. Для размеркавання ж зямлі можна было б стварыць пры райвыканкамах кампетэнтную камісію, якая б і вырашала, каму дастанецца на гэты раз той ці іншы ўчастак. Я дапускаю, што для таго, каб стаць прэтэндэнтам на зямлю, фермерам давядзецца прапанаваць на суд камісіі свой бізнэс-план. Бо фермерская гаспадарка апрыёры павінна быць арыентавана на тое, што яна будзе атрымліваць з гэтай зямлі не меншы прыбытак, чым цяперашні яе ўладальнік.

Старшыня ж грамадскага аб'яднання «Асацыяцыя фермераў Гомельскай вобласці» Міхаіл БАЙДА прапаноўвае прадугледзець адказнасць мясцовай улады, якая насуперак заканадаўству ставіць фермерам палкі ў колы.

— Інакш праграма так і застанецца на паперы, — лічыць ён. — А калі зямлі не дадуць, дык у паветры ці дзе нам вырошчваць гародніну, бульбу, збожжа?..

КАМЕНТАР МІНІСТРА СЕЛЬСКАЙ ГАСПАДАРКІ І ХАРЧАВАННЯ:

«Вы ўсе, пэўна, чулі, што кіраўнік дзяржавы паставіў задачу за пяцігодку кожны кавалак зямлі пусціць у абарот. Як вядома, рашэнні аб выдзяленні зямель знаходзяцца ў кампетэнцыі мясцовых органаў улады. І пакуль што, вымушаны з вамі пагадзіцца, на месцах не ўсё робіцца так, як мае быць. Вось толькі адзін прыклад: фермер прасіў аддаць яму закінутую стайню. Пакуль вырашалася гэта пытанне, стайня разбурылася... А калі б аддалі памяшканне ў добрыя рукі, то на яе месцы з'явілася б яшчэ адно сховішча і фермер змог бы вырошчваць не 600 тон буракоў, а ў два разы больш. Ёсць людзі, і іх нямала, якія гатовы ўзяць 300 гектараў зямлі і за свае сродкі засадзіць яе садам, пабудаваць сховішча. Дык трэба аб'явіць тэндар і выбраць таго ахвотніка, які зробіць гэта на лепшых умовах. Будзем шукаць і іншыя рашэнні, прымяняць на практыцы і іншыя падыходы. У нас на сёння дастаткова шмат зямлі, якую можна выкарыстаць з карысцю. І яе трэба выдзяляць, у тым ліку і фермерам».

СТАР. 4

Грошы

Кіраўнік КДК заяўляе пра недапушчальнасць мястачковых забарон на рэалізацыю прадукцыі з іншых рэгіёнаў краіны

Пра гэта і шмат іншае ішла размова на нарадзе Камітэта дзяржкантролю, на якой абмяркоўвалася Дырэктыва №4 «Аб развіцці прадпрымальніцкай дзейнасці і стымуляванні дзелавой актыўнасці», паведамілі карэспандэнту «Звязды» ў прэс-службе кантрольнай установы.

Падчас абмеркавання дакумента асаблівая ўвага была нададзеная палажэнням Дырэктывы, якія датычацца кантрольнай і назіральнай дзейнасці. Паводле слоў старшыні Камітэта дзяржкантролю Аляксандра Якабсона, у дзейнасці КДК павінна значна ўзрасці колькасць прывентыўных мерапрыемстваў. Ён падкрэсліў, што ў працы на папярэджанне асноўны ўпор неабходна зрабіць на прафілактыку. Дзяржкантроль павінен выконваць галоўную сваю функцыю — функцыю кантролю. Пры гэтым, адзначалася на нарадзе, трэба больш займацца выяўленнем існуючых праблем і прапаноўваць шляхі іх вырашэння. Аляксандр Якабсон паставіў перад работнікамі КДК задачу арганізаваць больш шчыльнае ўзаемадзеянне з іншымі кантралюючымі і назіральнымі органамі. Яшчэ адзін важны напрамак, пра які ішла гутарка, — канструктыўны дыялог з прадстаўнікамі бізнэсу. Кіраўнік камітэта адзначыў, што сустрэчы і семінары з удзелам прадпрымальнікаў павінны стаць адным са спосабаў прафілактычнай работы па папярэджанні парушэнняў. «У Камітэце дзяржкантролю, — падкрэсліў Аляксандр Якабсон», — ёсць пэўныя напрацоўкі, існуе практыка выяўлення парушэнняў, неабходна іх паказваць людзям, інфармаваць пра іх». У ходзе абмеркавання іншых палажэнняў Дырэктывы, у прыватнасці, згадвалася пра недапушчальнасць мястачковых забарон на рэалізацыю прадукцыі з іншых рэгіёнаў краіны, спрошчаны парадак давання зямлі суб'ектам гаспадарання, скарачэнне адміністрацыйных працэдур і іншыя раздзелы Дырэктывы, накіраванай на далейшую лібералізацыю эканомікі і стварэнне ўмоў для развіцця прадпрымальніцтва.

Ігар ГРЫШЫН.

Зачапіла!

Чаму ў Ласток няма дарогі?

Дарога павінна быць, бо гэта адзін з куточкаў славутай Коласавай зямлі. Сюды павінны ехаць экскурсіі, ісці і ехаць людзі. Асабліва ў час зімовых школьных канікулаў і калядных святаў. Але якія там экскурсіі, калі дарогу замяло настолькі, што нават вялікія грузавыя аўтамабілі не здольныя прабіцца? Два з паловаю кіламетры па лесе пасля снежаньскіх завей аказаліся непераадольнымі. Навігацыя, як кажуць, спынілася. Трактар сюды не накіроўваюць, хоць зусім побач знаходзіцца вялікая вёска Сверынава і тэхнікі хапае. Адзіная жыхарка ў Ласткy, яна ж захавальніца сядзібы Лідзія Міхайлаўна Краснік, кожную зіму перажывае падобнае бедства, але сёлета не вытрымала і пазваніла ў рэдакцыю.

СТАР. 3

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

У БЕЛАРУСІ ЛЬГОТНЫЯ КРЭДЫТЫ НА СПАЖЫВЕЦКІЯ ПАТРЭБЫ МОЖНА БУДЗЕ ВЫКАРЫСТОЎВАЦЬ ДЛЯ КУПЛІ ТАВАРАЎ У ІП

У Беларусі з выкарыстаннем ільготных крэдытаў на спажывецкія патрэбы можна будзе купляць тавары ў індывідуальных прадпрымальнікаў. Гэта норма прадугледжана ўказам № 11 «Аб унясенні змяненняў і дапаўнення ва Указ Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 6 ліпеня 2009 г. № 371», які 6 студзеня падпісаў кіраўнік дзяржавы Аляксандр Лукашэнка.

Указ прадугледжвае прадаўжэнне перыяду прадастаўлення грамадзянам ільготных крэдытаў на спажывецкія патрэбы да 2011 года і магчымасць набыцця тавараў з выкарыстаннем ільготных крэдытаў у індывідуальных прадпрымальнікаў.

У адпаведнасці з указам ад 6 ліпеня 2009 года № 371 «Аб ільготным спажывецкім крэдытаванні», адкрытымі акцыянернымі таварыствамі «Ашчадны банк «Беларусбанк», «Белагрпрамбанк», «Беларускі банк развіцця і рэканструкцыі «Белінвестбанк» і «Белпрамбудбанк» у 2009-2010 гадах грамадзянам прадастаўляліся льготныя крэдыты на спажывецкія патрэбы для набыцця тавараў па пераліку, які вызначаецца ўрадам.

Паводле інфармацыі гэтых акцыянерных таварыстваў, попыт насельніцтва на гэты від крэдыту павялічваецца. У асноўным з выкарыстаннем ільготных спажывецкіх крэдытаў набываюцца мэблева і бытавая тэхніка. За 9 месяцаў 2010 года насельніцтву выдадзена спажывецкіх крэдытаў на суму больш як Br42 млрд.

Указам таксама прадугледжваецца магчымасць набыцця спажывецкіх тавараў з выкарыстаннем ільготных крэдытаў у індывідуальных прадпрымальнікаў, якія ажыццяўляюць продаж тавараў праз гандлёвыя аб'екты.

Указ уступае ў сілу пасля яго афіцыйнага апублікавання.

Указам Прэзідэнта Беларусі тэрмін паўнамоцтваў старшыні праўлення Нацбанка Пятра Пракаповіча прадоўжаны да 2015 года

Кіраўнік дзяржавы Аляксандр Лукашэнка сваім указам у адпаведнасці з артыкуламі 61, 62 Банкаўскага кодэкса Рэспублікі Беларусь паставіў прадоўжыць тэрмін паўнамоцтваў старшыні праўлення Нацыянальнага банка Беларусі Пятра Пракаповіча, членаў праўлення Нацыянальнага банка Валянціны Азарэвіч, Юрыя Алымава, Мікалая Лузгіна, Уладзіміра Сянько да 31 снежня 2015 года.

АЛЯКСАНДР ЛУКАШЭНКА АДОБРЫЎ ПРАЕКТ ПАГАДНЕННЯ ПАМІЖ УРАДАМІ БЕЛАРУСІ, КАЗАХСТАНА І РАСІІ АБ ТРАНСПАРТНЫМ КАНТРОЛІ НА ЗНЕШНЯЙ ГРАНІЦЫ МС

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка ўказам № 8 ад 6 студзеня адобрыў у якасці асновы для правядзення перагавораў праект пагаднення паміж урадамі Беларусі, Казахстана і Расіі аб ажыццяўленні транспартнага (аўтамабільнага) кантролю на знешняй граніцы Мытнага саюза.

Міністр транспарту і камунікацый Беларусі Іван Шчэрба ўпаўнаважаны на правядзенне перагавораў па праекце гэтага пагаднення і яго падпісанне пры дасягненні дамоўленасці ў межах адобранага праекта.

Эмір Катара павіншаваў Аляксандра Лукашэнку з перавыбранне на прэзідэнцкую пасаду

Аляксандра Лукашэнку з перавыбраннем на пасаду Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь павіншаваў Эмір Дзяржавы Катар шэйх Хамад бен Халіфа аль-Тані.

«Упэўнены, што адносіны дружбы і партнёрства паміж нашымі краінамі будуць развівацца і ўмацоўвацца ў ходзе вашага новага прэзідэнцкага тэрміну», — гаворыцца ў віншаванні.

УЗНАГАРОДЖАНЫ ОРДЭНАМІ І МЕДАЛЯМІ

Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь Аляксандр Лукашэнка падпісаў указ № 7 аб узнагароджанні дзяржаўнымі ўзнагародамі, у адпаведнасці з якім 65 чалавек удастоены ордэнаў і медалёў.

Ордэнам Айчыны III ступені ўзнагароджаны дырэктар ААТ «Шані-аграпрадукт» Пружанскага раёна Васіль Сарока, ордэнам «За службу Радзіме» III ступені — падпалкоўнік Юрый Мацюкевіч.

Ордэна Пашаны ўдастоены машыніст экскаватара Пружанскага прадпрыемства меліярацыйных сістэм Сцяпан Адамчук, аператар машыннага даення птушкафабрыкі «Дружба» Баранавіцкага раёна Ірына Жывула.

У ліку ўзнагароджаных медалём «За працоўныя заслугі» — трактарыст-машыніст сельскагаспадарчага вытворчага кааператыва «Дарапеевічы» Маларыцкага раёна Сяргей Бойка, загадчык аддзялення рэанімацыі і інтэнсіўнай тэрапіі для хворых хірургічнага профілю Гарадской клінічнай бальніцы хуткай медыцынскай дапамогі Мінска Аляксандр Карпук.

Ганаровае званне «Заслужаны дзеяч навукі Рэспублікі Беларусь» прысвоена дырэктару Інстытута глебазнаўства і аграхіміі Віталю Лапу.

Аляксандр Лукашэнка накіраваў спачуванні Прэзідэнту Ірана ў сувязі з авіякатастрофай

Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь Аляксандр Лукашэнка ад імя беларускага народа і сябе асабіста накіраваў глыбокія спачуванні Прэзідэнту Ісламскай Рэспублікі Іран Махмуду Ахмадзінежаду ў сувязі з гібеллю грамадзян гэтай краіны ў авіякатастрофе.

«У Рэспубліцы Беларусь з глыбокім болем і смуткам успрынялі вестку аб трагічнай гібелі людзей у выніку авіякатастрофы каля горада Урмія», — гаворыцца ў спачуванні.

Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

«НАЦЫЯНАЛЬНАЯ КУЛЬТУРА НАБЫВАЕ ЎСЁ БОЛЬШАЕ ЗНАЧЭННЕ ЯК НАДЗЕЙНЫ ГАРАНТ ЗАХАВАННЯ САМАБЫТНАСЦІ НАРОДА»

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

«Галоўны прынцып культурнай палітыкі Беларусі — не проста захаваць, а шматразова прымножыць духоўныя багацці народа, — адзначыў Аляксандр Лукашэнка. — Мы адраджаем помнікі мінулага, такія як Мірскі замак, Нясвіжскі палац, Брэсцкая крэпасць, ствараем новыя шэдэўры — Нацыянальную бібліятэку, «Мінск-Арэну», мемарыял на Буйніцкім полі, Храм-помнік у гонар Усіх Святых і іншыя маштабныя збудаванні, вартыя стаць візітнай карткай эпохі. Мы шануем творчыя традыцыі, развіваем мастацкія школы і адкрываем новыя зорныя імёны».

«Дарогу талентам!» — гэтыя словы сталі дэвізам сучаснай Беларусі, лічыць Аляксандр Лукашэнка. Мабыць, нідзе ў свеце да талентаў не ставяцца з такім хваляваннем і павагай, як у нас у краіне. Адораныя асобы адчуваюць дзяржаўны клопат з маленства і на працягу ўсяго жыцця. «І як бы ні складвалася эканамічная сітуацыя, грошай на таленавітых людзей, на адукацыю, навуку і культуру мы шкадаваць не будзем», — падкрэсліў ён.

На думку Прэзідэнта, тэма духоўнасці набывае асаблівую актуальнасць у нашы дні. «Як расліна не можа жыць без святла і цяпла, так і краіна — без духоўнасці, без шматграннай творчасці яе грамадзян, — адзначыў ён. — Гэта асабліва актуальна ў нашы дні, калі ўпершыню ў гісторыі беларусы пабудавалі сваю дзяржаву, адчулі сябе паўнапраўнымі гаспадарамі на сваёй зямлі. Набыццё незалежнасці акрыляе, дае небывалы ўзлёт патрыятычных пачуццяў, імкненне зрабіць як мага больш для ўмацавання і ўпрыгажэння нашага агульнага дому».

Аляксандр Лукашэнка нагадаў словы знакамітага пісьменніка Уладзіміра Караткевіча пра Беларусь: «Гэта край раскрытых душ і дзвярэй, гэты край — наш дом і сабор». Вось такое стаўленне да роднай зямлі — як да святыні, якая заслугоўвае асаблівай любові і шанавання, — павінна яднаць і натхняць на новыя здзяйсненні і вялікія справы, перакананы ён.

Заўтрашні дзень дзяржавы непасрэдна залежыць ад таго, якія ідэалы ўмацоўваюцца сёння. «Ва ўсе часы людзі не толькі шукалі матэрыяльнага дастатку, але і імкнуліся да духоўных вышынь. І ў нашы дні пытанні маралі і культуры адыгрываюць вядучую ролю ў мастацкай творчасці, навуцы, адукацыі і медыцыне. Ад таго, якія ідэалы ўмацоўваюцца сёння, непасрэдна залежыць заўтрашні дзень нашага народа», — падкрэсліў кіраўнік дзяржавы.

Пры гэтым Аляксандр Лукашэнка адзначыў: «Мы заўсёды будзем паважаць права майстроў мастацтва на свабоду думкі і самавыяўлення. Але, як справядліва заўважыў вялікі Някрасаў, паэт перш за ўсё абавязаны быць грамадзянінам. Вы, творчыя людзі, не павінны забываць ра сваю сацыяльную, духоўную місію. Краіна чакае ад вас яркіх, маштабных твораў, якія выхоўвалі б народ у духу традыцыйных ідэалаў і каштоўнасцяў. Адлюстроўвалі тыя пазітыўныя змены, якія адбываюцца ў нашым жыцці. Абуджалі ў маладых сэрцах пачуццё патрыятызму і гордасці за сваю краіну. Няхай добрым прыкладам для ўсіх паслужаць слаўныя справы і цудоўныя творы тых выдатных людзей, якіх мы ўшаноўваем».

Прэзідэнт Беларусі ўручыў 15 лаўрэатам, прадстаўнікам розных прафесій, прэміі «За духоўнае адраджэнне» і спецыяльныя прэміі дзеячам культуры і мастацтва. Сярод лаўрэатаў — урачы і свяшчэннаслужыцелі, бацькі-выхавальнікі сямейнага дзіцячага дома і тыя, хто дасягнуў высокага майстэрства на творчай ніве. «Усіх іх па праву можна назваць сапраўднымі падзвіжнікамі духу, якія аддаюць усе сілы розуму і таленту беззаветнаму служэнню роднай краіне», — падкрэсліў кіраўнік дзяржавы.

Звяртаючыся да лаўрэатаў, Аляксандр Лукашэнка сказаў: «Мне вельмі прыемна першым павіншаваць вас з прысуджэннем такіх высокіх узнагарод. Вы ў поўнай меры заслужылі іх сваёй самаадданай працай і выдатнымі вынікамі ў сферы культуры і мастацтва, у дабрачыннай і сацыяльнай рабоце, справах асветы і міласэрнасці. Няхай гэта ўрачыстасць надасць вам яшчэ больш стваральнай энергіі і энтузіязму, натхніць на новыя здзяйсненні ў імя шчасця і працвітання любімай Айчыны».

Кіраўнік дзяржавы таксама падкрэсліў: «Ражджаство — гэта светлае, сямейнае свята. І таму я хачу звярнуцца да вас з тымі словамі, якія гавару самым родным людзям: пажаданнямі шчасця, здароўя, дабрабыту і абавязкова ўдачы! Няхай кожнаму з вас спадарожнічае поспех у справах, здзяйсняюцца ўсе мары, а сэрцы будуць напоўнены выдатным настроем, цяплом і дабрынёй».

Мітрапаліт Мінскі і Слуцкі Філарэт, Патрыяршы Экзарх усяе Беларусі, які прыняў удзел ва ўрачыстай цырымоніі, адзначыў вялікае значэнне гэтай каляднай сустрэчы, на якой «вызначаюцца ключавыя моманты ў сферы духоўнага адраджэння і стварэння ў нашай нацыянальнай культуры».

Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

Актуальна

РЭАЛІЗАЦЫЯ ДРАЎНІНЫ — ПА НОВЫХ ПРАВІЛАХ

У Беларусі зацверджаны новыя Правілы рэалізацыі драўніны на ўнутраным рынку, якія пашыраюць правы вытворцаў і спажыўцоў лесапрадукцыі. Гэта прадугледжана ўказам № 6 «Аб некаторых пытаннях рэгулявання дзейнасці ў сферы лясной гаспадаркі», які падпісаў Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь Аляксандр Лукашэнка.

У адпаведнасці з Правіламі рэалізацыі драўніны на ўнутраным рынку Беларусі ў 2010 годзе, зацверджанымі ўказам ад 1 сакавіка 2010 года № 102, дазвалялася ажыццяўляць рэалізацыю круглых лесаматэрыялаў фізічным асобам (грамадзянам) без абмежаванняў аб'ёмаў і без даведак, на падставе заявы з пазначэннем у ёй мэты набыцця.

Юрыдычным асобам, якія маюць дзелавую драўніну ў нарыхтаваным выглядзе на законных падставах, у 2010 годзе было прадастаўлена права выбіраць спосаб яе рэалізацыі — на біржавых таргах або па-за біржавымі таргамі (па грамадзянска-прававых дагаворах). Такі падыход даў магчымасць больш аператыўна вырашаць пытанні арганізацыі паставак і задавальнення патрэбнасці ў дзелавой драўніне ў нарыхтаваным выглядзе на ўнутраным рынку фізічных і юрыдычных асоб. Гэта было асабліва важна з прычыны зніжэння попыту на лесапрадукцыю за мяжой і пакупной здольнасці рэзідэнтаў рэспублікі з-за сусветнага фінансава-эканамічнага крызісу. Яго наступствы адчувальныя і сёння. Таму неабходна не дапусціць скарачэння попыту на ўнутраным рынку на драўніну на пні, што рэалізуецца на біржавых таргах, і дзелавую драўніну ў нарыхтаваным выглядзе.

Асноўныя аб'ёмы драўніны на пні цяпер будуць рэалізоўвацца толькі на біржавых таргах. Выключэнне складуць спажыўцы, якім драўніна на пні будзе адпускацца па таксавым кошце ў аб'ёмах, якія штогод вызначаюцца Саветам Міністраў Рэспублікі Беларусь.

У 2010 годзе стартавая цана на драўніну на пні фарміравалася з улікам біржавых каціровак, якія ўстанаўліваюцца па выніках квартальнага аб'ёму продажу драўніны на пні з лесасечнага фонду на біржавых таргах, скарэкціраваных на каэфіцыент змянення цаны на драўніну ў краінах Еўрапейскага саюза, Расіі і Украіне. Ва ўмовах абмежаванага попыту і празмернага прапанавання драўніны на пні на біржавых таргах набываліся ў першую чаргу даступныя, высокатаварныя лесасекі, якія маюць больш высокую цану рэалізацыі. Гэта прывяло да росту сярэдняй каціроўкі на такую драўніну. Прымяненне да біржавай каціроўкі карэкціруючага каэфіцыента прыводзіла ў выніку да істотнага росту стартавых цэн і зніжэння аб'ёмаў продажу драўніны на пні.

У мэтах павелічэння аб'ёмаў яе продажу ў 2011-2012 гадах указам прапануецца стартавую цану на драўніну на пні для рэалізацыі на біржавых таргах устанаўліваць у адпаведнасці з дзейнымі таксамі на дату выстаўлення лотаў на біржавыя таргі.

Акрамя таго, указам выключана норма аб унясенні пакупнікамі на рахунак ААТ «Беларуская ўніверсальная таварная біржа» грашовага забеспячэння ў памеры 2 працэнты ад сумы пададзенай заяўкі на куплю драўніны на пні. Гэта дасць магчымасць спрасціць працэдуру допуску да ўдзелу ў біржавых таргах усіх патэнцыяльных пакупнікоў.

Прапануемыя меры будуць садзейнічаць скарачэнню выдаткаў пакупнікоў, звязаных з удзелам у біржавых таргах, і больш аператыўнаму вырашэнню пытанняў рэалізацыі лесапрадукцыі.

Указам прапануецца захаваць у 2011-2012 гадах сам парадак рэалізацыі драўніны на ўнутраным рынку, які дзейнічаў у 2010 годзе.

Прадугледжваецца таксама ўнесці ў Правілы водпуску драўніны на пні і яе нарыхтоўкі ў лясах Рэспублікі Беларусь, зацверджаныя ўказам ад 7 мая 2007 года № 214, дапаўненні і змяненні ў мэтах павелічэння аб'ёмаў яе рэалізацыі, папярэджання неабгрунтаванага завышэння стартавай цаны на драўніну ў нарыхтаваным выглядзе і на пні пры яе продажы на біржавых таргах.

Дазваляецца нарыхтоўваць драўніну пры правядзенні высечак, звязаных з будаўніцтвам і бягучым утрыманнем аб'ектаў на ўчастках ляснога фонду пры распрацоўцы радовішчаў і здабычы нафты, торфу і іншых карысных выкапняў, ліній сувязі і электрапередачы, трас, дарог, трубаправодаў, на прасеках для падтрымання іх шырыні, прадугледжанай праектамі, арганізацыям, якія выконваюць будаўніцтва і бягучае ўтрыманне гэтых аб'ектаў, а таксама арганізацыям, якія ажыццяўляюць нарыхтоўку драўнінна-хмызняковай расліннасці на прасеках ліній сувязі і электрапередачы ў адпаведнасці з дагаворамі, заключанымі з названымі арганізацыямі, з выпіскай юрыдычнымі асобамі, што вядуць лясную гаспадарку, лесарубных білетаў непасрэдна гэтым арганізацыям.

Прыняцце ўказа будзе садзейнічаць больш эфектыўнаму выкарыстанню лесасыравінных рэсурсаў у 2011-2012 гадах і не прывядзе да змяншэння даходаў лясной гаспадаркі.

Указ уступае ў сілу з 1 студзеня 2011 года.

Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

ЗАТРЫМАНЫ РАБАЎНІКІ

Чацвёра грамадзян, сярод якіх адна жанчына, праніклі ў прыватны дом у Гомелі, металічным дротам збілі гаспадара, а таксама яго брата і маці. Рабаўнікі завалодалі $ 900, Br500 тыс. і каштоўнымі рэчамі, пасля чаго зніклі. Гаспадар пасля візіту «гасцей» трапіў у абласную бальніцу з пераломам чэрапа. Міліцыя пры дапамозе службовага сабакі знайшла і затрымала ўсіх зламыснікаў — мясцовых грамадзян ад 26 да 47 гадоў.

Ірына АСТАШКЕВІЧ.

Уладзімір ЦЫПЛАКОЎ:

«БЕЗ ПАРАЖЭННЯЎ НЕ БЫВАЕ ПЕРАМОГ»

Беларуская каманда ў наступным годзе пастараецца ўзяць рэванш на Калядным міжнародным турніры аматараў хакея на прыз Прэзідэнта Беларусі. Пра гэта пасля фінальнага паядынку, у якім нашы суайчыннікі па булітах прайгралі расійскім хакеістам (2:3), заявіў адзін з самых знакамітых гульцоў беларускай дружыны, экс-нападаючы нацыянальнай зборнай, які мае вопыт выступлення ў НХЛ, а цяпер трэнер Уладзімір Цыплакоў, перадае БЕЛТА.

«Без паражэнняў не бывае перамог, — сказаў Уладзімір Цыплакоў. — Зразумела, налета мы зробім усё магчымае, каб вярнуць гэты кубак сабе». На яго думку, трэба абдумаць рэгламент спаборніцтваў. «Па дзейных правілах каманды спаборнічаюць у асноўным у выкананні булітаў, а гэта заўсёды латарэя, як такой гульні не атрымліваецца, — сказаў Уладзімір Цыплакоў. — Сёння каманды былі роўныя. Ніхто не хацеў саступаць. Мы закінулі па адной шайбе «з гульні» і рэалізавалі па адным буліце ў асноўны час, пасля чаго давялося зноў выконваць штрафныя кідкі».

Нападаючы расійскай каманды, алімпійскі чэмпіён, уладальнік Кубка Стэнлі і трохразовы чэмпіён свету Валерый Каменскі адзначыў, што ўзровень турніру кожны год расце: «Узровень хакея на спаборніцтвах у Мінску расце. Турнір развіваецца. Кожны год у Беларусь прыязджае больш класных гульцоў. У нас пастаянны касцяк каманды, але часам далучаюцца хакеісты, якія заканчваюць кар'еру. Гэта цудоўная магчымасць для іх. Кожны гулец, які сыходзіць з вялікага спорту, хоча выступаць далей, але гады бяруць сваё. А такія турніры дазваляюць займацца любімай справай. Вельмі прыемна гуляць на «Мінск-Арэне». Яна нічым не саступае НХЛаўскім. Прыемна, што з'яўляюцца такія арэны, на якія людзі прыходзяць адпачываць».

Нагадаем, уладальнікам бронзы сёлета стала каманда Фінляндыі. У былыя гады пераможцам Каляднага турніру пяць разоў станавілася каманда Прэзідэнта Беларусі (у 2005, 2006, 2008, 2009 і 2010 гадах), у 2007 годзе поспех святкавала расійская дружына, якая адолела ў фінале беларусаў. З 2006 года турнір праходзіць пад патранатам рэспубліканскага дзяржаўна-грамадскага аб'яднання «Прэзідэнцкі спартыўны клуб». У ліку арганізатараў спаборніцтваў — Міністэрства спорту і турызму Беларусі, асацыяцыі «Федэрацыя хакея Рэспублікі Беларусь», Мінскі гарвыканкам. Партнёры турніру — Беларуская калійная кампанія, кампаніі «Гандлёвы дом БелАЗ», «Юнівест-М», «Спорт-пары». Генеральныя спонсары спаборніцтваў — кампанія «БТ Тэлекамунікацыі», ЗАТ «Белтэхэкспарт» і Пріорбанк.

БЕЛТА.

Пажар на мэблевай фабрыцы

У нядзелю вечарам адбыўся пажар на трансфарматарнай падстанцыі мэблевай фабрыкі «Прагрэс» у Гомелі. Прадпрыемства і 47 прыватных дамоў навокал засталіся без электразабеспячэння.

У тушэнні памяшкання, пабудаванага 45 гадоў таму, было задзейнічана восем аўтацыстэрнаў. Адкрытым полымем гарэў трансфарматар у будынку, дзе размешчаны прахадная і тры ўчасткі мэблевай фабрыкі. Пажар быў ліквідаваны, але да паўдня панядзелка без электразабеспячэння заставаліся вытворчыя будынкі фабрыкі і амаль 5 дзясяткаў бліжэйшых аднапавярховых дамоў. Пакуль ідзе аднаўленне электразабеспячэння, усе пабудовы падключаны да аўтаномнага дызель-электрагенератара. Папярэдняя прычына пажару — кароткае замыканне трансфарматара. Матэрыяльныя страты ўстанаўліваюцца.

Ірына АСТАШКЕВІЧ.

Атрымаў і прадаў... чужое

Майстар аднаго ААТ з Івацэвічаў па даверанасці атрымаў у індывідуальнага прадпрымальніка будаўнічыя матэрыялы для свайго прадпрыемства.

Доўга не разважаючы, майстар прадаў тыя матэрыялы, а 18 млн 432 тысячы паклаў сабе ў кішэню. На маёмасць прайдзісвета накладзены арышт.

Сымон СВІСТУНОВІЧ.

ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

БРАЗІЛІЯ ПАПЯРЭДЗІЛА ПРА ГЛАБАЛЬНУЮ ГАНДЛЁВУЮ ВАЙНУ

Вайна валют, якая працягваецца ў свеце, прынамсі, з 2010 года, можа прывесці да глабальнай гандлёвай вайны. Пра гэта ў інтэрв'ю The Financial Times заявіў міністр фінансаў Бразіліі Гуіда Мантэга.

Бразілія з'яўляецца адной з краін, найбольш пацярпелых ад умацавання мясцовай валюты. Рэал за апошнія восем гадоў умацаваўся ў дачыненні да долара больш чым у два разы, а ў 2010 годзе ўмацаванне склала 4,6 адсотка.

Характэрна, што менавіта Мантэга ўвёў у шырокі ўжытак тэрмін «вайна валют» — гэта здарылася ў верасні 2010 года. Паводле слоў міністра фінансаў Бразіліі, вайна заключаецца ў тым, што многія краіны свету прыніжаюць кошт сваёй валюты, каб павялічыць гандлёвыя прафіцыты. Новы каментар Мантэгі з'явіўся пасля таго, як на пачатку 2011 года значна ўмацаваліся аўстралійскі долар і швейцарскі франк. Акрамя таго, у Бразіліі, Чылі і Перу ўлады ў 2011 годзе ўжо ўмешваліся ў ход спраў на мясцовых рынках, каб перашкодзіць умацаванню мясцовых валют.

У ТУРЦЫІ ЗБІРАЮЦЦА ЗНЕСЦІ ПОМНІК СЯБРОЎСТВА З АРМЯНАМІ

Помнік сяброўства паміж армянамі і туркамі, усталяваны ў горадзе Карс на ўсходзе Турцыі, будзе дэмантаваны. Пра гэта паведамляе The Wall Street Journal.

Знесці 30-метровы манумент распарадзіўся прэм'ер-міністр Турцыі Рэджэп Тайіп Эрдаган, які наведаў горад з працоўным візітам. Сваё рашэнне турэцкі прэм'ер растлумачыў выключна эстэтычнымі меркаваннямі: маўляў, помнік нязграбны і не ўпісваецца ў архітэктурны пейзаж Карса.

У той жа час назіральнікі расцэньваюць крок турэцкага прэм'ера як перадвыбарны ход — у чэрвені 2011 года ў Турцыі пройдуць парламенцкія выбары. Паводле меркавання выдання, такім чынам Эрдаган вырашыў падагрэць цікавасць выбаршчыкаў да палітыкі і справакаваць канфрантацыю яго кіруючай Партыі справядлівасці і развіцця з апазіцыянерамі.

ІЗНОЎ МММ: МАЎРОДЗІ АБВЯСЦІЎ ПРА СВОЙ НОВЫ ПРАЕКТ

Заснавальнік самай скандальнай расійскай фінансавай піраміды Сяргей Маўродзі абвясціў у сваім блогу пра пачатак новага праекта пад назвай МММ-2011 — «Мы Можам Многае». У сваім паўгадзінным відэазвароце ён абяцае фундатарам прыбытак у 20% штомесяц, а пенсіянерам, якія ўклалі грошы, — у 30%.

Укласці грошы ў новую піраміду змогуць жыхары любой краіны. Маўродзі прапануе фундатарам адкрыць доларавыя рахункі ў электронных аплатных сістэмах і набываць віртуальныя квіткі, якія будуць расці ў кошце. «Будуць ізноў уведзены гэтыя квіткі. Хто ў МММ гуляў, памятае, — заявіў Маўродзі ў сваім звароце. — Віртуальны квіток — гэта не каштоўная папера, а проста фанцік. Яны будуць расці ў кошце».

Маўродзі назваў праект «фінансавай сацыяльнай сеткай» і перакананы, што гэта «сістэма абсалютна непаражальная, непатапляльная, незнішчальная». Ён заявіў, што не будзе атрымліваць ад піраміды прыбытак, а толькі збіраецца кіраваць працэсам. «Я дапамагаю людзям. Наогул бескарысліва. Усім відавочна, што бескарысліва зусім. Я нічога не маю. Ні капейкі», — сказаў ён.

Нагадаем, «МММ» — найбуйнейшая «фінансавая піраміда» ў гісторыі Расіі. Акцыянернае таварыства дзейнічала на пачатку 1990-х і было прызнана банкрутам у верасні 1997 года. Паводле звестак следства, пацярпелымі ад дзейнасці АТ лічацца больш за 40 тысяч чалавек. Паводле неафіцыйнай інфармацыі, пацярпела некалькі мільёнаў чалавек. Нанесены ім урон ацэньваецца прыблізна ў 100 млн долараў.

Абзац

Старшыня Мінгарвыканкама Мікалай Ладуцька даручыў на працягу двух дзён прыбраць усе звалкі снегу — на прыпыначных пунктах і ў дварах. Адпаведнае распараджэнне ён агучыў учора на аператыўнай нарадзе ў гарвыканкаме.

У Беларусі за мінулыя выхадныя ў ДТЗ загінулі 8 чалавек і 31 атрымаў траўмы. Усяго за гэты час зарэгістравана 771 ДТЗ з матэрыяльным уронам. За кіраванне транспартным сродкам у стане алкагольнага ап'янення затрымана 376 кіроўцаў.

Жыхар Лёзна скраў з мясцовага храма царкоўны рыштунак. Мужчына 1968 г.н. быў затрыманы міліцыяй у ноч з 8 на 9 студзеня.

Нецвярозы малады чалавек выжыў пасля падзення з 5-га паверха жылога дома ў пасёлку Калодзішчы Мінскага раёна. Інцыдэнт адбыўся позна ўвечары 7 студзеня. Хлопец 1988 г.н. сядзеў на падаконні 5-га паверха і паліў. Нечакана ён страціў раўнавагу і ўпаў на казырок пад'езда. Выратавальнікі, што прыбылі на месца здарэння, дапамаглі падзеламу спусціцца з казырка. Яго шпіталізавалі з пераломам галёнкі.

Больш за 172 тыс. чалавек у год паміраюць ад наступстваў пасіўнага курэння ў краінах — членах еўрапейскага бюро Сусветнай арганізацыі аховы здароўя. Яшчэ 1,4 млн чалавек становяцца інвалідамі. Даследаванне праводзілася ў чатырох краінах — Польшчы, Турцыі, Расіі і Украіне.

За калядны тыдзень у еўрапейскіх крамах скралі тавараў на 5,5 млрд еўра. Прычым усё гэта былі дробныя крадзяжы. Як сцвярджаюць аналітыкі, гэта самы вялікі паказчык за 10 гадоў даследаванняў. Пры гэтым палову крадзяжоў ажыццяўляюць наведнікі, каля трэці — супрацоўнікі, астатняе — на сумленні пастаўшчыкоў. Сярод украдзенага спіс узначальваюць алкаголь і дарагое адзенне.

Поўны абзац

Паляўнічага са Шчучынскага раёна падстрэліла... ліса. Ва ўсякім разе, на гэтым настойвае пацярпелы, які знаходзіцца зараз у райбальніцы. Незвычайны выпадак адбыўся ў лесе каля в. Старыя Паддубы. Падчас палявання 40-гадовы мясцовы жыхар з незарэгістраванай двухстволкі падстрэліў лісу, а дабіць яе вырашыў прыкладам. Калі ён прыціскаў параненую жывёліну да зямлі, яна закранула лапамі спускавы кручок. Прагучаў стрэл, паляўнічы атрымаў скразное раненне сцягна. Усе абставіны высвятляе пракуратура.

У Галандыі з аўкцыёну прадалі калонію паштовых галубоў. Калонія з 218 птушак прададзеная за 1,367 мільёна еўра, што з'яўляецца абсалютным рэкордам у гэтай катэгорыі. Галубы былі выстаўленыя на таргі пасля смерці жыхара бельгійскай правінцыі Лімбург, які іх разводзіў. Сваіх гадаванцаў ён завяшчаў бельгійскай асацыяцыі галубаводаў Pigeon Paradise, якая і арганізавала аўкцыённы распродаж.

Жанчына выратавала сабаку, зрабіўшы яму штучнае дыханне. Сабака па мянушцы Джэрзі вельмі любіць купацца, а таму кінуўся ў набрынялую ад праліўных дажджоў раку на паўночным усходзе Аўстраліі, нягледзячы на адчайныя крыкі гаспадыні, якая забараняла жывёліне лезці ў ваду. Плынь у рацэ была такой моцнай, што сабака пачаў тануць. Убачыўшы гэта, жанчына па імені Петра Лаві скочыла ў ваду і праз некаторы час выцягнула Джэрзі на бераг. Пасля гэтага яна доўгі час рабіла жывёліне штучнае дыханне, і ўрэшце тая ажыла. Пасля гэтага сабаку давялося тры дні лячыцца ў лякарні для жывёл.

Паводле паведамленняў карэспандэнтаў «Звязды» і інфармагенцтваў.

«ШАШАЧКІ» НА КРЫЛАХ МАГІЛЁЎСКІХ ГАЛУБОЎ

На стаянцы таксі каля Магілёўскага абласнога драматычнага тэатра пасяліліся галубы. Таксісты прыкармілі птушак самі, частуюць іх ледзь не з рук і смяюцца, што разам весялей бавіць час у чаканні кліентаў. Вадзіцелі нават прыдумалі жарт, што можна намаляваць галубам «шашачкі» на крылах, і будзе ў магілёўскіх таксістаў свая галубіная чарада.

Ул. кар.

Гэта мы, Госпадзі!

Жахі на Каляды

7 студзеня ў Магілёве маладая жанчына зарэзала сваю маці і яе сужыцеля. Надвячоркам, пасля застолля са спіртным, у сварцы 22-гадовая магіляўчанка, якая ўжо мела крымінальны вопыт і нідзе не працавала, накінулася з нажом на маці-пенсіянерку і яе сужыцеля. У выніку 55-гадовая жанчына і 51-гадовы мужчына загінулі на месцы здарэння.

У Касцюковіцкім раёне сын забіў да смерці сваю маці. У цэнтральнай раённай бальніцы 6 студзеня памерла 62-гадовая жыхарка вёскі Крапіўня. Брыгада хуткай медыцынскай дапамогі напярэдадні прывезла жанчыну ў бальніцу з мноствам траўмаў цела і галавы. Устаноўлена, што 31 снежня, за паўгадзіны да наступлення Новага года, яе збіў у сварцы рукамі і нагамі 31-гадовы сын, які працаваў рабочым на заводзе і жыў разам з маці.

Алена КАЗЛОВА.

МГКУ дорожно-мостовое предприятие

ПРОВОДИТ ОТКРЫТЫЙ КОНКУРС

на поставку в 2011 году песка строительного в объеме 40 000 т за счет собственных средств предприятия.

Конечный срок подачи ценовых предложений 11.00 17.02.2011 г.

По условиям процедуры закупки и с предложениями обращаться по адресу: 212030, г. Могилев, ул. Габровская, 9; т./ф. 8 0222 40 75 76, 48 03 38, адрес электронной почты: MGKUDMP@tut.by. УНП 700265690

МГКУ дорожно-мостовое предприятие

ПРОВОДИТ ОТКРЫТЫЙ КОНКУРС

на поставку в 2011 году щебня гранитного фракций:
5—10 мм — 16 000 т, 5—20 мм — 10 000 т, 20—40 мм — 30 000 т,
25—60 мм — 10 000 т, щебня доломитового фракций:
5—20 мм — 5 000 т, 20—40 мм — 10 000 т, 40—80 мм — 5 000 т
за счет собственных средств предприятия.

Конечной срок подачи ценовых предложений 11.00 14.02.2011 г.

По условиям процедуры закупки и с предложениями обращаться по адресу: 212030 г. Могилев, ул. Габровская, 9; тел.: 8 0222 40 75 76, факс 8 0222 48 03 38, адрес электронной почты: MGKUDMP@tut.by. УНП 700265690

РУП «Витебский институт недвижимости и оценки»

- оценка имущества (недвижимость, транспорт, оборудование, бизнес, вред от залития, пожара и др.)
- организация и проведение аукционов

ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ ИМУЩЕСТВА, ОБРАЩЕННОГО В ДОХОД ГОСУДАРСТВА У РПУП «ВИТЕБСКИЙ МЕХОВОЙ КОМБИНАТ»

Лот № 1: капитальное строение (инв. № 200/С-51471) деревообрабатывающий цех, площ. 652 кв.м по адресу: Витебск, ул. 2-я Прибережная, 1, начальная цена продажи 177 023 000 руб., сумма задатка 17 702 300 руб.

Лот № 2: капитальное строение (инв. № 200/С-64851) здание «Павильон Смоленск», площ. 70,1 кв.м по адресу: Витебск, ул. 2-я Прибережная, 1, начальная цена продажи 18 932 400 руб., сумма задатка 1 893 240 руб.

Аукцион состоится **3 февраля 2011 года в 12.00** по адресу: Витебск, ул. Свидинского, 4. Заявления на участие в аукционе принимаются в рабочие дни с 8.00 до 17.00 по 02.02.2011 (включительно) по адресу: Витебск, ул. Свидинского, 4. Заключительная регистрация 03.02.2011 с 11.30 до 12.00 по месту проведения аукциона. Официальное извещение опубликовано в газете «Звязда» от 29.07.2010 года №

РЫХТУЙЦЕСЯ, ДА ВАС ІДЗЕ «КАЗА»!

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Калядную казу водзяць і там, дзе ніколі не забываліся і не адракаліся ад старажытных традыцый, і там, дзе іх толькі-толькі пачынаюць адраджаць. У вёсцы Жажэлка Смалявіцкага раёна казу «замаўляюць» загадзя. Без калядніка свята тут не ўяўляюць. 7 студзеня з першай вечаровай зоркай па вясковых вуліцах ходзіць вясёлы гурт з гармонікам: мядзведзь, бусел, конь, гусар, дзед-продак, цыганка. І абавязкова — калядная «звязда» і каза. У многія жажэлкаўскія хаты каляднікаў запрашаюць персанальна, бо без гэтых гасцей свята не цікавае, не запамінальнае.

На брэсцкім Палессі сёмага студзеня ходзяць пераважна пеўчыя са «звяздой» і славяць Хрыстова нараджэнне, а казу водзяць толькі на стары Новы год. Але гэтак не паўсюдна. У Лунінецкім і Жыткавіцкім раёнах захаваліся звычаі хадзіць з казой у першы вечар праваслаўных Калядаў, альбо хадзіць са «звяздою» ў ноч з трынаццатага на чатырнаццатага студзеня.

Час, калі можна ўволю павесяліцца, добра пажартаваць і пачуць шмат цудоўных пажаданняў — Каляды. Але трэба рыхтавацца і чакаць, каб таксама апынуцца на свяце нараджэння сонца, як лічылі некалі нашыя папярэднікі.

Анатоль КЛЯШЧУК. Фота аўтара.

Фотаздымкі з Калядаў зроблены ў вёсках Жажэлка Смалявіцкага, Хатынічы Ганцавіцкага, Валішча і Камень Пінскага раёнаў.

Айцец АРСЕНІЙ:

«СЫНКОВІЦКАМУ ХРАМУ КАЛЯ 800 ГАДОЎ»

Перад праваслаўнымі Калядамі наш карэспандэнт задаў некалькі пытанняў протаіерэю а. Арсенію Ананку, настаяцелю Сынковіцкай Міхайлаўскай царквы, якая знаходзіцца на мяжы двух раёнаў — Слонімскага і Зэльвенскага.

— Айцец Арсеній, якім быў для Сынковіцкай царквы мінулы год?

— Няпростым. Але шмат зроблена і робіцца, каб захаваць гэты ўнікальны помнік Беларусі. Пачаліся рэстаўрацыйныя і рамонтныя работы, як усярэдзіне храма, так і звонку. Ужо расшыфравана некалькі надпісаў на сценах храма, адрасаваных вялікаму князю Альгерду. Гэтыя тэксты даюць падставы меркаваць, што Сынковіцкай царкве далёка не 600 гадоў, а каля 800.

— Ці плануецца знесці кароўнік, пабудаваны ў савецкі час, які знаходзіцца побач з царквою?

— Так. Ужо адзін будынак кароўніка ліквідаваны. Мяркуецца цалкам ачысціць каля храма тэрыторыю ад кароўнікаў і цялятнікаў. А на гэтым месцы з цягам часу плануем пабудаваць атэль для турыстаў, некалькі крамаў, дзе будуць прадавацца сувеніры, і стаянку для аўтамабіляў.

— Ці шмат турыстаў прыязджае на экскурсію ў Сынковічы?

— Штогод больш за 5 тысяч турыстаў. Летась у нас пабывалі турысты з Кітая, ЗША, Польшчы, Аўстраліі, Расіі, Украіны, Эстоніі і з іншых дзяржаў.

Сяргей ЧЫГРЫН.

БПС-БАНК

ОАО «БПС-Банк» проводит внеочередное Общее собрание акционеров в форме заочного голосования путем письменного опроса акционеров 20 января 2011 года по адресу: бульвар имени Мулявина, 6, 220005, г. Минск, офис центрального аппарата ОАО «БПС-Банк».

Повестка дня:

1. Об оказании банком безвозмездной (спонсорской) помощи в 2011 году.

Дата формирования реестра акционеров для составления списка лиц, имеющих право на участие во внеочередном Общем собрании акционеров – 1 января 2011 года.

Бюллетени для заочного голосования вручаются акционерам (их представителям), имеющим право на участие во внеочередном Общем собрании акционеров, при их обращении в банк при предъявлении документа, удостоверяющего личность акционера (его представителя).

В голосовании участвуют бюллетени, полученные банком от акционеров (их представителей) не позднее 17 января 2011 года.

Акционеры банка могут получить информацию о включении их в список для заочного голосования внеочередного Общего собрания акционеров и другую информацию в соответствии с законодательством Республики Беларусь в местах учета их акций в филиалах и отделениях банка или центральном аппарате банка по адресу: г. Минск, бульвар имени Мулявина, 6 или по телефону (017) 289 42 33.

Лицензия Национального банка Республики Беларусь № 4 от 13.11.2008 года на осуществление банковской деятельности. УНП 100219673. ОАО «БПС-Банк».

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОДАЖЕ ПРАВ НА ЗАКЛЮЧЕНИЕ ДОГОВОРА АРЕНДЫ НЕДВИЖИМОГО ИМУЩЕСТВА ПУТЕМ ПРОВЕДЕНИЯ АУКЦИОННЫХ ТОРГОВ

ЗАО «Выставочный центр «Аквабел» Минский район проводит аукцион по продаже прав на заключение договоров аренды следующего недвижимого имущества ЗАО «Выставочный центр «Аквабел» Минский район:

№ лота	Наименование объекта аренды	Адрес объекта аренды	Арендуемая площадь, м.кв.	Начальная цена продажи права заключения договора аренды, бел. руб. с НДС	Размер задатка, бел. руб.
1.	Часть склада Технического корпуса № 1	Минский район, пересечение Логойского тракта и МКАД, **Технический корпус № 1**	950,0	9 000 000	450 000
2.	Часть склада Технического корпуса № 1	Минский район, пересечение Логойского тракта и МКАД, **Технический корпус № 1**	323,1	3 000 000	150 000

Условия проведения аукциона:

Организатором аукциона и продавцом (арендодателем) является Закрытое акционерное общество «Выставочный центр «АКВАБЕЛ» Минский район, адрес: Минский район, пересечение Логойского тракта и Минской кольцевой автодороги, административное здание, комната 302.

Торги состоятся **21.01.2011 года**, в **10.00**, по адресу: Минский район, пересечение Логойского тракта и Минской кольцевой автодороги, административное здание, 3 этаж, зал совещаний.

Шаг аукциона – **5 %** от начальной цены продажи права заключения договора аренды.

К участию в аукционе допускаются физические лица, юридические лица любой формы собственности, а также иностранные инвесторы (иностранные государства, объединения, международные организации, иностранные юридические и физические лица, а также граждане Республики Беларусь, имеющие постоянное место жительства за границей).

Для участия в аукционе необходимо представить следующие документы:

заявление на участие в аукционе и об ознакомлении с объектом аренды;

заверенную банком копию платежного поручения, подтверждающего внесение задатка в белорусских рублях;

юридическими лицами – резидентами Республики Беларусь – доверенность представителю юридического лица (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель), заверенные копии учредительных документов и свидетельства о государственной регистрации;

представителями физических лиц – резидентов Республики Беларусь – нотариально заверенную доверенность;

юридическими лицами – нерезидентами Республики Беларусь – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписку из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть проведена в течение года до подачи заявления на участие в аукционе) или иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения;

юридическими и физическими лицами – нерезидентами Республики Беларусь – документ о состоятельности, выданный обслуживающим его банком или иной кредитно-финансовой организацией, с заверенным в установленном порядке переводом на белорусский (русский) язык;

представителями юридических и физических лиц – нерезидентов Республики Беларусь – легализованную в установленном порядке доверенность.

Обязательные дополнительные требования к претендентам на участие в аукционных торгах:

Претенденты на участие в торгах перед перечислением задатка обязаны связаться с организатором аукциона и представить материалы, свидетельствующие о том, что претендент соответствует указанным обязательным дополнительным требованиям. Если претендент соответствует этим обязательным дополнительным требованиям, то он получает согласие организатора торгов на перечисление задатка, а также может ознакомиться с объектом аренды.

Задаток перечисляется по безналичному расчету в белорусских рублях на расчетный счет **ЗАО «Выставочный центр «АКВАБЕЛ» Минский район** № 3012000273011 в ф-ле ОАО «Приорбанк» ЦБУ № 115 г. Минск, ул. Кропоткина, 91,код 749, УНН 600438617.

Задаток возвращается всем участникам аукциона, кроме участников аукциона, выигравших торги, в течение 5 (пяти) рабочих дней со дня проведения аукциона или с момента регистрации продавцом (организатором аукциона) отказа от участия в аукционе. Участнику аукциона, выигравшему торги, задаток не возвращается, а учитывается при окончательных расчетах.

Победитель аукциона заключает договор на аренду нежилого помещения в течение 5 (пяти) банковских дней с даты подписания протокола о результатах аукциона. Срок договора аренды нежилого помещения – **2 (два) года 11 (одиннадцать) месяцев**. Арендная ставка с НДС за один квадратный метр в месяц без эксплуатационных расходов на арендуемое помещение и без эксплуатационных расходов на помещения общего пользования: **ЛОТ № 1 – 8 (восемь) у.е.** за часть склада Технического корпуса площадью **867 кв.м** и **4 (четыре) у.е.** за рампу**, по ЛОТу № 2 – 8 (восемь) у.е.** Одна у.е. равна стоимости одного евро, выраженной по курсу Национального банка Республики Беларусь. В случае уклонения или отказа от заключения договора аренды или уклонения или отказа от оплаты стоимости приобретенного права на заключение договора аренды задаток победителю аукциона не возвращается.

Оплата стоимости приобретенного права заключения договора аренды на объект недвижимости осуществляется по безналичному расчету в белорусских рублях в течение 5 (пяти) банковских дней со дня подписания протокола о результатах аукциона с победителем аукциона.

Заявки на участие в аукционных торгах принимаются до **19.01.2011 г.** до **14.00** включительно по адресу Минский район, пересечение Логойского тракта и Минской кольцевой автодороги, административное здание, 1 (первый) этаж, комната 103. **Тел.: (017) 237 95 65, 237 93 95.**

Год, як няма ксяндза Юзафа Булькі

Старыя бабулькі стараюцца захаваць «мосарскі цуд», нямала маладзейшых клянуць «зону цвярозасці» і ходзяць па выпіўку ў суседнія вёскі

Год таму, 9 студзеня 2010 года, не стала вядомага на ўсю краіну ксяндза — Юзафа Булькі з Мосара. За час ягонага служэння Мосар справядліва назвалі «беларускай Швейцарыяй». Касцёл святой Ганны 1792 года, калі Булька прыехаў туды служыць напрыканцы 1980-х, не быў надта адметным. Такіх — і яшчэ прыгажэйшых — касцёлаў у Беларусі шмат. Аднак шаноўны ксёндз за два дзесяцігоддзі стварыў пры касцёле цудоўны дэндрапарк, некалькі сажалак, пагорак з альтанкаю, Крыжовы шлях (з высачэзным крыжам на гары), страусіную ферму, спартыўную пляцоўку для дзетак ды шмат іншага. Аднак галоўнай справаю ксяндза было змаганне з п'янствам. Настолькі апантанае, што мясцовыя алкаголікі неўзабаве ўзненавідзелі святара — па чарговую пляшку «чарніла» ім даводзілася цягацца ў суседнія вёскі. Мосар хутка стаў славутай «зонай цвярозасці». Ксяндза баяліся і паважалі. Словам ён мог прысаромець так, што набытую выпіўку людзі неслі здаваць назад у краму (такія распіскі захоўваюцца ў створаным Булькам Музеі цвярозасці). Ксёндз хадзіў ад хаты да хаты і пераконваў людзей не піць алкаголь, не расплачвацца бутэлькаю з трактарыстам за пасяўную, не ператвараць святы ў папойкі. Я шмат разоў быў у Мосары, і адной-чы — на выходных. Так здзівіла, што ў нядзелю людзі масава ідуць на могілкі, прыбіраюць магілы, высаджваюць кветкі!.. Ведаеце, да сваіх дзядоў на мінскіх могілках я хаджу ў розныя дні, але толькі не на Дзяды. У сталіцы (ды і па ўсёй Беларусі) у гэты дзень многія напіваюцца і ляжаць на магілах, могуць і песню заспяваць. Брыдка глядзець, як нявечыцца памяць продкаў, якую ўласна і закліканы ўшаноўваць гэты старадаўні паганскі звычай, які захаваўся і ў хрысціянскай Беларусі.

Ксяндза Булькі не стала, калі яму ішоў 84-ы год, а 27 снежня 2010 года муселa споўніцца 85. Ён не збіраўся паміраць. Я не хачу згадваць, хто і якім чынам паскорыў смерць шаноўнага ксяндза (гл. «Звязду» ад 12.01.2010). Не гэтыя людзі павінны застацца ў гісторыі, а той, хто рабіў Справы. Зямныя грахі паваеннага часу, у якіх вінавацілі святара, так і засталіся на 100% недаказаныя. Калі дакажуць — хай застаецца і гэта. А пакуль я гляджу на справы, якія здзейсніў ксёндз Булька тут, у маёй краіне, за апошнія 20 гадоў. Як сказаў год таму над яго труной Кардынал Казімір Свёнтэк: *«Прабач нам. Не толькі нам. Але і тым — і зблізку, і здалёку, якія тым ці іншым спосабам рабілі табе прыкрасць, даканалі несправядлівасцю, пакрыўдзілі цябе. Даруй ім гэтую злосць і нікчэмнасць людскую»*.

Цяпер парафіяй Мосар апякуецца ксёндз Аляксей Юркайць. Напэўна, ксяндзу быць «пасля Булькі» гэтак жа цяжка, як папу Бенядыкту XVI быць пасля Яна Паўла II, як мітрапаліту Тадэвушу Кандрусевічу быць пасля Кардынала Казіміра Свёнтэка. Калі твой папярэднік задаў такую высокую планку, адказнасць узрастае шматкроць.

— Ксёндз Булька напраўду быў незвычайны святар, — кажа ксёндз Аляксей. — Аднак і я незвычайны святар, і ўсе іншыя святары — незвычайныя. Ксёндз Булька трымаўся падобнай пазіцыі — не ўзносіў сябе над іншымі. Хоць парафія мне сапраўды дасталася асаблівая — з гэтым не паспрачаешся... Я кожнае лета прыязджаў да ксяндза Юзафа, можна сказаць, сябраваў з ім. Людзі мяне мясцовыя ведалі ўжо. Ды і служыў я перад тым паблізу — у Глыбокім.

— Ксёндзу, як працягваюцца справы Юзафа Булькі?

— Усё, што ён рабіў, трэба захаваць і памножыць. Я тут з 1 верасня, перад гэтым пэўны час быў ксёндз Уладзімір, але яго перавялі ў іншую парафію. Ужо пры маёй службе была асвечана фігура Цярпячага Хрыста — 2 кастрычніка, у Дзень цвярозасці. Парк ды іншая прыгажосць — гэта дзяржаўнае, дзяржава ўзяла гэта пад апеку. З гэтымі паркамі, разумееце, былі складанасці. Ксёндз Юзаф выкапаў сажалку на пустым месцы, дзе нічога не было. Прыехаў дзяржкантроль — далі яму штраф 16 мільёнаў. Ледзьве ўдалося тады даказаць, што ніякага злачынства тут няма — што ксёндз не сабе гэта забраў, не для сябе зрабіў... Праз гэтую прыгажосць некаторыя людзі знаходзілі шлях да Бога. Я рады, што чыноўнікі зразумелі, што нічога дрэннага ў гэтым няма.

— Як ушаноўваецца памяць спачылага святара?

— Якраз перад вашым званком у нас тут была сустрэча ксяндзоў, на якой вырашалі пытанне з надмагільным помнікам ксяндзу Юзафу. Гэта будзе гранітная пліта і крыж.

— Ці хутка з'явіцца?

— Як грошы збяром. Патрэбна 9 мільёнаў рублёў. Чакаю, што далучацца ўсе неабыякавыя людзі!.. Ствараецца, дарэчы, таксама Дом памяці ксяндза Юзафа, дзе будуць ягоныя асабістыя рэчы, ягоныя здымкі...

— Самая вядомая справа Юзафа Булькі — змаганне з п'янствам. Як цяпер з гэтым справы у Мосары? Я чуў, што пасля смерці Булькі мясцовыя п'янчугі патрабавалі аднавіць продаж гарэлкі...

— Зона цвярозасці дзейнічае, яна была працягнутая на год. Спадзяюся, яе дзеянне будзе працягвацца і далей, бо гэта — унікальная, вартая справа, адметнасць Глыбоччыны! Тысячы турыстаў едуць сюды паглядзець на «мосарскі цуд»! Цяпер алкаголь не прадаецца ў Мосары. Але я не хачу таксама распавядаць байкі, што ў нас тут ніхто не п'е. П'юць людзі. Эшалонамі ідуць у суседнія вёскі, там купляюць... Хто хоча выпіць, той знойдзе шлях...

— Няўжо ўвесь гэты «мосарскі цуд» трымаўся на адным чалавеку? Ці ксяндзу Юзафу ўдалося прышчапіць жыхарам прагу да лепшага, да прыгожага?

— Некаторым удалося. Парафіяне апантана дапамагаюць мне падтрымліваць усё гэта, даглядаць. Людзі перажываюць, каб дагледзець усё гэта. Усяго парафія складае 300 чалавек, з іх рэгулярна ходзіць у касцёл каля 100. Актыўныя парафіяне — гэта старыя людзі. Бо маладзейшыя працуюць у калгасе ад рана да рана, а летам суткамі...

...Мосар і пастырскае служэнне ксяндза Юзафа Булькі — яскравы прыклад, колькі змяніць, колькі здзейсніць можа адзін чалавек. Аднак, бачыце, ключавы момант у аповедзе ксяндза Аляксея — што калі ў Мосары людзі не могуць выпіць, тады, мацюкаючыся, ідуць па выпіўку ў суседнія вёскі. А цяпер уявіце, каб і ў суседняй вёсцы не было, каб за 10 кіламетраў не было? Я ведаю некаторыя еўрапейскія сталіцы, дзе на вялікі двухмільённы горад — 5 (!) крамаў, дзе можна набыць моцны алкаголь. Вось гэта — напраўду змаганне з п'янствам.

Ксёндзу Аляксею, поспеху Вам! Працягвайце Справу Юзафа Булькі, і хай такіх прапаведнікаў робіцца больш!

Глеб ЛАБАДЗЕНКА.
Фота аўтара і Уладзіміра БАГДАНАВА.

Чаму ў Ласток няма дарогі?

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

У гаспадыні закончыўся газ, а без дарогі яго прывозіць у Ласток ніхто не збіраецца (не панясуць жа на сабе газавікі балон па заснежаным лесе). Аўтакрама сюды наогул ніколі не прыязджала, таму ў краму ці на пошту трэба хадзіць пехатою па снезе з паўметра вышынёю. Двор каля Коласавай хаты гаспадыня яшчэ больш-менш паспявае расчышчаць пасля завей, а вось дарогу ў два з паловаю кіламетры... Добра, скончыўся газ, але ёсць у рэшце рэшт печ. А калі святло знікне? Ці «хуткая дапамога» спатрэбіцца (барані Божа!), што тады рабіць?

— Я адрэзаная ад свету і нікому тут не патрэбная, хацела званіць нават у Міністэрства культуры,— з гэткімі словамі сустрэла мяне Лідзія Краснік, адкідаючы снег убок фанернай лапатай. Напярэдадні ноччу зноў была мяцеліца, і гаспадыня Ластка павінна навесці парадак. — Ёсць наведнікі ці няма, парадак павінен быць.

Я неяк даехаў да гэтага хутара на стыку двух раёнаў — Уздзенскага і Стаўбцоўскага — усё ж па большменш расчышчанай дарозе, і таму адразу пацікавіўся ў гаспадыні, хто прыязджаў, хто пачысціў шлях.

— Два дні таму хадзіла ў вёску Прусінава Уздзенскага раёна (за 5 кіламетраў), выпісала трактар, бо ад кіраўніцтва нашага музея ні слыху ні дыху, — кажа Лідзія Міхайлаўна. — Заплаціла ўласныя грошы, і цяпер ёсць надзея, што нарэшце прывязуць і газ. А больш што мне трэба, каб перазімаваць?

Ласток — адзін з «жывых» Коласавых куточкаў, але самы занядбаны з іх. І гэта адчуваецца нават па адным мемарыяльным пакойчыку, які сваёй беднай экспазіцыяй наўрад ці каго моцна зацікавіць. А дом сапраўдны, не муляж, як у іншых месцах. Колас правёў тут пяць дзіцячых гадоў — з 1885 па 1890. Многія рэчы ў хаце — Коласава аўтэнтыка — дзверы, клямкі, печ.

— Печ, верагодней за ўсё, была перакладзена, — удакладняе гаспадыня, — бо немагчыма, каб печ служыла болей за 120 гадоў. Дарэчы, і гэтая печ у аварыйным стане і мне забаронена ёю карыстацца, але што рабіць, калі газу таксама няма, а на дварэ такія маразы?

Дзіўна, жыве чалавек, які даглядае сапраўдную рэліквію, усімі сіламі імкнецца захаваць яе, а навакольнаму свету да ўсяго гэтага нібыта ніякай справы.

Калі і пры якіх абставінах цікавяцца вамі іншыя музейныя працаўнікі з Акінчыц ці з Мінска? — пытаюся я.

— Звоняць, звычайна ў канцы месяца, пытаюцца, колькі святла нагарэла. А каб так пазваніць, спытацца пра жыццё, праблемы, дык ніколі. Нават з Новым годам не павіншавалі. Ды што там свята — у дзень выбараў ніхто не тое што не даехаў — не пазванілі.

Летась, з-за адсутнасці сродкаў, як патлумачыла ластоўская жыхарка, музей не выпісаў ёй ні торфу, ні дроў. Застаецца браць у рукі сякеру і ісці ў лес. Ён жа вакол, побач. Але такі прыгожы!

Пасля Ластка я праехаў па ўсіх Коласавых куточках. Да Альбуці таксама не было ніводнага следу. Турыстамі і экскурсіямі тут, у самы разгар школьных канікулаў, нават не пахла.

— Што вы, якія экскурсіі, — здзівіліся ў Акінчыцах, самым блізкім ад Стоўбцаў Коласавым музеі, — у гэткую халадэчу да нас не прыязджаюць...

Анатоль КЛЯШЧУК. Фота аўтара.



ПАЛЯПШЭННЕ ЖЫЛЛЁВЫХ УМОЎ — ТОЛЬКІ ПРАЗ КРЭДЫТ І ПРЫБУДОВУ ДА ДОМА?

«ГАРАЧЫ» 287 17 41

Задной з вёсак Буда-Кашалёўскага раёна звярнулася жанчына, маці чацвярых дзяцей. Можна было толькі здагадвацца, што падштурхнула яе патэлефанаваць у газету, паколькі прамых пытанняў ад заяўніцы, нягледзячы на ўсе намаганні ўдакладніць сітуацыю, мы так і не пачулі. Зразумелым было толькі тое, што жанчыну цікавіла жыллёвае пытанне, прычым у своеасаблівым кантэксце: «Мы б хацелі атрымаць дом на 120 квадратных метраў з выгодамі».

З канкрэтных фактаў прагучала літаральна наступнае: у сям'і ва ўласнасці ёсць цагляны дом жылой плошчай 43 квадратныя метры. Без выгодаў у ім: ні туалета, ні ваннага пакоя. Дзеці да сямі гадоў. Муж — інвалід III групы. Працоўнай групы, але ён не працуе. У самой вёсцы жыллё не будуецца. Быццам бы ў сельскім Савеце сказалі, што можна разлічваць на жыллё ад гаспадаркі, але для гэтага муж павінен працаўладкавацца...

Па просьбе рэдакцыі праверкай выкладзенай інфармацыі і, самае галоўнае, высвятленнем таго, што ж на самай справе хацелі людзі, займаўся **намеснік старшыні па будаўніцтве Буда-Кашалёўскага райвыканкама Валерый ТРАЦЦЯКОЎ**. Што тычыцца галоўнага, на жаль, так і засталося таямніцай, што ж укладвалі ў свой зварот заяўнікі: як зазначыў Валерый Аляксандравіч на момант падрыхтоўкі намі адказу, ніякага волевыяўлення ад іх не паступіла. А ўвогуле сітуацыя з жыллёвымі ўмовамі сям'і наступная.

— Пасведчанне шматдзетнай яна атрымала літаральна ў канцы лістапада. Сям'ю адразу ж паставілі ў чаргу ў сельскім Савеце на паляпшэнне жыллёвых умоў. У ёй яна стаіць пад нумарам адзін, гэта ўвогуле адзіная шматдзетная сям'я ў вёсцы, — расказаў Валерый Трацціякоў. — У сям'і ва ўласнасці ёсць цагляны дом агульнай плошчай 76 квадратных метраў. Гэта, вядома, малавата. Але сацыяльнае жыллё не будуецца на тэрыторыі ўсяго сельскага Савета. Выйсцем для сям'і было б будаўніцтва прыбудовы да дома з мэтай пашырэння плошчы. Для гэтага можна было б узяць льготны крэдыт пад адзін працэнт на 40 гадоў. Улічваючы статус шматдзетнай сям'і, дзяржава пагашае 70 працэнтаў ад агульнага кошту работ (100 працэнтаў — калі ў сям'і пяць і больш дзяцей), і гэты адзін працэнт распаўсюджваецца толькі на тыя 30 працэнтаў, што застаюцца. У цяперашнім жыллі заяўнікаў — газавае ацяпленне, мясцовая каналізацыя. Зрэшты, як і ва ўсіх іншых дамах у вёсцы.

Праўда, як далей заўважыў Валерый Аляксандравіч, у сям'і час ад часу ўзнікае запазычанасць за ацяпленне, якую яна пагашае. Як будзе далей з аплатай, калі, напрыклад, плошча жылля павялічыцца, незразумела. Нагадаем, гаспадар не працуе, а сума даходаў на члена сям'і зараз не дае магчымасці людзям прэтэндаваць нават на адрасную сацыяльную дапамогу. У сельскагаспадарчым прадпрыемстве сапраўды вядзецца будаўніцтва дамоў тыпавых праектаў агульнай плошчай 80-85 квадратных метраў. Ці зможа прэтэндаваць на такое жыллё гаспадар, сказаць цяжка. Акрамя таго, што мужчына з групай інваліднасці пакуль не спрабаваў туды ўладкавацца, у сям'і маецца свой дом...

Сяргей РАСОЛЬКА.

У МІНСКАЙ ВОБЛАСЦІ ЛАДЗЯЦЬ КАЛЯДНЫЯ ЗАБАВЫ

Пра гэта БЕЛТА паведаміла намеснік начальніка ўпраўлення культуры Мінскага аблвыканкама Святлана Баранок.

Вялікую праграму 13 студзеня падрыхтаваў Барысаўскі раён: калядныя прадстаўленні тут пройдуць у чатырох сельскіх населеных пунктах (Нова-Янчына, Вяляцічы, Мётча, Карсакавічы). У Любанскім (Закальнае, Дарасіна, Ляхаўка) і Бярэзінскім (Навіны, Чыжаха, Дзмітравічы, Міхалева, Любушаны) раёнах у гэты дзень правядуць абрад «Шчодрык».

Народны абрад «Калядныя цары» (ён унесены ў Спіс сусветнай нематэрыяльнай культурнай спадчыны, якая мае патрэбу ў тэрміновай ахове) правядуць на Шчодры вечар жыхары вёскі Семежава Капыльскага раёна. Асаблівасць каляднага свята ў тым, што сустракаецца яно толькі ў вёсцы Семежава. У абрадзе ўдзельнічаюць маладыя мужчыны і юнакі, так званыя «цары», апранутыя ў спецыяльныя касцюмы (белыя штаны і кашулі). Працэсія цароў на Шчодры вечар наведвае дамы вяскоўцаў і разыгрывае драму «Цар Максіміліян». Завяршаецца прадстаўленне традыцыйным віншаваннем гаспадароў дома і адорваннем удзельнікаў абраду. З надыходам цемры цары запальваюць факелы, што надае дзейству асаблівую відовішчнасць.

19 студзеня на возеры ў Капылі правядуць абрадавае свята «Хрышчэнне». Завершыць калядныя святкаванні 21 студзеня традыцыйны абрад «Цягнуць Каляду на дуба» ў Бярэзінскім раёне. Штогод тут у гэты дзень праводзяць Каляду, цягнуць на вуліцах да высокага дуба або барану, на якой стаіць гаршчок з куццёй (яго потым разбіваюць, прыносячы ахвяру прыродным стыхіям і душам продкаў), або кола са святочна ўпрыгожаным снапом, або куль саломы. Падчас дзейства гучаць абрадавыя песні, усе ўдзельнікі працэсіі танцуюць і весяляцца.

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

...ПРЫЦЯГВАЦЬ ДА АДКАЗНАСЦІ...

«Год прайшоў, а ферма як пуставала, так і пустуе...»

Паводле слоў першага намесніка міністра сельскай гаспадаркі і харчавання Надзеі Каткавец, недастаткова актыўна вядзецца на месцах работа па перадачы фермерскім гаспадаркам будынкаў, збудаванняў, машын і абсталявання, якія не выкарыстоўваюцца. «На нізкім узроўні пастаўлена гэта работа ў Брэсцкай і Гродзенскай абласцях: там за два гады — 2008 і 2009 — фермерскім гаспадаркам прададзена і перададзена ў арэнду толькі па адным жывёлагадоўчым памяшканні. На Міншчыне ж наогул ніводзін пустуючы аб'ект не быў перададзены фермерам».

— Я прасіў у вёсцы Сакі два будынкі, якія стаяць без справы ўжо 15 гадоў, — распавядае Уладзімір Арцюкевіч. — Прасіў, прасіў, у выніку старшыня райвыканкама прапанаваў мне забраць гэтыя аб'екты разам з СВК. Вось глядзіце: я маю з 13 гектараў зямлі штогадовую выручку ў памеры больш за 2 мільярды. СВК атрымлівае прыблізна такую ж выручку, але пры гэтым у яго распрададжэнні ажно 2 тысячы гектараў зямлі. Пра якую эфектыўнасць тут можна казаць?.. Таму сёння трэба правесці рэвізію ў СВК, пасля якой адстаючыя гаспадаркі перадаць фермерам альбо далучыць да некага яшчэ, бо вытворчасць павінна быць эфектыўнай, людзі павінны атрымаць добрую зарплату.

— Усе закінутыя аб'екты павінны быць знесеныя ці перададзеныя за адну базавую велічыню фермерам, — лічыць генеральны дырэктар Гродзенскай абласной асацыяцыі фермераў. — Але... Толькі зараз у мяне на працоўным стале ляжаць чатыры звароты ад фермераў, якія хацелі б купіць закінутыя памяшканні. Думаюце, гэтыя пытанні вырашаны? Не. Фермер звярнуўся да кіраўніка адной гаспадаркі. Той яму адмовіў. Маўляў, ферма будзе перанесена ў іншае месца. Год прайшоў, а яна як пуставала, так і пустуе.

КАМЕНТАР МІНІСТРА СЕЛЬСКАЙ ГАСПАДАРКІ І ХАРЧАВАННЯ:

«Мы прытрымліваемся думкі, што зносіцца павінны толькі тыя закінутыя будынкі, якія ўяўляюць небяспеку для жыцця і здароўя людзей альбо знаходзяцца ў непрыдатным для далейшага выкарыстання стане. Астатнія ж, якія могуць яшчэ служыць, павінны быць адрамантаваныя ці перададзеныя ў гаспадарлівыя рукі. Дырэктывай № 4 прадугледжаны гэтыя патрабаванні. Мы ж, у сваю чаргу, будзем сачыць за выкананнем гэтага рашэння органамі мясцовай улады».

«Чаму Мінскі трактарны завод не можа даваць фермерам тэхніку ў лізінг?»

Генеральны дырэктар Гродзенскай абласной асацыяцыі фермераў распавёў, што фермеры Гродзеншчыны летась атрымалі ў лізінг ад «Белагрсэрвіса» 29 трактароў. Заявак жа было 71 (!). «Чаму Мінскі трактарны завод не можа ўзяць на сябе функцыі лізінгадаўцы на такіх жа ўмовах (на 5-7 гадоў з выплатай першапачатковых працэнтаў з далейшым пагашэннем), як «Белагрсэрвіс»?» — пацікавіўся ён у міністра. А Галіна Матус выказала прапанову выдаваць фермерам на конкурснай аснове льготныя крэдыты на пакупку замежнай энерганасычанай тэхнікі.

КАМЕНТАР МІНІСТРА СЕЛЬСКАЙ ГАСПАДАРКІ І ХАРЧАВАННЯ:

«Што тычыцца лізінгу праз трактарны завод, то ў гэтай прапанове ёсць рацыянальнае зерне. Мы ўжо думалі над гэтым пытаннем. Не перажывайце, мы дадзім вам магчымасць на прымальных умовах набыць тэхнікі столькі, колькі вам трэба. У прыватнасці, мы прапаноўваем, каб крэдытныя рэсурсы выдаткоўваліся фермерам у залежнасці ад кірунку іх дзейнасці (на 8 гадоў на будаўніцтва, рэканструкцыю і выкуп вытворчых аб'ектаў і на закупку сельгасмашын, на 5 гадоў — на набыццё шматгадовых насаджэнняў, на 3 гады — на набыццё сельгасжывёл, на 1 год — на набыццё мінеральных угнаенняў).

Што тычыцца імпартнай тэхнікі, то бюджэтныя і крэдытныя сродкі Рэспублікай Беларусь накіроўваюцца толькі на закупку айчыннай тэхнікі. Ёсць свае грошы? Калі ласка, набывайце за мяжой, ніхто ж не перашкаджае. Мы толькі можам хадайнічаць перад кіраўніком дзяржавы аб вызваленні ад падатку на дабаўленую вартасць і зніжэнні мытнай стаўкі ўвозу. Што тычыцца другой крэдытнай крыніцы — іншаземнай крэдытнай лініі, — таксама вам ніхто не забараняе знаходзіць інвестара, браць крэдыты і разлічвацца».

«Трэці год наша гаспадарка выкідваецца з дзяржпраграмы»

— Фермераў не надта ахвотна ўключаюць у дзяржаўныя праграмы, — адзначыў **Уладзімір МАЛІНОЎСКІ, кіраўнік фермерскай гаспадаркі «Дзіяна» Шклоўскага раёна**. — Напрыклад, я займаюся вырошчваннем элітнага насення пшаніцы, ячменю і бульбы. Трэці год у нашай вобласці дзейнічае праграма аснашчэння элітавытворчых гаспадарак сучаснымі лініямі ачысткі і пратручвання насення, і трэці год наша гаспадарка, якая пастаўляе значны аб'ём насення на вобласць, выкідваецца з гэтай праграмы.

— Я б прапанавала, — кажа Галіна Матус, — зноў-такі арганізаваць конкурс, у якім на роўных умовах прымалі б удзел як фермерскія гаспадаркі, так і СВК. У тым выпадку, калі пры ўдзеле ў пэўнай праграме фермер рэальна можа спрацаваць лепш, то чаму б дзяржаўныя грошы не выкарыстаць з большай эфектыўнасцю? Нам з мужам пашанцавала: нашу гаспадарку ўключылі ў Дзяржаўную праграму будаўніцтва жылля на сяле. Летась мы пабудавалі для сваіх работнікаў (а іх у нас 40 чалавек) пяць дамкоў. Сёлета плануем пабудаваць яшчэ столькі ж. Гэта вельмі важна, бо ўтрымаць талковых работнікаў на сяле, не будуючы для іх жылля, вельмі складана.

КАМЕНТАР МІНІСТРА СЕЛЬСКАЙ ГАСПАДАРКІ І ХАРЧАВАННЯ:

«Мы напрацавалі 17 новых дзяржаўных праграм самых розных кірункаў. Калі ласка, прыходзьце, мы чакаем вас паўсюль, дзе вы можаце праявіць сябе. Ёсць грошы, жаданне — прыходзьце. Праграмы адкрытыя. Асаблівую стаўку робім на малочны статак, таму гэтая галіновая праграма прадугледжвае самыя выгадныя льготныя крэдытныя ўмовы. Недастаткова ў рэспубліцы і фермаў па вытворчасці мяса качкі, індычкі... Што тычыцца ўключэння фермерскіх гаспадарак у праграму будаўніцтва жылля, то над гэтым пытаннем трэба яшчэ працаваць і працаваць».

* * *

Як бачыце, прапаноў было вельмі шмат. Сярод іх і зусім новыя. Напрыклад, генеральны дырэктар Гродзенскай абласной асацыяцыі фермераў выказаў думку, што «нядрэнна было б пераняць вопыт Францыі. У прыватнасці, у тым, каб маладым фермерскім гаспадаркам даваць беспрацэнтную пазыку. Калі раптам гаспадарка развальваецца праз год-два, то былы фермер павінен вярнуць грошы разам з працэнтамі. Калі ж прапрацаваў 5 гадоў і дэманструе неблагія вынікі, то яму гэтую пазыку гасяць». Якія з прапаноў у рэшце рэшт будуць уключаныя ў Дзяржаўную праграму, а якія не — пакажа час. Фермеры спадзяюцца на тое, што чакаць засталося нядоўга і што новы дакумент не толькі пашырыць магчымасці развіцця фермерства ў Беларусі, але зменіць стаўленне да іх органаў мясцовай улады.

Надзея ДРЫЛА.

ДАВЕДКА «ЗВЯЗДЫ»

- З 1991 года ў рэспубліцы было арганізавана больш за 6 тысяч фермерскіх гаспадарак. На пачатак мінулага года іх засталося крыху больш за 2 тысячы. Больш за ўсё — 23 адсоткі — фермерскіх гаспадарак прыходзіцца на Міншчыну.
- Большасць кіраўнікоў фермерскіх гаспадарак маюць вышэйшую (36%) і сярэднеспецыяльную (43%) адукацыю.
- **Узроставы склад кіраўнікоў фермерскіх гаспадарак:**

Да 30 гадоў — 5%;
ад 30 да 40 гадоў — 21%;
ад 40 да 50 гадоў — 47%;
ад 50 да 60 — 21%;
звыш 60 гадоў — 6 %.

- Асноўны кірунак фермерскай дзейнасці ў Беларусі — раслінаводства (80%).
- Удзельная вага фермерскіх гаспадарак у агульным аб'ёме вытворчасці асноўных відаў сельгаспрадукцыі па рэспубліцы складае каля 2%.

Пацяпленне клімату

МІНУЛАЕ ЛЕТА Ў БЕЛАРУСІ БЫЛО САМЫМ СПЯКОТНЫМ

Сярэдняя тэмпература паветра ў Беларусі за 2010 год склала 6,9 градуса, што на 1,1 градуса вышэй за кліматычную норму, паведаміла дырэктар дэпартамента па гідраметэаралогіі Мінпрыроды Марыя ГЕРМЯНЧУК. Такім чынам, мінулы год у чарговы раз пацвердзіў тэорыю глабальнага пацяплення, якое пачалося напрыканцы 80-х гадоў мінулага стагоддзя.

Вельмі гарачы ліпень і адсутнасць замаразкаў у маі

Паводле інфармацыі **начальніка аддзела клімату Белгідраметцэнтра Алены КАМАРОЎСКАЙ**, летась на працягу ажно 8 месяцаў тэмпература паветра ў Беларусі перавышала кліматычную норму. Станоўчая анамалія тэмпературы была зафіксавана з лютага па жнівень і ў лістападзе. А вось у студзені, кастрычніку і снежні было халадней.

Самым цёплым выдаўся красавік, калі тэмпература паветра была большая за кліматычную норму ажно на 2,6 градуса. Пераход сутачнай сярэдняй тэмпературы праз 0 градусаў у бок павелічэння (развітанне з кліматычнай зімой) было 18—20 сакавіка, што на 5—12 дзён раней за сярэднія шматгадовыя даты.

Рэдкай з'явай летась былі веснавыя замаразкі, якія вельмі небяспечныя для будучага ўраджаю ў маі.

Незвычайна спякотным летась было лета, сярэдняя тэмпература па краіне якога склала 20,6 градуса, што перавысіла кліматычную норму ажно на 3,8 градуса. Лета 2010-га стала самым цёплым за ўвесь час назіранняў. Да апошняга часу самым цёплым было лета 1999 года, калі сярэдняя тэмпература па краіне была 19,4 градуса.

А вось самым гарачым у сезоне месяцам стаў ліпень, сярэдняя тэмпература якога склала 22,6 градуса, што на 4,8 градуса вышэй за норму. Менавіта ў ліпені ажно на 9 метэастанцыях былі пабіты рэкорды па абсалютным максімуме за месяц. Самая вялікая тэмпература +36,2 градуса была зафіксавана ў Жлобіне 23 ліпеня.

Вельмі спякотным летась быў і жнівень, сярэдняя тэмпература паветра якога склала 20,8 градуса, што больш за кліматычную норму на 4,3 градуса. У апошні месяц лета тэмпературныя рэкорды былі пабіты ўжо на 28 метэастанцыях. А ўвогуле ў жніўні быў зафіксаваны новы абсалютны максімум тэмпературы паветра ў Беларусі. На метэастанцыі Гомель 8 жніўня тэмпература дасягала адзнакі 38,9, а ў аэрапорце Гомеля ажно 39,2 градуса. Да мінулага года самая высокая тэмпература паветра была зарэгістравана 20 жніўня 1946 года на метэастанцыі Васілевічы. Гэты рэкорд трымаўся 65 гадоў.

Даволі цёпла было летась і ў лістападзе, сярэдняя тэмпература якога склала плюс 4,5 градуса, што вышэй за кліматычную норму на 3,8 градуса. Такім цёплым лістапад бывае ў Беларусі раз у 20 гадоў.

Толькі ў апошні месяц мінулага года Беларусь істотна падмарозіла, калі сярэдняя тэмпература снежня склала мінус 7 градусаў, што ніжэй за кліматычную норму на 3 градусы. Такім халодным снежань у нашай краіне бывае прыкладна раз за 10 гадоў.

Моцныя ліўні ў верасні, а ў лістападзе — навальніцы

Спецыялісты падлічылі, што за мінулы год у Беларусі выпала 728 мм ападкаў, што складае 111 працэнтаў ад нормы. Сухімі былі летась студзень, сакавік, красавік і кастрычнік. Даволі вільготным было мінулае лета, калі выпала 255 мм ападкаў, што складае 105 працэнтаў ад кліматычнай нормы. А вось восенню выпала 187 мм ападкаў, што ўжо склала 118 працэнтаў ад кліматычнай нормы. Вельмі вільготнымі былі верасень і лістапад, а вось кастрычнік быў амаль сухім (53 працэнты ад нормы). У асобныя дні верасня на большасці метэастанцый краіны сутачная колькасць ападкаў перавышала 20 мм. Максімальная колькасць ападкаў за суткі (65 мм) зарэгістравана 1 верасня ў Брэсце. Такі моцны ліўень у Брэсце ў верасні быў зафіксаваны ўпершыню за ўвесь час назіранняў.

Вельмі рэдкая атмасферная з'ява для позняй восені назіралася летась 10 лістапада. У гэты дзень у Навагрудку, Езярышчах і вакол Мінска адзначаліся навальніцы. Лістападаўскія навальніцы назіраюцца ў гэтых рэгіёнах раз у 30 гадоў.

Заснежыла на дзве дэкады раней

Летась устойлівае снежнае покрыва ўсталявалася ў Беларусі ўжо ў апошнія дні лістапада, што на 1-2 дэкады раней за звычайныя тэрміны. Па стане на 31 снежня вышыня снежнага покрыва складае ад 15 сантыметраў у Брагіне і Гомелі да 44 сантыметраў у Полацку. На 14 метэастанцыях Віцебскай, Мінскай і Брэсцкай абласцей так шмат снегу сіноптыкі не фіксавалі яшчэ ніколі.

Як паведаміў **начальнік службы гідраметэапрагнозаў Белгідраметцэнтра Дзмітрый РАБАЎ**, цяпер запас вады ў снезе адпавядае ад 20 да 108 мм, што ў 1,5—2 разы больш за мінулагодні паказчык. Воднасць у снежні на Дняпры, Сожы і Прыпяці перавышае норму на 20—40 працэнтаў.

Сёння на рэках і вадасховішчах ледастаў з таўшынёй лёду на рэках 12—28 см, на вадаёмах 25—28 см. На Дняпры каля Лоева, Сожы побач са Слаўгарадам, Прыпяці (вёска Чэрнічы), і рэках Мухавец, Свіслач, Піна, Убарць вада трапіла на пойму з-за павелічэння ўзроўняў вады ў час снежаньскай адлігі. На выхадныя адбылося пацяпленне і чарговае павелічэнне ўзроўняў вады. І, як вынік — выхад вады на пойму на Нёмане каля вёскі Беліца і Бесядзь побач з вёскай Свяцілавічы.

Гэтая сітуацыя на рэках паказвае, што вясной у Беларусі магчымая даволі сур'ёзная паводка.

Сяргей КУРКАЧ.

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

ЗАВЕРЕНО
Департамент по ценным бумагам
Министерства финансов
Республики Беларусь
_____А.Л.Гальперин
04.01.2011 г.

УТВЕРЖДЕНО
Протокол Наблюдательного совета
ЗАО «АБСОЛЮТБАНК»
16.12.2010 № 42

КРАТКАЯ ИНФОРМАЦИЯ
об открытой продаже облигаций ЗАО «АБСОЛЮТБАНК» первого выпуска

Наименование эмитента:
на русском языке: полное – Закрытое акционерное общество «АБСОЛЮТБАНК»;
сокращенное – ЗАО «АБСОЛЮТБАНК»;
на белорусском языке: полное – Закрытае акцыянернае таварыства «АБСАЛЮТБАНК»;
сокращенное – ЗАТ «АБСАЛЮТБАНК».

Место нахождения эмитента, телефон, факс, электронный адрес (e-mail):
Республика Беларусь, 220023, г. Минск, проспект Независимости, 95, телефон: (017) 267 77 18, факс (017) 211 83 55, e-mail: root@absolutbank.by.

Наименование депозитария, обслуживающего эмитента:
Депозитарием, обслуживающим эмитента, является структурное подразделение ЗАО «АБСОЛЮТБАНК», расположенное по адресу: 220023, г. Минск, проспект Независимости, 95, действующее на основании специального разрешения (лицензии) № 02200/0385603 на право осуществления профессиональной и биржевой деятельности по ценным бумагам, выданное Министерством финансов Республики Беларусь, срок действия до 29 июля 2012 года.

Наименование периодического печатного издания, в котором будет публиковаться годовой отчет эмитента (бухгалтерский баланс, отчет о прибыли и убытках, отчет об изменении капитала, отчет о движении денежных средств), и сроки его публикации:
Годовой отчет Банка будет публиковаться в газете «Рэспубліка» не позднее 25 апреля года, следующего за отчетным.

Размер уставного фонда:
Уставный фонд ЗАО «АБСОЛЮТБАНК» составляет 21 217 553 150 (Двадцать один миллиард двести семнадцать миллионов пятьсот пятьдесят три тысячи сто пятьдесят) белорусских рублей.

Дата принятия решения о выпуске облигаций и наименование органа, принявшего это решение:
Решение о выпуске облигаций первого выпуска (далее – облигации) принято Наблюдательным советом Банка 16.12.2010 года (протокол № 42).

Место, время и способ ознакомления с более подробной информацией (проспектом эмиссии облигаций):
С более подробной информацией и Проспектом эмиссии облигаций ЗАО «АБСОЛЮТБАНК» первого выпуска можно ознакомиться, начиная с даты публикации в средствах массовой информации текста данной краткой информации об открытой продаже облигаций, в месте продажи облигаций на внебиржевом рынке по адресу: г. Минск, проспект Независимости, 95 в течение рабочего времени (понедельник – четверг – с 9.00 до 16.00, пятница – с 9.00 до 15.15), а также на Интернет-сайте эмитента в сети Интернет по адресу: http://www.absolutbank.by/.

Форма выпуска облигаций, объем эмиссии, количество облигаций:
Форма выпуска облигаций – именные, дисконтные, в бездокументарной форме (в виде записей на счетах), неконвертируемые.
Объем эмиссии облигаций составляет: 10 000 000 000 (Десять миллиардов) белорусских рублей.
Количество облигаций, предлагаемых к открытой продаже: 100 000 (Сто тысяч) облигаций, которым присвоена серия «АБО1», номера «000001-100000».

Номинальная стоимость облигаций:
Номинальная стоимость облигаций – 100 000 (Сто тысяч) белорусских рублей.

Цель выпуска облигаций:
Целью выпуска облигаций является привлечение временно свободных денежных средств юридических лиц для формирования ресурсной базы Банка.

Период проведения открытой продажи облигаций:
Дата начала продажи: 17 января 2011 года.
Дата прекращения продажи: 11 января 2012 года.
Дата погашения облигаций: 17 января 2012 года.

Место и время проведения открытой продажи облигаций:
Открытая продажа облигаций осуществляется на внебиржевом рынке в соответствии с законодательством Республики Беларусь.
Владельцами облигаций могут быть только юридические лица – резиденты и нерезиденты Республики Беларусь в соответствии с законодательством Республики Беларусь.
Для приобретения облигаций юридические лица могут обращаться в Банк (г. Минск, проспект Независимости, 95) в течение рабочего времени (понедельник – четверг – с 9.00 до 16.00, пятница – с 9.00 до 15.15).
Юридические лица, изъявившие желание приобрести облигации на внебиржевом рынке, обязаны перечислить Банку денежные средства в безналичном порядке в соответствии с договором купли-продажи (первичного размещения) облигаций.

Срок обращения облигаций:
Обращение облигаций осуществляется на внебиржевом рынке в соответствии с законодательством Республики Беларусь.
Срок обращения облигаций составляет 365 (Триста шестьдесят пять) календарных дней, с 17 января 2011 года по 17 января 2012 года. Для расчета срока обращения облигаций день начала открытой продажи и день погашения облигаций считаются одним днем, при этом день продажи в расчет не принимается.

Дата начала погашения облигаций. Дата, на которую формируется реестр владельцев облигаций, и порядок погашения облигаций:
Погашение облигаций осуществляется 17 января 2012 года с 9.00 до 16.00 по адресу: г. Минск, проспект Независимости, 95.
Погашение облигаций производится владельцам облигаций, имеющим право приобретать облигации в соответствии с условиями выпуска облигаций, в день их погашения на основании реестра владельцев облигаций. Реестр владельцев облигаций формируется по состоянию на 12 января 2012 года.
Владельцы облигаций обязаны прекратить все сделки с облигациями с 12 января 2012 года.
В случае, если день погашения облигаций приходится на нерабочий день, погашение облигаций осуществляется в первый рабочий день, следующий за нерабочим днем. Проценты на сумму погашения за указанные нерабочие дни не начисляются и не выплачиваются.
Банк осуществляет списание денежных средств со своего счета по реквизитам владельцев облигаций в день погашения облигаций. Обязанность по погашению облигаций считается исполненной с момента списания денежных средств со счета Банка по реквизитам владельцев облигаций.
В случае отсутствия в реестре владельцев облигаций данных о банковских реквизитах владельцев облигаций, сумма, подлежащая выплате, выплачивается путем депонирования на счете Банка до непосредственного обращения владельца облигаций. Проценты по депонированным суммам не начисляются и не выплачиваются.
При погашении облигаций владельцам возмещается номинальная стоимость облигаций денежными средствами в сумме и валюте номинала облигации в безналичном порядке в соответствии с законодательством Республики Беларусь.

Размер или порядок определения размера дохода по облигациям, условия его выплаты:
Продажа облигаций осуществляется с дисконтом.
Доход по облигациям (дисконт) – разница между номинальной стоимостью облигации и фактической ценой ее продажи.
Дисконтные облигации продаются по цене ниже номинальной стоимости. Цена продажи одной облигации устанавливается ежедневно.
При расчете суммы дохода доход начисляется за каждый календарный день года.
Выплата дохода по облигациям осуществляется единовременно при погашении облигаций.
Доходность при размещении облигаций первого выпуска определяется эмитентом в размере 15 (Пятнадцать целых ноль десятых) процентов годовых.
В день начала открытой продажи облигации размещаются по цене, которая рассчитывается по формуле:

$$Ц = \frac{N}{П/100 \times (К365/365 + К366/366) + 1},$$

где:
Ц – цена продажи облигаций (белорусские рубли);
N – номинальная стоимость облигаций (100 000 белорусских рублей);
П – доходность, установленная при выпуске (15,0% годовых);
К365 – количество дней обращения дисконтных облигаций, приходящееся на календарный год, состоящий из 365 дней;
К366 – количество дней обращения дисконтных облигаций, приходящееся на календарный год, состоящий из 366 дней.
Начиная с календарного дня, следующего за днем начала открытой продажи облигаций, облигации продаются первому их собственнику по текущей стоимости, определенной на день продажи.
Минимальная цена продажи облигаций – 86958 белорусских рублей.
Текущая стоимость дисконтных облигаций рассчитывается по следующей формуле:

$$С = Ц + \frac{Ц \times П}{100} \times \left(\frac{К365}{365} + \frac{К366}{366}\right),$$

где:
С – текущая стоимость дисконтных облигаций (белорусские рубли);
Ц – цена облигаций (белорусские рубли), определенная эмитентом в день начала открытой продажи;
П – доходность, установленная при выпуске (15,0% годовых);
К365 – количество дней обращения дисконтных облигаций, приходящееся на календарный год, состоящий из 365 дней;
К366 – количество дней обращения дисконтных облигаций, приходящееся на календарный год, состоящий из 366 дней.
Количество дней обращения облигаций определяется с дня начала их открытой продажи (размещения) по день расчета их текущей стоимости. День начала открытой продажи (размещения) и день расчета их текущей стоимости считаются одним днем, при этом день продажи в расчет не принимается.
Расчет цены продажи и текущей стоимости осуществляется по каждой облигации, исходя из фактического количества дней в году.
Расчет цены продажи и текущей стоимости осуществляется с точностью до одного белорусского рубля. Округление производится по правилам математического округления.
Продажа облигаций осуществляется по цене ниже номинальной стоимости. Доходом по облигациям является дисконт, который рассчитывается по следующей формуле:

$$Д = N - С$$

где:
Д – дисконт (белорусских рублей);
N – номинальная стоимость облигаций (100 000 белорусских рублей);
С – текущая стоимость дисконтных облигаций (белорусские рубли).

Условия и порядок приобретения облигаций эмитентом до даты начала их погашения (выкуп):
Банк имеет право выкупать облигации в течение всего срока обращения облигаций по цене, определяемой Банком.
Досрочный выкуп облигаций осуществляется Банком на внебиржевом рынке с заключением договора купли-продажи.
Банк имеет право совершать следующие операции с выкупленными облигациями:
- продавать на вторичном рынке по договорной цене;
- досрочно погасить облигации – в случае выкупа всего объема эмиссии облигаций;
- иные действия с выкупленными облигациями в соответствии с законодательством Республики Беларусь.

Условия и порядок возврата средств инвесторам при запрете выпуска облигаций Департаментом по ценным бумагам Министерства финансов Республики Беларусь:
При запрете выпуска облигаций Департаментом по ценным бумагам Министерства финансов Республики Беларусь эмитент в срок не позднее 30 рабочих дней с даты принятия решения о запрете выпуска возвращает владельцам облигаций денежные средства, полученные эмитентом в счет оплаты облигаций.

Дата и номер государственной регистрации облигаций:
Облигации зарегистрированы Департаментом по ценным бумагам Министерства финансов Республики Беларусь 04.01.2011 года, регистрационный номер выпуска: 5-200-02-0956.

Информация об обеспечении облигаций:
Облигации выпускаются в соответствии с подпунктом 1.8 пункта 1 Указа Президента Республики Беларусь от 28 апреля 2006 г. № 277 «О некоторых вопросах регулирования рынка ценных бумаг».
Общий размер обязательств по облигациям не превышает 80 (Восемьдесят) процентов нормативного капитала Банка.
Нормативный капитал Банка на 01.11.2010 составляет 30 404.7 млн. белорусских рублей.
Выпуск облигаций согласован с Национальным банком Республики Беларусь – постановление Правления Национального банка Республики Беларусь № 577 от 27.12. 2010 года.

Председатель Правления **Б. Г. Чередник**
Главный бухгалтер **О. С. Турбина**
УНП 100331707.

СЁЛЕТА КУП «МІНСКХЛЕБПРАМ» МАЕ НАМЕР ЭКСПАРТАВАЦЬ ХЛЕБАБУЛАЧНАЙ ПРАДУКЦЫІ І КАНДЫТАРСКІХ ВЫРАБАЎ НА СУМУ КАЛЯ 2 МЛН ДОЛАРАЎ

Традыцыйным попытам на знешніх рынках карыстаецца такая прадукцыя прадпрыемства, як сухары, сушкі, пернікі, вафлі, аўсянае пячэнне. Штотыднёва на экспарт адгружаецца жытне-пшанічны і заварны хлеб. За мяжу пастаўляюцца таксама мучныя ласункі, рахат-лукум, кукурузныя палачкі.

Прадукцыя КУП «Мінскхлебпрам» адгружаецца ў Германію, Ізраіль, Казахстан, Канаду, Латвію, ААЭ, Расію, ЗША, Турцыю, Узбекістан, Украіну. У канцы 2010 года прадпрыемства наладзіла першыя экспартныя пастаўкі новай прадукцыі (замарожанага заварнога хлеба) у Арменію.

Наталля ВАВІЛАВА,
«Мінск—Навіны».

Извещение о проведении 26 января 2011 года повторного открытого аукциона по продаже недвижимого имущества

Номер предмета торгов	№ 1	№ 2
Наименование и характеристики имущества, входящего в состав лота	- Заготовительный участок (производственное) общей площадью 322,6 кв.м, литер З 1/к, год постройки – 1992	- Насосная станция автоматического пожаротушения общей площадью 397,7 кв.м, литер М 2/кп, год постройки – 1978
Местонахождение имущества	г. Минск, ул. Корженевского, 14	
Организатор аукциона	УП «Минский городской центр недвижимости», ул. К. Маркса, 39, 220030, г. Минск	
Балансодержатель	РУП «Завод «Электроника», ул. Корженевского, 14 (к. 416), 220108, г. Минск	
Начальная цена	377 080 000 белорусских рублей	459 860 000 белорусских рублей
Сумма задатка	37 000 000 белорусских рублей	45 000 000 белорусских рублей

На продаваемое имущество обращено взыскание в счет неисполненного налогового обязательства, неуплаченных пеней, примененных экономических санкций.

К участию в аукционе допускаются юридические и физические лица, предоставившие организатору аукциона следующие документы:

заявление на участие в аукционе; заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, порядком проведения аукциона; копии учредительных документов (для юридических лиц) и свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона (в двух экземплярах); заверенную банком копию платежного поручения о внесении задатка; а также иные документы в соответствии с порядком проведения аукциона.

Задаток перечисляется на расчетный счет УП «Минский городской центр недвижимости» № 3012037450010, в филиале ОАО «БПС-Банк» по г. Минску, код 153001334, УНП 190398583.

Заявитель, желающий участвовать в торгах по нескольким предметам торгов, вносит задаток в размере, установленном для предмета торгов с наибольшей начальной ценой.

Победителем торгов признается участник, предложивший наивысшую цену за продаваемый предмет торгов. Процедура проведения торгов установлена порядком проведения аукциона.

Возмещение затрат на организацию и проведение аукциона, в том числе расходов, связанных с изготовлением и предоставлением участникам документации, необходимой для его проведения, осуществляется участником, выигравшим торги.

Оплата стоимости приобретенного имущества осуществляется в течение срока, указанного в протоколе о результатах аукциона.

Аукцион состоится **26 января 2011 года в 12.00** по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов. Прием документов, а также консультации по вопросам участия в аукционе осуществляются **с 12.01.2011 по 24.01.2011 включительно** в рабочие дни с 09.00 до 18.00 (в пятницу – до 16.45) по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб.

Краіна здароўя

Выпуск № 2 (238)

Пытальнік

«ГУСІНАЯ ПРАБЛЕМА»

Нядаўна заўважыла ў сябе на руках пухіркі — «гусіную скуру». Скура загрубела, стала сухой, шурпатай. Пры дотыку нагадвае наждачную паперу. Як з гэтым змагацца?

Святлана ПАЛХОВІЧ, *г. Мінск.*

«Гусіная скура», або, як яе называюць касметолагі, — фалікулярны гіперкератоз — захворванне, пры якім у выніку лішкавага арагавення адбываецца закупорка пратока фалікула лускавінкамі скуры. Фактары рызыкі: спадчыннасць, дэфіцыт вітамінаў А, С. Цалкам пазбавіцца ад фалікулярнага гіперкератозу немагчыма, але можна паспрабаваць зменшыць яго праявы салоннымі метадамі.

Лепшы спосаб — распарыць скуру ў саўне або лазні, а затым зрабіць пілінг з энзімамі або фруктовымі кіслотамі. Яны валодаюць моцнымі адлушчвальнымі ўласцівасцямі. Такія пілінгі выдаляюць адмерлыя клеткі, адкрываюць поры, паляпшаюць структуру і колер скуры, адначасова ўвільгатняючы яе. Безумоўна, эфект праявіцца не адразу. Але калі 2—3 разы на тыдзень апрацоўваць праблемную зону, то ўжо праз 10 працэдур вы заўважыце відавочныя змены: скура стане гладкай і шаўкавістай.

Самымі моцнадзейнымі пілінгамі лічацца растворы з цукровага трыснягу і солі. Адна з апошніх навінак — гарачы салявы пілінг. Ён дазваляе найбольш глыбока ачысціць і «папаліраваць» скуру. Нягледзячы на сваю назву, гэтая працэдура не мае ніякага дачынення да гарачых сродкаў. Проста калі масажыст уцірае салявы скраб, на скуры можа ўзнікнуць адчуванне паколвання і нават пашчыпвання. Справа ў тым, што пры масажы выкарыстоўваюцца мінеральныя і марскія солі, араматызаваныя эфірнымі алеямі. Яны і даюць такія незвычайныя адчуванні.

Яшчэ адзін варыянт — пілінг з марскімі водарасцямі. Ён разгладжвае і змякчае скуру, насычаючы яе мікраэлементамі, мінераламі і кіслародам. У выніку яна становіцца гладкай і аксаміцістай.

Любое адлушчванне неабходна дапаўняць увільгатненнем. Таму пілінгі добра спалучаць з абгортваннямі. Так, водарасцевае абгортванне актыўна сілкуе скуру, вінаграднае — расслабляе і насычае мікраэлементамі, журавінавае — нармалізуе водны баланс. А шакаладнае — гэта наогул панацэя ад усіх бед адразу.

Змагацца з «гусінай скурай» можна і дома. Кожную раніцу і вечар расціраўце праблемныя ўчасткі цвёрдай шчоткай або мачалкай. Пасля гэтага кругавымі рухамі ўцірайце ў іх змякчальны крэм, малачко або алей. У іх абавязкова павінен утрымлівацца вітамін А. Рабіць такія працэдуры трэба пастаянна.

Пры выбары змякчальных сродкаў варта аддаваць перавагу прадуктам з больш лёгкай тэкстурай. Некалькі разоў на тыдзень скуры патрабуецца глыбокае ачышчэнне. Цудоўныя вынікі дае звычайная харчовая сода, якую наносяць на гель для душа. Расціраць цела ў такім выпадку трэба асцярожна. Галоўнае — не перастарацца. Як толькі адчуеце смыленне або паколванне, адразу змывайце сумесь цёплай вадой.

Пры рэгулярным выкарыстанні цудоўнае дзеянне аказвае і саляны скраб хатняга прыгатавання. Трэба змяшаць марскую соль для ванны з гелем для душа або звычайным крэмам для цела. Для ўзмацнення эфекту ў такі скраб можна дадаць молатую каву. Атрыманая сумесь надае пругкасць і выраўноўвае паверхню скуры. Яе неабходна нанесці на распаранае цела і пакінуць хвілін на 5—7, пасля чаго змыць і нанесці ўвільгатняльны крэм.

«Гусіную скуру» мы часцей за ўсё заўважаем нават зімой, калі арганізму не хапае сонца і вітамінаў. Для прафілактыкі добра па 7—10 хвілін на тыдзень загараць у салярыі. Умераныя дозы ўльтрафіялету станоўча ўплываюць на скуру, і разумнае прымяненне штучнага сонца пойдзе ёй толькі на карысць. Акрамя таго, варта наладзіць рэгулярны прыём вітамінаў, сярод якіх абавязкова павінны быць А, С і Е.

УВАГА! *Неабходна памятаць, што ў шэрагу выпадкаў гэта захворванне з'яўляецца сімптомам паталогіі ўнутраных органаў, таму перад пачаткам барацьбы з «гусінай скурай» неабходна пракансультавацца ў доктара. Паспяховае лячэнне асноўнага захворвання зможа з часам нармалізаваць і стан скуры.*

Падрыхтавала Вольга КУЛІНКОВІЧ.

ШТУЧНАЕ СОНЦА АД ПРАСТУДЫ НЕ ЛЕЧЫЦЬ

Наведваць салярый для лячэння прастуды і ВРВІ, як гэта робяць некаторыя мінчане, не мае сэнсу. Ультрафіялетавае выпраменьванне, якое выкарыстоўваецца падчас сеансаў (незалежна ад класа апаратуры), не валодае дэзынфікуючым эфектам.

Такую думку выказала галоўны пазаштатны фізіятэрапеўт Камітэта па ахове здароўя Мінгарвыканкама Галіна Забніна. Паводле слоў спецыяліста, хадзіць у салярый можна для прафілактыкі прастудных захворванняў — з мэтай павышэння імунітэту. Але калі чалавек ужо нездаровы, у яго насмарк, баліць горла, то яму штучнае сонца не дапаможа.

«Трэба ісці да ўчастковага тэрапеўта, які разам з медыкаментозным лячэннем прызначыць фізіятэрапеўтычнае. Напрыклад, кварцаванне насаглотак. Падчас гэтай працэдуры на пацыента ўздзейнічаюць ультрафіялетавыя прамяні, але іншай даўжыні хвалі, у адрозненне ад тых, што выкарыстоўваюцца ў салярыі. Таму кварцаванне валодае бактэрыцыдным дзеяннем», — патлумачыла Галіна Забніна. Таксама спецыяліст нагадала, што ў аматараў салярыяў рызыка развіцця злаякаснай меланомы значна вышэйшая, чым у тых, хто ніколі іх не наведвае.

Вольга ГРЫГОР'ЕВА, *«Мінск—Навіны».*

Твая бяспека

У ГОД БЕЛАЙ КОТКІ НАЛЯГАЙЦЕ НА РЫБУ

СЁННЯ каля 250 мільёнаў чалавек у свеце маюць залішнюю вагу цела. І гэтая лічба пастаянна расце. Прычым рост назіраецца не толькі ў дарослых, але і ў дзяцей. Самая вялікая колькасць людзей з лішкам масы цела ў ЗША: больш за 60%. У Беларусі гэты паказчык складае каля 30—35%, што таксама істотна. Аб праблемах атлусцення і наступствах, да якіх можа прывесці гэтая паталогія, мы гутарым з дацэнтам, кандыдатам медыцынскіх навук, галоўным пазаштатным эндакрынолагам Міністэрства аховы здароўя Рэспублікі Беларусь Алай ШАПЯЛЬКЕВІЧ.

— Атлусценне — не проста нейкі касметычны дэфект, гэта сур'ёзнае хранічнае захворванне, той фактар рызыкі, які вельмі моцна павышае развіццё многіх сацыяльна значных хвароб. Вынікі эпідэміялагічных даследаванняў выявілі дакладную сувязь паміж павелічэннем распаўсюджанасці атлусцення і ростам захваральнасці на цукровы дыябет 2 тыпу, сардэчна-сасудзістыя захворванні, пэўныя формы раку.

— Якія прычыны найчасцей прыводзяць да атлусцення?

— Перш за ўсё праблемы залішняй вагі цела, на жаль, звязаныя з ладам жыцця чалавека. Цывілізацыя прынесла нам рафінаваныя прадукты, дзе ўтрымліваецца вельмі шмат цукру і тлушчаў. Асабліва гэта датычыцца схаваных тлушчаў, якія ёсць у розных соусах тыпу маянэзу, каўбасах, сасісках, сардэльках. Небяспеку нясуць і мучныя здобныя прадукты.

Развіццю атлусцення спрыяе малярухомы лад жыцця, а таксама стрэсы. Апошнія многія людзі імкнуцца «заядаць», у выніку чаго парушаюцца харчовыя паводзіны.

На ўсе гэтыя фактары чалавек можа і павінен уздзейнічаць сам.

— А спадчыннасць мае значэнне?

— Яна адыгрывае ролю не больш чым у 20—25 працэнтах выпадкаў. У асноўным, як я адзначыла, у лішніх кілаграмах вінаваты сам чалавек. Таму вельмі важна вызначыць лішнюю масу цела на пачатковай стадыі, а не тады, калі ў наяўнасці ўжо сур'ёзнае атлусценне, пры якім разбураюцца ўсе органы і сістэмы арганізма. Чалавек павінен насцярожыцца, калі за апошнія 2—3 месяцы ён набраў 3—5 кілаграмаў. У гэтым выпадку варта задумацца над тым, «што я раблю не так, чым харчуюся, чаму ідзе набор масы цела?»

— І якія меры павінен прыняць чалавек, калі заўважыў, што ў яго расце вага?

— Самае галоўнае — трэба, каб чалавек зразумеў, што гэтая сітуацыя ўжо не норма, а шлях да сур'ёзных захворванняў. Псіхалагічны фактар тут адыгрывае вялікую ролю. Важна хацець змяніцца і быць упэўненым, што жаданага выніку дасягнуць можна.

Калі такое разуменне ёсць, то для пачатку трэба весці і аналізаваць дзённік харчавання. Гэта дапаможа зрабіць урач-тэрапеўт або эндакрынолаг.

У дзённік запісваецца ўсё тое, што на працягу тыдня чалавек еў. Некаторыя людзі шчыра лічаць, што яны ядуць мала. А на самай справе, аналізуючы канкрэтную сітуацыю, мы бачым вельмі частыя памылкі. Напрыклад, чалавек думае, што ён толькі крыху перакусіў, але гэты «перакус» уключаў вельмі каларыйныя прадукты, і пацыент з'еў амаль палову сутачнай нормы за адзін прыём, адсюль ідзе і павышэнне вагі.

Важна таксама прааналізаваць, як колькасна харчуецца чалавек: гэта былі сняданак, абед, вячэра ці не. Бо часам інтэнсіўная праца прымушае харчавацца ўвечары. Гэта вялікая памылка. Вечарам чалавек ужо фізічна неактыўны, а пры гэтым яшчэ паеў на ноч, і ў выніку ўся вялікая вячэра адразу пераходзіць у тлушчавую тканку. У дзённіку харчавання трэба адлюстраваць і аналізаваць фізічную актыўнасць за дзень. І не толькі спецыяльныя фізічныя трэніроўкі, але і штодзённую актыўнасць (прагулкі, працы ў садзе, прыборка кватэры, пад'ём па лесвіцы і г.д.).

— Як правільна вызначыць сваю вагу і ступень рызыкі для здароўя?

— Існуе такое паняцце як індэкс масы цела. Ён разлічваецца так: вызначце сваю вагу ў кілаграмах і рост у метрах. Паказчык масы цела ў кілаграмах падзяліце на паказчык росту ў метрах, узведзены ў квадрат. Атрыманая лічба і будзе вашым індэксам масы цела. Для прастаты разлікаў ва ўрачоў ёсць спецыяльныя вызначальнікі індэкса масы цела, якія супастаўляюць рост і вагу. Нармальны індэкс масы — гэта лічба 25, 25—30 — лішак масы цела, але яшчэ не атлусценне, больш за 30 — ужо атлусценне, якое дзеліцца на 1-ю, 2-ю і 3-ю ступені.

— Як вы ставіцеся да навамодных «хуткіх» дыет для пахудзення?

— Любая дыета добрая, калі яна грунтуецца на прынцыпах здаровага харчавання. Гэтыя прынцыпы зразумелыя. Харчаванне павінна быць нізкакаларыйным. Звычайна чалавеку цалкам дастаткова каля 2 тысяч кілакалорый удзень. У ежу варта ўключаць больш садавіны і агародніны. Харчавацца трэба рэгулярна, не грэбаваць сняданкам і абедам. Калі дыета ўключае гэтыя прынцыпы, то яе можна прытрымлівацца.

— Што б вы параілі прыгатаваць да святочнага стала, каб не было рызыкі «наесці» лішніх кілаграмаў?

— Перш за ўсё я б параіла правесці свята з радасцю, бо ў любым сацыяльным захворванні ёсць яшчэ такі фактар рызыкі як стрэс. А свята — гэта радасць у жыцці, самая магутная антыстрэсавая праграма. Каб не «наесці» лішніх кілаграмаў, пабольш налягайце на гародніну і стравы з яе.

Наступіў год Белага Ката. А гэтая жывёліна любіць рыбку. Таму рыбныя стравы — калі ласка на стол, яны не такія тлустыя, як мяса. Даспадобы пушысціку і малако. З нятлустых малочных прадуктаў таксама можна прыгатаваць ласункі. Можна зрабіць смачны, прыгожы і карысны стол.

Вольга ШАЎКО.

Карысна ведаць

ГУМАВЫ ПРЫСМАК

«Свежее дыхание облегчает понимание», — памятаеце такі выраз? Дабіцца свежага дыхання нам прапануюць з дапамогай жавальнай гумкі. І праўда, варта пажаваць гумку, і здаецца, твой рот сам па сабе напаўняецца водарам мяты і фруктаў і з гэтага часу будзе такім заўсёды. Аднак не — цудаў не бывае: асвяжыць дыханне гумкай можна літаральна на 5—10 хвілін. Дык навошта яна нам? У чым яе сапраўдная карысць?

КАРЫСЦЬ

Асноўная карысць жавальных гумак у тым, што яны сапраўды крыху асвяжаюць поласць рота — за кошт наступных уздзеянняў:

- павялічваецца хуткасць і аб'ём слінавыдзялення (у 3 разы больш, чым звычайна);
- сліна, якая выдзяляецца, здольная нейтралізаваць кіслату, што выпрацоўваюць бактэрыі зубнога налёту;
- жаванне садзейнічае абмыванню слінай цяжкадаступных участкаў поласці рота;
- гумкі з ксілітам, фторам і карбамідам здольныя ў некаторай ступені зніжаць рызыку развіцця карыесу.

Усё гэта ў цэлым садзейнічае выдаленню рэшткаў ежы, а значыць, зніжае рызыку з'яўлення непрыемнага паху з рота (вызначана, што галітоз — на 80% вынік дрэннай гігіены поласці рота).

- Яшчэ адной вартасцю жавальнай гумкі з'яўляецца тое, што яна прымушае трэніравацца нашы «недапрацаваўшыя» сківіцы: мы ж прывыклі есці ёгурты, катлеты, кашы і іншыя стравы, якія не патрабуюць разжоўвання, а сківіцы, між іншым, «былі задуманы», каб разгрызаць цвёрдыя прадукты.

ШКОДА

Што ж шкоднага ў тым, калі мы пажуём гумку гадзінку—другую ў дзень?

- Жаванне «ўхаластую» знясільвае страўнік, вымушаючы яго выпрацоўваць страўнікавы сок упустую, а ён раздражняе слізістую абалонку, выклікаючы гастрыт і язву страўніка.
- Асабліва пругкія гумкі могуць разбурыць зубныя каронкі, масты і пломбы.
- Хімічныя араматызатары, кансерванты і іншыя дабаўкі часта выклікаюць алергію, а таксама захворванні ўнутраных органаў.
- З эстэтычнага пункту гледжання, чалавек, які пастаянна жуе, выглядае не вельмі прыемна.
- І, нарэшце, наконт адной з вартасцяў жвачкі як «асвяжальніка дыхання»: яна прыдатная толькі для нязначнага асвяжэння рота, бо кардынальна бактэрыі могуць быць выдалены з рота толькі з дапамогай антысептыка і ніяк інакш.
- Штодзень наносіцца шкода навакольнаму асяроддзю ў выглядзе мільёнаў выкарыстаных гумак на сценах дамоў, лаўках і пад нагамі.

ЯК СУМЯСЦІЦЬ ПРЫЕМНАЕ З КАРЫСНЫМ

- Галоўнае — адмовіцца ад гумкі як ад свайго пастаяннага дзённага спадарожніка.
- Жаваць гумку толькі пасля прыёму ежы, на поўны страўнік, і толькі для таго, каб устараніць з рота прысмак нядаўняга абеду. Жаваць рэкамендуецца не больш як 5—10 хвілін.
- Пажадана ўжываць жвачку без цукру, з утрыманнем заменнікаў цукру.

Падрыхтавала Вольга КУЛІНКОВІЧ.

ДАРЭЧЫ

На думку некаторых амерыканскіх даследчыкаў, гумка выклікае псіхалагічную залежнасць, нягледзячы на адсутнасць у ёй наркатычных рэчываў. Манатоннае жаванне ўводзіць чалавека ў нейкае падабенства «трансу». Ён засяроджаны не на праблемах знешняга свету, а на перажоўванні смачнай «бясконцай» гумкі. Менавіта па гэтых жа прычынах пастаяннае жаванне прытупляе ўвагу і нават крыху аслабляе працэс мыслення. Але гэта, безумоўна, датычыцца «маніякальнага» кругласутачнага жавання.

Першая дапамога

Інсульт: лік ідзе на хвіліны!

Інсульт — небяспечнае і, як гэта ні сумна, вельмі распаўсюджанае захворванне. Інсульт — частая прычына інваліднасці і смерці. З тых, хто перанёс інсульт, толькі кожны пяты можа вярнуцца да нармальнага жыцця і працы і амаль палова пацыентаў памірае ў першы год пасля захворвання.

Адна з непрыемных і небяспечных асаблівасцяў інсульту ў тым, што ў самым пачатку захворванне можа не мець ярка выражаных сімптомаў. (Тут трэба адзначыць, што існуюць дзве разнавіднасці немачы: інсульт гемарагічны і інсульт ішэмічны. Самастойна разабрацца ў тым, з якой менавіта формай інсульту давялося сустрэцца, цяжка. Ды і не трэба — на гэта ёсць спецыялісты.) Першыя этапы інсульту (а гэта не хвіліны, а гадзіны і нават суткі) часта праходзяць без болевых адчуванняў. Можа здранцвець рука або шчака, злёгку змяніцца мова, часам з'яўляецца галавакружэнне. Але такія сімптомы мала каго ўстрывожаць настолькі, каб выклікаць «хуткую». У выніку ўпускаецца каштоўны час, а потым спецыялістам значна цяжэй актыўна (а галоўнае, эфектыўна) умяшацца ў працэс хваробы.

Інсульт — гэта менавіта працэс, ад нязначных функцыянальных змен да неабарачальнага пашкоджання мозга. *З пачатку развіцця хваробы ў медыкаў ёсць толькі некалькі гадзін, калі адэкватная тэрапія можа зменшыць памеры паражэння і палепшыць выхад захворвання. Большасць медыкаў абмяжоўваюць рамкі такога «акна тэрапеўтычных магчымасцяў» усяго ТРЫМА гадзінамі.* Менавіта ў гэтыя тры гадзіны трэба паспець зрабіць усё магчымае, каб хворы апынуўся ў ліку тых шчасліўчыкаў, хто змог перажыць інсульт з мінімальнымі наступствамі.

Як жа не ўпусціць моманты, якія могуць каштаваць жыцця?

Па-першае, трэба пастарацца аб'ектыўна ацаніць стан хворага: ці ёсць асіметрыя твару (здранцвенне аднаго боку), ці прыкметныя якія-небудзь парушэнні мовы або адчуванне слабасці ў адной руцэ. Пры наяўнасці гэтых сімптомаў трэба тэрмінова тэлефанаваць у «хуткую дапамогу».

Па-другое, да прыезду медыкаў неабходна забяспечыць хвораму правільны догляд: пакласці на спіну, пад галаву — маленькую падушку, пры гэтым шыя не павінна згінацца, каб не пагоршыць крываток па пазваночных артэрыях. Адчыніце акно, каб паступала свежае паветра, пераканайцеся ў праходнасці дыхальных шляхоў (гэта асабліва важна, калі хворы без прытомнасці). Абавязкова дастаньце з рота (калі ёсць) здымныя зубныя пратэзы. Вымерайце хвораму ціск. Калі ён павышаны — дайце гіпатэнзіўныя прэпараты, якімі чалавек звычайна карыстаўся.

Па-трэцяе, выход захворвання шмат у чым залежыць ад першай дапамогі, якую акажуць хвораму. Таму па прыездзе ў бальніцу настойвайце на правядзенні ўсіх неабходных прафілактычных працэдур і больш хуткага прызначэння пярвічнага лячэння.

І яшчэ адна важная парада для тых, чые блізкія патрапілі ў бяду — перажылі інсульт. Не ўпадайце ў паніку! Ваш пазітыўны настрой і вера ў лепшае стануць асновай эмацыйнай і духоўнай падтрымкі, такой неабходнай хвораму.

Падрыхтавала Вольга КУЛІНКОВІЧ.

ТРЫ АСНОЎНЫЯ ПРЫЁМЫ РАСПАЗНАВАННЯ ІНСУЛЬТУ НА МЕСЦЫ, ТАК ЗВАНЫЯ «УЗП»

Папрасіце пацярпелага:

У *— усміхнуцца. Пры інсульце ўсмешка можа быць крывая (вугалок вуснаў з аднаго боку накіраваны ўніз, а не ўверх).*

З *— загаварыць. Вымавіць просты сказ, напрыклад: «За акном свеціць сонца». Пры інсульце часта (але не заўсёды!) назіраецца парушэнне вымаўлення (ці неразуменне маўлення).*

П *— падняць абедзве рукі. Калі рукі падымаюцца не адналкава — гэта можа быць прыкметай інсульту.*

Для душы

Маўчанне Анёла

НЕАРДЫНАРНЫМ, адметным у прафесійнай дзейнасці асобам бывае цеснавата ў рамках абранай некалі спецыяльнасці. І яны знаходзяць для сябе іншыя заняткі, у якіх таксама дасягаюць вышынь. Вядома, напрыклад, што многія ўрачы пісалі і пішуць вершы, прозу, музыку, захапляюцца рыбалоўствам і паляваннем, становяцца калекцыянерамі...

Фота Марыжыліноскай.

Некалькі гадоў таму журналісцкі лёс звёў мяне з рэнтгенэндаваскулярным хірургам Рэспубліканскага навукова-практычнага цэнтра «Кардыялогія» Юрыем Пятровым, які стаяў ля вытокаў правядзення ў Беларусі ўнікальных аперацый на сасудах. Падчас той сустрэчы Юрый Пятровіч спрабаваў растлумачыць у межах інтэрв'ю нашай газеце, дзякуючы чаму сасуды становяцца «закрытымі», чым гэта пагражае і з дапамогай якіх сучасных прыстасаванняў можна аднавіць нармальны ток крыві, а значыць, працягнуць чалавеку паўнавартаснае жыццё. У цяперашнюю сустрэчу мне выпаў гонар даведацца, чым дыхае хірург па-за сценамі аперацыйнай.

Юрый Пятроў нарадзіўся ў 1953 годзе ў падмаскоўным стараверскім пасёлку Іонава. Адасоблены рэлігійны свет — свет сямейных абразоў і спецыяльных абрадаў — зрабіў на светапогляд будучага хірурга велізарны ўплыў.

— Менавіта ў Падмаскоўі захоўвалася на той момант найбольшая колькасць стараверскіх пасяленняў, — расказвае Юрый Пятровіч. — Старавераміе былі мае дзед, бабка і бацька. У нас не было царквы. Толькі малельны дом ды стараста Яўсей... Людзі хадзілі ў гэты дом, маліліся паводле сваіх абрадаў, заведзеных яшчэ да 1400 года. У малельным доме мяне і хрысцілі. Як вядома, у 50-я гады мінулага стагоддзя вера не працвітала, цэрквы няшчадна вынішчаліся. Тым не менш у нас любы дом быў не проста жыллём, а іканастасам, з іконамі ў кожным пакоі. Для кожнай сям'і пісаліся асобныя іконы, некаторыя з іх па некалькі разоў перапісвалі пад канкрэтных людзей. Галоўным святым стараверaў быў Мікола Угоднік, яго лік і малявалі ў цэнтры іконы, а вакол размяшчалі святых членаў сям'і. Дзве іконы з бацькоўскага дома перайшлі да мяне ў спадчыну...

Добра памятаю, як зрабіў нешта шкоднае і Мікола Угоднік пагразіў мне пальцам. Мне не падалося — так і было... Мяне вучылі таму, што нельга рабіць дрэннае, бо Мікола ўсё бачыць і, калі што, пакарае. Заўсёды, калі я адчуваў сваю віну, баяўся нават вочы на ікону падняць...

У 17 гадоў Юрый пакінуў бацькоўскі дом. На той момант адна яго сястра жыла ва Украіне, другая — у Беларусі. Тая, што апынулася ў Беларусі, сказала: прыязджай, тут самыя прыгожыя дзяўчаты.

Юрый скончыў Мінскі медінстытут. Так, нягледзячы на моцна развіты духоўны пачатак, ён прысвяціў сябе медыцыне: ратаваць людзей можна, вядома, па-рознаму. У рэшце рэшт Пятрову ўдалося ўкараніць шэраг метадык дыягностыкі і лячэння пацыентаў з сардэчна-сасудзістай паталогіяй.

— Я ніколі не імкнуўся рабіць нешта з высокай доляй рызыкі толькі дзеля таго, каб праславіць першым, — кажа Юрый Пятровіч. — На маю думку, рызыка ў хірургіі недапушчальная. З аднаго боку, я стаяў ля вытокаў унікальных аперацый, а з другога — унікальнымі яны былі менавіта для Беларусі. Так што ўсё адносна. У маім выпадку важна, не які па ліку, а наколькі якасна ты зрабіў сваю справу.

У маім аддзяленні працуе шэсць выдатных спецыялістаў, хірургаў, здольных працаваць у любой еўрапейскай клініцы. Яны не могуць памыліцца, выканаць сваю работу дрэнна. Іншая справа, кожны з іх цудоўна ўсведамляе: ёсць пэўны метад аказання дапамогі, і ён патрабуе адпаведнай апаратуры, належнага тэхнічнага аснашчэння, інструментарыя і, нарэшце, рук хірурга. Калі нечага з пералічанага няма, значыць, аперацыя рызыкуе ператварыцца ў авантуру...

Жыццё звяло доктара з многімі славутымі беларускімі мастакамі, аднак, нягледзячы на інтуітыўную цягу да выяўленчага мастацтва з маладых гадоў, Юрый Пятровіч доўгі час не рашаўся ўзяцца за пэндзаль. Гэта здарылася толькі ў 50 гадоў, у спелым узросце, калі і сабе, і іншым даказаў, што невыпадкова прыйшоў на гэтую зямлю.

Творчасць Пятрова не звязаная з рэальнымі вобразамі і падзеямі. Цялеснае застаецца ў прафесійнай дзейнасці. Карціны ж з'яўляюцца праваднікамі простай хрысціянскай ісціны: усё рэальнае жыве, пакуль натхняецца і напаўняецца духоўным, нябачным і неадчувальным. Каля сарака жывапісных работ — гэта выявы, галоўным чынам, анёлаў-ахоўнікаў.

Шэраг анёлаў былі напісаныя ў падарунак канкрэтным людзям, якім ён дапамог ці якія пакінулі ў яго жыцці значны след. Хірург-мастак верыць, што яго работы дапамогуць кожнаму, хто на іх глядзіць, усвядоміць прысутнасць свайго анёла, паразважаць, аб чым той можа маўчаць...

«Галоўнае ў анёла — вочы, — тлумачыць Юрый Пятровіч. — Вочы, якія ніколі не глядзяць ва ўпор. Позірк можа выдаваць ацэнку... У духоўным жа свеце галоўнае — маўчанне. Анёлу не трэба размаўляць з намі, ён і так усё цудоўна ведае і разумее. Важная сама місія — ахоўваць і бараніць ад бед. Ад чалавека ж патрабуецца не страціць здольнасць чуць анёльскае маўчанне».

Святлана БАРЫСЕНКА.

Минский районный исполнительный комитет *11 февраля 2011 года* проводит открытый *аукцион* на право заключения договоров аренды земельных участков в Минском районе

		Лот 1	Лот 2	Лот 3	Лот 4	Лот 5
1	Адрес земельного участка	Минский район, Горанский с/с, район д. Аксаковщина	Минский район, Горанский с/с, д. Новоселье	Минский район, Горанский с/с, д. Капличи	Минский район, Ждановичский с/с п. Ратомка	Минский район, Колодищанский с/с, п. Колодищи
2	Кадастровый номер	623681300001000359	623681315601000472	623681308601000036	623681708601002213	623683403101006744
3	Площадь земельного участка	0,0030 га	0,0073 га	0,7198 га	0,8501 га	0,0350 га
4	Срок аренды (лет)	30	30	50	40	51
5	Целевое назначение	Для установки павильона для торговли и обслуживания населения	Для установки торгового павильона	Для строительства торгового центра с офисными помещениями	Для строительства физкультурно-оздоровительного комплекса	Для строительства пиццерии-магазина
6	Сумма убытков и потерь с/х, л/х производства (рублей)	26 540	65 000	–	–	75 600
7	Расходы по подготовке документации (рублей)	1 861 277	1 566 458	2 139 391	2 151 045	682 950
8	Начальная цена права заключения договора аренды	21 доллар США	123 доллара США	11 784 доллара США	33 676,20 доллара США	3 738 долларов США
9	Задаток (рублей)	5 000	30 000	3 000 000	10 000 000	1 000 000

		Лот 6	Лот 7	Лот 8	Лот 9	Лот 10	Лот 11
1	Адрес земельного участка	Минский район, Крупицкий с/с, д. Дубицкая Слобода	Минский район, Лошанский с/с, д. Бровки	Минский район, Мачулищанский п/с, г.п. Мачулищи	Минский район, Сеницкий с/с, а/г Сеница	Минский район, Сеницкий с/с, д. Урожайная	Минский район, Сеницкий с/с, д. Урожайная
2	Кадастровый номер	623683903601000064	623684000001000080	623655500001000303	623686605101000936	623686600001000219	623686600001000220
3	Площадь земельного участка	0,0386 га	0,0300 га	0,5004 га	0,0039 га	0,3994 га	1,6808 га
4	Срок аренды (лет)	51	50	51	40	71	71
5	Целевое назначение	Для размещения объекта торговли товарами народного потребления	Для строительства магазина	Для строительства производственно-складских и технических сооружений для производства изделий медицинского назначения	Для установки торгового павильона	Для строительства оздоровительного центра с административным зданием	Для строительства гостиницы на 100 мест с рестораном на 150 мест
6	Сумма убытков и потерь с/х производства (рублей)	630 300	–	8 487 405	–	–	–
7	Расходы по подготовке документации (рублей)	2 156 134	565 182	1 827 820	1 604 935	1 050 643	833 751
8	Начальная цена права заключения договора аренды	516 долларов США	755 долларов США	35 851,36 доллара США	490 долларов США	102 141 296 белорусских рублей	429 842 445 белорусских рублей
9	Задаток (рублей)	140 000	200 000	10 000 000	140 000	10 000 000	40 000 000

Аукцион состоится по адресу: г. Минск, ул. Ольшевского, д. 8. Дата проведения: 11.02.2011 г. в 9.00. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по адресу: г. Минск, ул. Ольшевского, д. 8, к. 416. Окончание приема заявлений и документов – 07.02.2011 г. Контактный телефон: 204 11 62.

Задаток перечисляется на расчетный счет № 3641000233719, отделение № 537, г. Минск, ОАО «Белинвестбанк», МФО 153001739, УНП 600068187, получатель – Минский районный исполнительный комитет.

К участию в аукционе допускаются лица, подавшие в комиссию в указанные сроки соответствующее заявление с приложением необходимых документов и внесшие в установленном порядке на указанный в объявлении расчетный счет задаток.

Победитель аукциона обязан в течение 10 (десяти) рабочих дней со дня принятия решения о предоставлении ему земельного участка внести плату за право заключения договора аренды земельного участка, возместить потери сельскохозяйственного производства, вызванные изъятием сельскохозяйственных земель для использования в целях, не связанных с ведением сельского хозяйства, и расходы, оговоренные в условиях проведения аукциона. Договор аренды земельного участка заключается с победителем в течение 2-х рабочих дней после внесения им всех причитающихся платежей.

Все желающие могут ознакомиться с документацией и земельными участками.

Аукцион признается несостоявшимся в случаях, если: заявление об участии в аукционе подано менее чем двумя участниками; ни один из участников аукциона после трехкратного объявления первой объявленной цены не поднял аукционный номер; ни один из участников аукциона в соответствии с решением комиссии не был признан победителем.

Документы, необходимые для участия в аукционе на право заключения договоров аренды земельных участков:

1. Заявление на участие в аукционе с указанием кадастровых номеров и адресов земельных участков.

2. Заверенные банком копии платежных поручений о внесении задатка на расчетный счет.

Кроме того, в комиссию представляются:

• гражданином – копия документа, содержащего его идентификационные сведения без нотариального засвидетельствования;

• индивидуальным предпринимателем – копия свидетельства о государственной регистрации индивидуального предпринимателя без нотариального засвидетельствования;

• представителем гражданина или индивидуального предпринимателя – нотариально удостоверенная доверенность;

• представителем или уполномоченным должностным лицом юридического лица Республики Беларусь – доверенность, выданная юридическим лицом, или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, копии устава и свидетельства о государственной регистрации юридического лица без нотариального засвидетельствования, документ с указанием банковских реквизитов юридического лица;

• представителем или уполномоченным должностным лицом иностранного юридического лица – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть произведена в течение года до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык, легализованные в установленном порядке доверенность или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык;

• представителем иностранного гражданина – легализованная в установленном порядке доверенность, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык.

При подаче документов на участие в аукционе граждане, представители граждан, индивидуальных предпринимателей и юридических лиц, уполномоченные должностные лица юридических лиц предъявляют документ, удостоверяющий личность.

алімпіец

ЗВЯЗДА

ВЫПУСК № 1 (10)

Сумесны праект газеты «Звязда», Нацыянальнага алімпійскага камітэта Рэспублікі Беларусь і Міністэрства спорту і турызму Рэспублікі Беларусь

„БЕЗ МАСАВАГА СПОРТУ МЫ НЕ ВЫХАВАЕМ АЛІМПІЙСКІХ ЧЭМПІЁНАЎ. МЫ АБАВЯЗАНЫ ГАДАВАЦЬ СВАІХ СПАРТСМЕНАЎ І ПРАДСТАЎЛЯЦЬ СВАЮ КРАІНУ Ў СВЕЦЕ. А ПОТЫМ ВЫДАТКАВАНЫЯ НА ІХ ПАДРЫХТОЎКУ ГРОШЫ ВЕРНУЦЦА ІНТАРЭСАМ БАЛЕЛЬШЧЫКАЎ"

„УЛІЧВАЮЧЫ ЎВАГУ І ПАДТРЫМКУ ПРЭЗІДЭНТА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ, ШТО АКАЗВАЕЦЦА АЙЧЫННАМУ СПОРТУ, НЕАБХОДНА ЯШЧЭ БОЛЬШ АБ'ЯДНАЦЬ НАМАГАННІ НАКА, МІНСПОРТУ, АБЛВЫКАНКАМАЎ, МІНСКАГА ГАРВЫКАНКАМА, ФЕДЭРАЦЫЙ ПА ВІДАХ СПОРТУ НА ПАДРЫХТОЎКУ ДА АЛІМПІЯДЫ Ў ЛОНДАНЕ БЕЛАРУСКІХ СПАРТСМЕНАЎ..."

Юбіляру — творчых поспехаў

Фота Пятра РАБУХІНА.

Учора ў Нацыянальным алімпійскім камітэце Беларусі адбыліся ўрачыстыя мерапрыемствы з нагоды знамянальнай даты віцэ-прэзідэнта НАКа Сяргея ЦЯЦЕРЫНА — 50-годдзя з дня нараджэння.

Юбіляру самыя цёплыя словы зычылі шматлікія госці, сярод якіх і памошнік старшыні Прэзідэнскага спартыўнага клуба Ксенія ГОЛУБ (на фота). Мы таксама далучаемся да іх і жадаем Сяргею Сямёнавічу моцнага здароўя і новых творчых поспехаў.

Якім для нас быў год мінулы?

Год прайшоў пад знакам XXI зімовых Алімпійскіх гульняў у Ванкуверы, дзе фрыстайліст Аляксей Грышын першым з беларускіх спартсменаў-зімнікаў узняўся на вышэйшую прыступку п'едэстала гонару.

Парадавалі на галоўных стартах чатырохгоддзя біятланісты — Сяргей Новікаў і Дар'я Домрачава, якія заваявалі адпаведна «серабро» і «бронзу».

Рэгулярна вызначаліся суайчыннікі і на іншых прэстыжных спаборніцтвах. У 2010 годзе на Алімпійскіх гульнях, чэмпіянатах, Кубках, першынствах свету і Еўропы імі ўжо здабыты 514 медалёў (149 залатых, 144 сярэбраныя і 191 бронзавы). Дарэчы, за 2009 год агульнанацыянальная скарбонка налічвала 527 медалёў (167-166-194).

Фота Уладзіміра ЗДАНОВІЧА.

Фота Уладзіміра ЗДАНОВІЧА.

Беларусы ў 2010 годзе часцей вызначаліся ў найбольш прэстыжных алімпійскіх відах спорту, у якіх 220 разоў узнімаліся на п'едэстал гонару: (60-76-84). У мінулым годзе было 208 (66-65-77) узнагарод.

На летніх чэмпіянатах свету ў алімпійскіх дысцыплінах заваявана 14 медалёў (1-6-7). Гэта 12-ы вынік у свеце.

Фота Уладзіміра ЗДАНОВІЧА.

Навіны дня

З 5 па 9 студзеня ў нямецкім Оберхофе праходзіў этап Кубка свету па біятлоне. У эстафеце 4х7.5 км сярод мужчын беларуская каманда ў выніковым пратаколе заняла восьмы радок (адставанне ад лідараў склала +3.09). У спрынце на 10 км лепшым сярод беларусаў стаў Уладзімір Алянішка, які фінішаваў 50-м. Яўгеній Абраменка прыйшоў да фінішу 60-м, Уладзімір Чапелін — 64-м, Сяргей Новікаў размясціўся на 83-м радку. У агульным заліку Кубка свету Яўген Аўраменка займае 45 месца, Сяргей Новікаў — 71-е. У Кубку нацый у мужчынскай зборнай Беларусі — 13 месца.

А вось жаночая каманда Беларусі ў Кубку нацый размясцілася на 7-й пазіцыі. У эстафеце 4х6 км на фінішы беларускі замкнулі тройку прызёраў. У спрынце 7,5 км лепшай з беларусак стала Дар'я Домрачава — чацвёрты вынік (+0.35). У гонцы з масавым стартам 12,5 км Дар'я Домрачава стала 15-й, Людміла Калінчык — 26-й.

У агульным заліку Кубка свету Дар'я Домрачава займае 5-е месца, Надзея Скардзіна — 32-е, Людміла Калінчык — 37-е, Наталля Пісарава — на 72-й прыступцы, Вольга Назарава — на 76-м радку.

❍

На адборачным турніры на чэмпіянаце Еўропы па валейболе юнацкая каманда Беларусі (U-19), паказаўшы пяты вынік, не здолела выйсці ў фінальны турнір. Мацнейшымі за беларусаў былі каманды з Балгарыі, Славеніі, Харватыі і Іспаніі.

Вынік дзявочай каманды (U-18) таксама не парадаваў. Абыграўшы зборную Даніі, беларускі ўступілі зборным Украіны, Славеніі і Венгрыі. У выніковай табліцы беларускі — на чацвёртым радку.

❍

9 студзеня ў шведскім Эскільстуна завяршыўся адборачны турнір чэмпіянату свету па гандболе, у якім прымалі ўдзел беларускія юніёры (U-21). Камандзе Беларусі не ўдалося прабіцца ў фінальны турнір. Абыграўшы каманду Аўстрыі (30:18), нашы саступілі камандам са Швецыі (29:38) і Харватыі (27:33).

❍

На Міжнародных спаборніцтвах па гандболе ў г. Мурсія (Іспанія) мужчынская зборная Беларусі заняла другую прыступку. Прайграўшы іспанцам (18:39), беларусы выйгралі ў чарнагорцаў (32:27) і згулялі ўнічыю з егіпцянамі (28:28).

❍

На чэмпіянаце Еўропы па хуткасным бегу на каньках у італьянскім Калальба беларускія спартсмены прадэманстравалі аднолькавы вынік. У спаборніцтвах прымалі ўдзел два канькабежцы з Беларусі — Уладзімір Міхайлаў і Таццяна Міхайлава. У выніковай табліцы як у мужчын, так і ў жанчын, беларускія канькабежцы замкнулі дваццатку лепшых.

Фота Уладзіміра ЗДАНОВІЧА.

НАСУСТРАЧ АЛІМПІЙСКІМ ГУЛЬНЯМ 2012

Новы 2011 год, які наступіў, з'яўляецца перадалімпійскім. Гэта кропка, ад якой беларускія спартсмены, якія маюць перспектывы паспяховага выступлення на галоўных стартах чатырохгоддзя, павінны адштурхнуцца, каб да пачатку Алімпійскіх гульняў у Лондане не толькі заваяваць адпаведную колькасць ліцэнзій, але і быць рэальнымі прэтэндэнтамі на ўзнагароды.

Менавіта аб гэтым вядуць гутарку паміж сабой першы віцэ-прэзідэнт Нацыянальнага алімпійскага камітэта Беларусі, памочнік Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па пытаннях фізічнай культуры, спорту і развіцці турызму Ігар Заічкоў (на фота справа) і міністр спорту і турызму Беларусі Алег Качан.

КАМПЕТЭНТНА

1. Да пачатку Алімпійскіх гульняў застаецца 563 дні, за спінамі атлетаў засталіся 875 дзён падрыхтоўкі, якая здзяйснялася ў адпаведнасці з Праграмай, зацверджанай урадам Рэспублікі Беларусь, а таксама даручэннямі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь Аляксандра Лукашэнкі, дадзенымі на Алімпійскім сходзе 9 красавіка 2010 года.

2. Новы 2011 год будзе накіраваны на завяванне ліцэнзій і мадэліраванне стартаў у Лондане, у тым ліку і на самых алімпійскіх аб'ектах. Пры гэтым не ставячы мэтай праверку часовай і кліматычнай адаптацыі. Галоўнае — праверыць сілы ў тых умовах, у якіх пройдзе Алімпіяда-2012.

3. Сёння нацыянальныя каманды здзяйсняюць падрыхтоўку для заваявання права выступіць на Алімпійскіх гульнях у 150 дысцыплінах 31 віду спорту, што складае роўна палову спаборніцтваў у Лондане (302 дысцыпліны). Такім чынам Беларусь значна перакрые паказчыкі, што былі на папярэдняй Алімпіядзе ў Пекіне (112 дысцыплін у 26 відах спорту).

4. Зараз праводзяцца паглыбленыя комплекснае і медыцынскае абследаванні спартсменаў-кандыдатаў. Гэтая работа забяспечваецца НДІ фізічнай культуры і спорту, Рэспубліканскім цэнтрам спартыўнай медыцыны, а таксама, пры неабходнасці, і спецыялізаванымі інстытутамі Нацыянальнай акадэміі навук, клінікамі аховы здароўя. Каардынацыю работы здзяйсняе экспертны савет дырэктара нацыянальных каманд.

5. Улічваючы ўвагу і падтрымку Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, што аказваецца айчыннаму спорту, неабходна яшчэ больш аб'яднаць намаганні НАКа, Мінспорту, аблвыканкамаў, Мінскага гарвыканкама, федэрацый па відах спорту на падрыхтоўку да Алімпіяды ў Лондане беларускіх спартсменаў... Гэта дазволіць забяспечыць заваяванне на Гульнях XXX Алімпіяды-2012 у Лондане 25 медалёў, у тым ліку 5 залатых.

ЛЕПШЫМ З ЛЕПШЫХ — ГОНАР І СЛАВА

У нашай краіне ўжо даўно стала добрай традыцыяй ушанаванне айчынных спартсменаў, якія зрабілі важкі ўклад у развіццё алімпійскага руху і дабіліся значных перамог на топ-турнірах.

Адна з важнейшых акцый у такім напрамку — «Трыумф. Героям спорту». Гэта сумесны маштабны праект рэспубліканскага дзяржаўна-грамадскага аб'яднання «Прэзідэнцкі спартыўны клуб», Нацыянальнай дзяржаўнай тэлерадыёкампаніі Рэспублікі Беларусь, Міністэрства спорту і турызму Рэспублікі Беларусь і Нацыянальнага алімпійскага камітэта.

Паводле ўмоў арганізатараў адкрыты публічны конкурс праводзіцца ў гады летніх і зімовых Алімпійскіх гульняў з мэтай вызначэння (з улікам меркаванняў беларускіх аматараў спорту) спартсменаў, якія дабіліся найбольш значных вынікаў на буйных міжнародных спаборніцтвах, і іх урачыстага ўзнагароджвання.

Сёння арганізатары праекта вядуць актыўную падрыхтоўку да правядзення адкрытага публічнага конкурсу «Трыумф. Героям спорту 2010». Плануецца, што галасаванне балельшчыкаў у намінацыях «Спартсмен года», «Каманда года» і «Трэнер года» пройдзе з 10 студзеня па 31 студзеня 2011 года. Пераможцаў у гэтых намінацыях (з улікам вынікаў галасавання) журы конкурсу вызначыць да 11 лютага. Да 10 лютага таксама будуць вызначаны пераможцы ў намінацыях «Прарыў года», «Вынік года», «Самы яркі спартыўны момант года» і «За волю да перамогі».

Урачыстая цырымонія ўзнагароджвання лаўрэатаў конкурсу адбудзецца ў канцы лютага. Дакладная дата будзе вызначана арганізацыйным камітэтам пазней.

Па традыцыі ў дзень правядзення цырымоніі адбудзецца яе тэлевізійная трансляцыя на Першым канале.

Публічны конкурс «Трыумф. Героям спорту 2010»

Бюлетэнь для папярэдняга галасавання

Паважаны ўдзельнік папярэдняга галасавання!

Вам неабходна паставіць адзнаку (любы знак) у пустым квадраце, размешчаным побач з найменнем таго прэтэндэнта на званне лаўрэата конкурсу, за якога Вы галасуеце. Бюлетэні, у якіх адсутнічаюць адзнакі, а таксама бюлетэні, у якіх адзнакі прастаўлены ў двух і больш прэтэндэнтаў у адной намінацыі, прызнаюцца несапраўднымі і пры падліку галасоў не ўлічваюцца.

КАМАНДА ГОДА

Лаўрэатам конкурсу ў намінацыі «Каманда года» прызнаецца каманда спартсменаў (спартсменак), якія выступаюць у гульнявых камандных відах спорту, камандных дысцыплінах (эстафета, экіпаж, група, дуэт, пара і г.д.), якая дабілася ў 2010 годзе, па меркаванні журы і ўдзельнікаў папярэдняга галасавання, найбольш высокіх вынікаў на буйных міжнародных спартыўных спаборніцтвах.

Намінанты	Кароткае апісанне	Выбар
Зборная каманда Рэспублікі Беларусь па баскетболе (жан.)	4-е месца на чэмпіянаце свету па баскетболе	
Моладзевая зборная каманда Рэспублікі Беларусь па футболе	выхад у фінальную частку чэмпіянату Еўропы па футболе сярод моладзевых каманд	
Экіпаж каноэ-двойкі (муж.)	сярэбраны прызёр чэмпіянату свету 2010 года па веславанні на байдарках і каноэ (С2, 1000 м)	
Каманда Рэспублікі Беларусь па гімнастыцы мастацкай у групавых практыкаваннях	сярэбраны прызёр чэмпіянату свету 2010 года па гімнастыцы мастацкай (групавыя практыкаванні)	
Ганд. клуб «Дынама-Мінск»	чэмпіён РБ 2010 года, удзельнік групавога раўнду Лігі чэмпіёнаў	
Экіпаж мужчынскай байдаркі-чацвёркі	сярэбраны прызёр чэмпіянату свету 2010 года па веславанні на байдарках і каноэ (К4, 1000 м)	
Футбольны клуб БАТЭ (г. Барысаў)	чэмпіён РБ 2010 года, выхад у плэй-оф Лігі Еўропы УЕФА сезона 2010—2011 гадоў (па стане на 20 снежня 2010 г.)	
Зборная каманда РБ па тэнісе настольным (мужчыны)	сярэбраны прызёр чэмпіянату Еўропы 2010 года па тэнісе настольным (камандная першынство)	

СПАРТСМЕН ГОДА

Лаўрэатам конкурсу ў намінацыі «Спартсмен года» прызнаецца спартсмен, які дабіўся ў 2010 годзе, па меркаванні журы і ўдзельнікаў папярэдняга галасавання, найбольш высокіх вынікаў на буйных міжнародных спаборніцтвах.

Намінанты	Кароткае апісанне	Выбар
Сяргей Новікаў	сярэбраны прызёр зімовых Алімпійскіх гульняў 2010 года па біятлоне (індывідуальная гонка)	
Сяргей Мартынаў	чэмпіён свету 2010 года па кулявой стральбе, пераможца фіналу Кубка свету 2010 года (практыкаванне МВ-9)	
Андрэй Міхневіч	чэмпіён Еўропы 2010 года па лёгкай атлетыцы (штурханне ядра)	
Цімафей Дзейнічэнка	сярэбраны прызёр чэмпіянату свету 2010 года па барацьбе грэка-рымскай, сярэбраны прызёр чэмпіянату Еўропы 2010 года	
Аляксей Грышын	чэмпіён зімовых Алімпійскіх гульняў 2010 года па фрыстайле (лыжная акрабатыка)	
Алег Юрэня	бронзавы прызёр чэмпіянату свету 2010 года па веславанні на байдарках і каноэ, сярэбраны прызёр чэмпіянату Еўропы 2010 года (К1, 1000 м)	
Антон Кушнір	пераможца агульнага заліку Кубка свету 2010 года па фрыстайле (лыжная акрабатыка)	
Дзмітрый Каспяровіч	бронзавы прызёр чэмпіянату свету 2010 года па гімнастыцы спартыўнай (апорны скачок)	

СПАРТСМЕНКА ГОДА

Лаўрэатам конкурсу ў намінацыі «Спартсменка года» прызнаецца спартсменка, якая дабілася ў 2010 годзе, па меркаванні журы і ўдзельнікаў папярэдняга галасавання, найбольш высокіх вынікаў на буйных міжнародных спаборніцтвах.

Намінанты	Кароткае апісанне	Выбар
Дар'я Домрачава	бронзавы прызёр зімовых Алімпійскіх гульняў 2010 года па біятлоне (індывідуальная гонка)	
Аляксандра Герасіменя	чэмпіёнка Еўропы 2010 года па плаванні (50 м на спіне), сярэбраны прызёр чэмпіянату Еўропы 2010 года (100 м вольным стылем)	
Анастасія Новікава	сярэбраны прызёр чэмпіянату свету 2010 года па цяжкай атлетыцы, чэмпіёнка Еўропы 2010 года	
Кацярына Карстэн	сярэбраны прызёр чэмпіянату свету 2010 года па веславанні акадэмічным, чэмпіёнка Еўропы 2010 года (W1X)	
Меліціна Станюта	бронзавы прызёр чэмпіянату свету 2010 года па гімнастыцы мастацкай (мнагабор'е), сярэбраны прызёр ЧС (камандная першынство)	
Надзея Астапчук	чэмпіёнка Еўропы 2010 года па лёгкай атлетыцы, пераможца агульнага заліку Брыльянтавай лігі (штурханне ядра)	
Вікторыя Паўловіч	чэмпіёнка Еўропы 2010 года па тэнісе настольным (адзіночны разрад), бронзавы прызёр чэмпіянату Еўропы 2010 года (камандная першынство)	
Вікторыя Азаранка	пераможца турніраў Сусветнай жаночай тэніснай асацыяцыі, 10-я ракетка свету па выніках 2010 года (адзіночны разрад)	

ТРЭНЕР ГОДА

Лаўрэатам конкурсу ў намінацыі «Трэнер года» прызнаецца трэнер, выхаванцы якога дабіліся ў 2010 годзе, па меркаванні журы і ўдзельнікаў папярэдняга галасавання, найбольш высокіх вынікаў на буйных міжнародных спаборніцтвах.

Намінанты	Кароткае апісанне	Выбар
Віктар Ганчарэнка	галоўны трэнер футбольнага клуба БАТЭ (г. Барысаў)	
Анатоль Буяльскі	галоўны трэнер жаночай нацыянальнай каманды РБ па баскетболе	
Мікалай Казека	галоўны трэнер нацыянальнай каманды РБ па фрыстайле	
Георгій Кандрацьеў	галоўны трэнер моладзевай зборнай каманды РБ па футболе	
Аляксандр Пяткевіч	галоўны трэнер нацыянальнай каманды РБ па тэнісе настольным	
Уладзімір Шантаровіч	галоўны трэнер нацыянальнай каманды РБ па веславанні на байдарках і каноэ	
Ірына Ляпарская	галоўны трэнер нацыянальнай каманды РБ па гімнастыцы мастацкай	
Аляксандр Яфімаў	старшы трэнер нацыянальнай каманды РБ па лёгкай атлетыцы, асабісты трэнер Надзеі Астапчук	

Прозвішча, імя, імя па бацьку ўдзельніка галасавання

Бюлетэні накіроўваюцца ўдзельнікамі галасавання па пошце або факсімільнай сувязі ва ўпраўленне фізічнай культуры, спорту і турызму адпаведнага аблвыканкама (Мінгарвыканкама) па наступных адрасах:

- Для жыхароў Мінска: 220123, г. Мінск, вул. В. Харужай, 13/61, факс 8-017 334-87-78, 334-24-00
- Для жыхароў Брэсцкай вобласці: 224030, г. Брэст, вул. Дзяржынскага, 46, тэл./факс 8-0162 22-16-65
- Для жыхароў Віцебскай вобласці: 210605, г. Віцебск, пр. Будаўнікоў, 10, факс 8-0212 21-53-79
- Для жыхароў Гомельскай вобласці: 246050, г. Гомель, вул. Савецкая, 28, факс 8-0232 74-23-61
- Для жыхароў Гродзенскай вобласці: 230023, г. Гродна, вул. Ажэшкі, 3, факс 8-0152 77-28-77, 77-32-89
- Для жыхароў Мінскай вобласці: 220012, г. Мінск, вул. Сурганава, 2, факс 8-017 287 -29 -16
- Для жыхароў Магілёўскай вобласці: 212030, г. Магілёў, вул. Ціміразева, 27А, факс 8-0222 22-57-90

Матэрыялы падрыхтавалі У. ЗДАНОВІЧ, І. ІВАНОВА, П. РАБУХІН, І. ЛАПАТО.

Валерый МАЛАШКА:

«Без масавага спорту мы не выхаваем алімпійскіх чэмпіёнаў»

Старшыня прадстаўніцтва НАК Беларусі ў Магілёўскай вобласці, намеснік старшыні Магілёўскага аблвыканкама Валерый МАЛАШКА падвёў вынікі 2010 года.

Фота Ірыны САВОСІНАЙ.

— Мы завяршылі год мерапрыемствамі ў гонар рэгіянальных журналістаў, якія папулярызавалі спорт і яго дасягненні, здаровы лад жыцця. У Нацыянальным алімпійскім камітэце сёння разумеюць, што без журналістаў наша праца не будзе эфектыўнай.

— Дзякуй за добрыя словы ў адрас журналістаў. Раскажыце, якія галоўныя падзеі ўзгадваеце, падводзячы вынікі года?

— Самая галоўная падзея — сярэбраны медаль, а для нас гэта перамога біятланіста Сяргея Новікава на Алімпійскіх гульнях у Ванкуверы. І, безумоўна, дасягненні нашых параалімпійцаў, якія таксама ўзышлі на п'едэстал. Усе прыярытэтныя спартыўныя напрамкі былі летась больш ці менш паспяховыя.

— Узгадайце іх, калі ласка.

— Мы традыцыйна робім націск на цяжкую атлетыку: у нас ёсць вядомыя трэнеры, поспехі ў Магілёве і Бабруйску. І я нават не сумняваюся наконт дастойнага выступлення нашых цяжкаатлетаў у Лондане.

У лёгкай атлетыцы ў нас ёсць дасягненні. Як тут не ўзгадаць Аксану Міньковy?

— У яе добрая навіна: нараджэнне дзіцяці.

— Праз месяц яна ўжо стала трэніравацца. У яе цяпер актыўны лад жыцця, яна таксама рыхтуецца да Лондана.

Андрэй Міхневіч у штурханні ядра — таксама наша надзея. Гэтыя віды спорту для нас былі заўсёды медаляёмістымі. Хоць так казаць, можа, і не варта...

— Каб не сурочыць!

— Але будзем спадзявацца на поспех. Таксама ж здараюцца і цуды: Антон Кароўкін і яго трэнер у стральбе з лука на юнацкіх Алімпійскіх гульнях якраз і стварылі такі цуд, атрымаўшы залаты медаль. Таму змагаемся за ўсё!

— У мінулым годзе ўпершыню на Магілёўшчыне прайшлі значныя міжнародныя спаборніцтвы.

— Гэта вельмі важна. У першую чаргу, гэта чэмпіянат Еўропы па валейболе сярод юніёраў. Мы дастойна прадставілі сваю краіну і рэгіён, атрымалі хвалебныя водгукі. Зручныя спартыўныя аб'екты, максімальная колькасць гледачоў. Вядома, нам давялося выдаткаваць грошы на паркет у Лядовы палац у Бабруйску. Але цяпер лядовая арэна трансфармуецца ў гульнявую залу за адну ноч. Там будуць не толькі хакей і канцэрты, але і валейбол, баскетбол і гандбол.

У нас таксама прайшоў моладзевы чэмпіянат свету па хакеі, паступілі і новыя прапановы. Спартакіяда для дзяцей Саюзнай дзяржавы была настолькі паспяховай, што яна пройдзе ў Магілёве яшчэ раз.

Нашы спартыўныя базы, якія мы стварылі ў папярэднія гады, выйшлі на міжнародны ўзровень і сталі запатрабаваныя. Гэта і папулярызацыя спорту, і самаакупнасць. Гэта грошы, якія «прыязджаюць» у рэгіён. Загружаны гасцініцы і сфера абслугоўвання. Калі ў Бабруйск прыехалі амерыканцы, то ў горадзе адразу зніклі інтэрнэт-карты падоўжанага часу, якія не былі запатрабаваны паўгода. Давялося тэрмінова папаўняць запас.

— Што ўсё ж такі галоўнае — масавы спорт ці спорт вялікіх дасягненняў?

— Не трэба супрацьпастаўляць, бо адно выцякае з другога. І што тут першаснае, а што другаснае? Мяне гэтае пытанне таксама хвалявала, бо фінансы патрабуюцца ў абедзвюх сферах. Без масавага спорту мы не выхаваем алімпійскіх чэмпіёнаў. Мы абавязаны гадаваць сваіх спартсменаў і прадстаўляць сваю краіну на сусветнай арэне. А потым выдаткаваныя на іх падрыхтоўку грошы вернуцца інтарэсам балельшчыкаў. Калі ёсць такія куміры, як Міньковa, Новікаў і Масяйкоў, у спорт прыйдуць дзеці, якія хочуць быць падобнымі на іх. Спартыўныя зоркі прыцягваюць не толькі сваімі дасягненнямі, але і здаровым ладам жыцця. Вось такія тут шчыльныя сувязі.

— Валерый Анатольевіч, вы ж яшчэ і старшыня федэрацыі баскетбола Магілёўскай вобласці?

— Так, але яшчэ і федэрацыі барацьбы. Мы, дарэчы, таксама маем надзеі на магілёўскую школу барацьбы: там хлопцы цяпер паказваюць сябе на міжнародным узроўні.

Што датычыцца баскетбола, то мы ўвесь год займаліся рэарганізацыяй каманды, якая цяпер называецца «Барысфен». Шукалі трэнераў, збіралі хлопцаў з усёй краіны. Я спадзяюся што гэты год стане годам прафесійнага росту каманды. Для нас гэта важна.

— А якім відам спорту займаецеся асабіста вы, калі не сакрэт?

— Хаця б раз на тыдзень плаваю ў басейне. Раней цікавіўся футболам, але гуляць з больш маладымі сапернікамі цяпер траўманебяспечна. Таму я займаюся, можна сказаць, інтэлігентным відам спорту — прагулкамі па горадзе з сабакам. І ў дадатак — велатрэнажор на балконе. Вось гэта я раблю штодня і пры любым надвор'і. А цяпер, узімку, сям'я абавязкова становіцца на лыжы.

— Якія планы ў прадстаўніцтва НАК у Магілёўскай вобласці на 2011 год?

— Нядаўна адкрыўся офіс прадстаўніцтва, а цяпер мы працуем над музейнай экспазіцыяй. Гэта таксама будзе аб'ектам папулярызацыі спорту.

А што датычыцца планаў, то мы не спыняемся. Застаюцца вялікія будоўлі: футбольны манеж, грабны канал, лядовыя арэны ў Шклове, Горках і Касцюковічах. Так што вялікія спаборніцтвы з цягам часу можна будзе пераносіць і ў рэгіёны: у такім разе будзе і сярод насельніцтва больш цікавасці да фізічнай культуры і спорту.

У Бабруйску пачнецца будаўніцтва залы для гульнявых відаў спорту. Максімальна будуць працаваць спартыўныя школы.

— І на заканчэнне: вашы навагодніе пажаданні.

— Любіце сябе ў першую чаргу і займайцеся спортам, колькі можаце. Любіце спорт і наведвайце спаборніцтвы, таму што пазітыўныя эмоцыі даюць зарад бадзёрасці. І любіце нашу Радзіму.

Увага!

ЗМЯНЕННІ Ў ПРАГРАМЕ ЛЕТНІХ ГУЛЬНЯЎ 2012

❍ Бейсбол і сафтбол выключаны з алімпійскай праграмы.

❍ **Бокс: зменшана колькасць вагавых катэгорый у мужчын з 11 да 10. Замест катэгорый 48, 51, 54, 57 кг уведзены 49, 52, 56 кг. Уведзены 3 вагавыя катэгорыі ў жанчын: 48—51, 57—60, 69—75 кг. Агульная колькасць дысцыплін павялічана з 11 да 13.**

❍ Веласіпедны спорт — трэк: з раскладу мужчынскіх спаборніцтваў па веласпорце выключаны індывідуальная гонка пераследавання, гонка па ачках і мэдысан, а дададзены омніум. У жанчын выключаны індывідуальная гонка пераследавання і гонка па ачках і ўведзены камандны спрынт, кейрын, камандная гонка пераследавання і омніум. Праграма спаборніцтваў у мужчын і жанчын ураўнаваная.

❍ **Веславанне на байдарках і каноэ: агульная колькасць дысцыплін засталася 12. У мужчын замест 4 дысцыплін на 500 м: байдарка-адзіночка, байдарка-двойка, каноэ-адзіночка, каноэ-двойка ўведзены 3 дысцыпліны на 200 м: байдарка-адзіночка, байдарка-двойка, каноэ-адзіночка. У жанчын дададзена байдарка-адзіночка на 200 м.**

❍ Парусны спорт: агульная колькасць класаў зменшаная з 11 (4 мужчынскія, 4 жаночыя, 3 адкрытыя) да 10. Выключаны адкрыты клас «Тарнада». У жанчын замест «Інглінга» ўводзяцца матчавыя гонкі.

❍ **Тэніс: агульная колькасць дысцыплін павялічана з 4 да 5 за кошт увядзення спаборніцтваў у змешаным разрадзе.**

❍ Фехтаванне: агульная колькасць дысцыплін засталася ранейшай — па 5 у мужчын і жанчын. Адбыліся дзве замены ў камандных спаборніцтвах. У мужчын замест шпажыстаў будуць спаборнічаць рапірысты, у жанчын замест шаблістак — шпажысткі.

❍ **Усяго замест 38 відаў спорту, аб'ядноных у 28 міжнародных федэрацый, у Лондане будуць прадстаўлены 36 відаў спорту з 26 федэрацый.**

❍ Усяго, як і ў Пекіне, будзе разыграна 302 камплекты ўзнагарод.

ВЯРТАННЕ КАЛЯДНАЙ БАТЛЕЙКІ

Дзякуючы ксяндзу Юзафу МАКАРЧЫКУ і мастаку-рэстаўратару Уладзіміру КІСЛАМУ, чалавеку праваслаўнага веравызнання, у Францішканскі касцёл Маці Божай Анёльскай у Гродне праз доўгія гады забыцця вярнулася яго жамчужына — каляндная батлейка, адзіная такая ў Беларусі. Яе сканструяваў не прафесійны майстар, спецыяліст па разьбярстве і механіцы, а былы пробашч гэтага касцёла айцец Аркадзь ВАЛЬТАСЬ. Аднак пасля яго смерці батлейка (фігуркі дзейных асоб і рухальны механізм) прыйшла ў заняпад і заставалася хіба што ў памяці прыхаджан — старажылаў.

І вось якраз да 35-гадавіны са дня смерці канструктара батлейкі яна зноў круціцца! І зноў захапленне ў вачах дзяцей, ды і дарослых!

Пра асобу стваральніка батлейкі айца Аркадзя Вальтася карэспандэнту «Звязды» расказаў ксёндз Юзаф Макарчык.

Пробашч Юзаф Макарчык і мастак-рэстаўратар Уладзімір Кіслы.

— Постаць майго папярэдніка на францішканскім прабастве ў Гродне айца Аркадзя Вальтася, мастака, музыкі, які жыў у 1916-1975 гадах, прымушае задумацца і здзівіцца. Гэта прыклад таго, як духоўная асоба ў цяжкія часы не адчайваецца і не зачыняецца ад людзей. Неаднойчы адчувае небяспеку, але ідзе да вернікаў, перадаючы ім святло Евангелля. Не згубіўшы свае таленты і асабістыя здольнасці, а здолеўшы іх памножыць.

Айцец Аркадзь Вальтась.

Ён маляваў яшчэ ў семінарыі, рабіў ілюстрацыі да часопіса моладзі «Bratni Zew». Бывала, хадзіў з сябрамі на пленэры маляваць эскізы з натуры, такіх пейзажаў захавалася больш за трыццаць, а іншыя знаходзяцца ў яго сяброў і знаёмых. Вялікі твор, які пакінуў айцец Аркадзь — «Чатырнаццаць стацый Крыжовага Шляху» — знаходзіцца ў касцёле Маці Божай Анёльскай у Гродне. У 1952-м ён правёў рамонт касцёла і пры гэтым сам намаляваў на столі біблейскія сцэны, праводзячы шмат часу на рыштаваннях.

Вялікае мастацкае дасягненне айца Аркадзя — атрыманне першага месца на ўсесаюзным конкурсе «Голуб міра». Яго голуб быў не падобны да іншых — не такі выразны, яго сілуэт расплываўся, зліваўся з блакітам неба. Такі нестандартны, сімпатычны галубок у палёце. Можа, удасца яго некалі знайсці. З усяго Савецкага Саюза гэты твор быў прызнаны лепшым. Дзяржаўныя ўлады спачатку не ведалі, што пераможца конкурсу — каталіцкі ксёндз. Калі ж зарыентаваліся, было позна: узнагарода ўжо была вызначана. Улады БССР знайшлі такое выйсце: дамовіліся з айцом Аркадзем, што ён не паедзе па ўзнагароду ў Маскву «з прычыны хваробы».

Айцец Аркадзь атрымаў мастацкую адукацыю. Працуючы капланам, вучыўся ў Інстытуце выяўленчага мастацтва ў Львове. А калі працаваў у Гродне, скончыў завочна Народны ўніверсітэт мастацтваў, факультэт жывапісу і графікі. Стварыў касцёльны хор моладзі, быў яго дырыжорам і акампаніятарам.

Пан Бог надзяліў айца Аркадзя і канструктарскімі здольнасцямі. Разумеючы, што дзяцей і моладзь можна прыцягнуць у касцёл вынаходніцтвам, сканструяваў рухомую батлейку Божага Нараджэння, адзіную такую ў Беларусі. Улады адразу забаранілі пускаць яе ў рух. І ўсё роўна гэтая батлейка выклікала ў Гродне захапленне, здзіўленне майстэрскім выкананнем, прыгожымі фігуркамі, якія зрабіў сам айцец Аркадзь. Меў ён і шмат іншых практычных здольнасцяў: умеў літаваць, рамантаваў гадзіннікі, ведаў радыётэхніку.

Дарэчы, я сустракаўся з арцыбіскупам Тадэвушам Кандрусевічам, і ён распавёў мне пра свае юнацкія ўражанні ад зробленай айцом Аркадзем Вальтасем батлейкі, калі ў 1961-1962 гадах прыходзіў у гэты касцёл. Паведаміў такі факт. Ідзе маленькае дзіця і кажа дзядулю, што побач з ім: «Зойдзем у касцёл». «Я ж не вернік, атэіст», — адказвае дзед. «Дзядуля, там жа цікава, усё круціцца...» Так малое дзіця і ўгаварыла пажылога чалавека зайсці ў касцёл, каб паглядзець на гэтую батлейку. І ўбачыць Бога праз гэтыя фігуркі.

Разам з пробашчам Юзафам Макарчыкам і Уладзімірам Кіслым стаім ля ўпрыгожанага да Каляд кута з батлейкай. Нічога звышскладанага ў тэхнічным плане быццам і няма. Кола, дзе размешчаны фігуркі дзейных асоб батлейкі, прыводзіцца ў рух электрарухавіком, які схаваны пад нізам. І кожная з фігурак, праязджаючы па пэўным месцы, чапляецца штокам, кавалкам дроту за зубец і выконвае сваю ролю. Лысы здымае капялюш, скрыпач іграе на скрыпцы, гітарыст — на гітары, хтосьці робіць паклон ...

— Вы з айцом Аркадзем у пэўным сэнсе калегі? — цікаўлюся меркаваннем мастака-рэстаўратара Уладзіміра Кіслага, які працуе ў Гродзенскім дзяржаўным музеі гісторыі рэлігіі.

— Так, і ў значным сэнсе. З замілаваннем гляджу на гэтыя фігуркі і думаю пра стваральніка батлейкі — не толькі духоўную асобу, але і неверагоднага ўмельца. Зараз, вядома, для гэтага ёсць вялікі выбар матэрыялу, рознай цікавай фурнітуры. А айцу Аркадзю даводзілася працаваць з тым, што меў. Скажам, колы для батлеечнай павозкі зроблены... з магнітафонных бабін. Усё астатняе — таксама з падручных, простых матэрыялаў. Але, можа, у гэтай прастаце і ўнікальнасць, шарм яго батлейкі.

...Пасля смерці айца Аркадзя батлейку яшчэ нейкі час можна было ўбачыць на Каляды, але затым яна разам з іншымі рэчамі апынулася на гарышчы касцёла. Некаторыя фігуркі засталіся без рукі альбо нагі, выйшаў са строю механізм. Мала хто з прыхаджан верыў, што батлейка вернецца. А аказалася — гэта рэальна! Па просьбе пробашча Юзафа Макарчыка за адраджэнне батлейкі, як раней касцёльных абразоў, сакральных рэчаў, скульптуры, узяўся мастак - рэстаўратар Уладзімір Кіслы. Паяў, кляпаў, падшываў, падмалёўваў. Не хапае нейкай часткі ў фігурках — дарабляў.

У майстэрні.

— Звычайны рамонт, — кажа Уладзімір, — сабе на радасць. І ўсім, хто цяпер узіраецца ў гэтае чароўнае кола з фігуркамі. У вечнае кола жыцця.

Дарэчы, з талентам айца Аркадзя Вальтася цяпер можна азнаёміцца і ў Гродзенскім дзяржаўным музеі гісторыі рэлігіі, дзе экспануецца выстава яго акварэляў.

Барыс ПРАКОПЧЫК.
Фота Яраслава ВАНЮКЕВІЧА.

Навагодняя казка

АНЁЛАК З КРАІНЫ ЦУДАЎ, альбо Што адбываецца ў кніжцы, якую дачыталі?

ЁЛКА стаяла прыбраная, тата ўрачыста замацаваў на вершаліне зорачку. Мама зрабіла багаты стол. Усё, як належыць прыстойнай сям'і. Прыгожа апранутыя дзеткі ў радочак паселі на канапе — кожны падрыхтаваў вершык ці песню, як таго патрабуюць правілы, і быў гатовы выступіць перад Дзедам Марозам. Так рабілі спакон веку: кожны агучваў сваё жаданне, атрымліваў жаданае. Праўда, з кожным годам прыдумваць жаданні было ўсё цяжэй, вось як на гэты раз. Але ўсё адно чакалі новага года і яго пасланца. Але той чамусьці марудзіў, не адчыняў дзверы хаты, каб свята напоўніла яе ціхім шчасцем. Хоць у іх казачнай краіне так было заўсёды.

Малыя прыслухоўваліся да гукаў: ці не ідзе хто? Але погляд мамы з татам быў скіраваны на гадзіннік. Стрэлкі яго нібыта прыляпіліся да аднаго моманту, застылі на нейкім імгненні паміж старым і новым гадамі. Яны не рушылі далей. Але свечкі амаль дагарэлі. Як такое можа быць? Нешта здарылася... Тата з мамай трывожна пераглядаліся: у іх казцы такога не магло быць, таму што аднойчы і назаўсёды добра перамагло зло і з таго часу героі перажывалі толькі добрыя і светлыя пачуцці, а цуды не сыходзілі з іх жыцця.

— Можа, гэта нейкі зусім нечаканы цуд, і Дзед Мароз рыхтуе асаблівае віншаванне? — тата вырашыў удакладніць інфармацыю ў казачным бюро. Ён паведаміў назву казкі і чакаў абгрунтаванага адказу.

— Ну як дзеці ўсё роўна... — уздыхнула ў адказ каардынатарка казачных праектаў. — Вы думаеце, вы ў яго адны? Ён жа Дзед Мароз, ён жа Санта Клаус, ён жа Святы Мікалай... Вас шмат, а ён адзін. Уяўляеце, колькі ў яго адрасоў? Таму ён з некаторых часоў прыходзіць толькі да тых, дзе патрэбныя сапраўдныя цуды, дзе ўсё яшчэ недасканала. А ў вас жа ўсё даўно цудоўна і прыгожа, усе мары збыліся, ні ў кога ніякіх жаданняў няма. Дык чаго вы яшчэ хочаце?

— Дык гэта значыць, што ён больш ніколі не прыдзе? — не мог паверыць тата. — Выбачайце, але ў нас жа Новы год не наступіць і мы застанемся ў мінулым... Што рабіць у такім выпадку?

— Гэта значыць толькі адно: ваша казка скончылася. Нехта дачытаў і закрыў кніжку. Адпачывайце, пакуль зноў хтосьці не зацікавіцца і не разгорне яе.

ТАТА з мамай супакоіліся: усё ідзе па законе казкі. Яны паклалі дзетак у ложак, цмокнуўшы іх у шчочкі, паведамілі, што на гэты раз галоўны цуд будзе раніцой пасля абуджэння. Патушылі свечкі і ўлегліся спаць — соладка і, магчыма, доўга.

Спакой ахінуў хату. Усе мірна пасопвалі ў сваіх ложках. І толькі адно малое ніяк не магло заснуць: няўжо гэта справядліва, калі дзеці застаюцца без святочнай казкі? І хто пасля гэтага будзе казаць, што ў іх усё добра? Малое ўжо падумала заплакаць, як праз шчыліну паміж фіранкамі літаральна яму ў вочкі зазірнула зорачка. Яна была такая яркая і настойліва-радасная, што адганяла ўсе непатрэбныя думкі. Малое адкінула коўдру і пасунулася да акна. Нешта дзіўнае адбывалася навокал: на палянцы, вакол галоўнай ёлкі, вадзілі карагоды суседзі па казках. Цудоўныя феі спявалі песні — іх гукі станавіліся ўсё гучней. Феерверкі расквечвалі неба. «Вось дык свята, вось дзе Новы год, і без нас», — засмуцілася малое. І ў гэты момант тая самая зорка на небе яму падмігнула. «Як жа я хачу, каб казка працягвалася...» — падумала малое. І ў гэтае імгненне зорка ўспыхнула і імкліва кінулася ўніз. «Ой... Тата, напэўна, моцна расстроіцца, што з-за мяне на адну зорку ў небе стала менш. Што цяпер будзе?!. А калі яна з якой-небудзь Вялікай Мядзведзіцы? Ці хоць бы Малой... Як жа змогуць знайсці гэтыя сузор'і? А калі яна — Венера, святло якой нараджае новыя казкі?.. Трэба яе вярнуць на месца», — малое глянула на тых, што радаваліся за акном, ні пра што не здагадваючыся і шмыганула да дзвярэй.

Боцікі, куртка, шапка, шалік... Люстэрка таямніча пазірала на маленькую істоту. А тая рашуча рушыла да выхаду: пасля таго, як знаёмая Аліса пабывала ў Залюстроўі, яно ўжо не асабліва вабіла. Пайсці туды — толькі час згубіць, а тут жа за дзвярыма чакае дапамогі зорка.

Святочная ноч сапраўды здавалася светлай. Вуліца — такой жа жывой, як і ўдзень. Малое ішло ад адной хаты да другой і дзівілася. Вось воўк і заяц разам заводзяць песні. Дзяўчынка ў чырвоным капялюшыку частуе святочным пірагом любімую бабулю. Там — тата Карла разам з Карабасам глядзяць і радуюцца, якімі зоркамі сталі іх любімыя лялькі на чале з Бураціна. Тут — шахматная каралева наладзіла дыскатэку для ўсяго каралеўства і цяпер нават пешкі ходзяць як хочуць. А вось усе жыхары чароўнай Нарніі з любоўю ўзгадваюць ільва Аслана, які заснаваў іх краіну і падарыў ім надзею. Нават у хаце Бабы Ягі поўна людзей — яна наладзіла атракцыён «катанне ў ступе» і больш не адчувае сябе адзінокай. Значыць, Дзед Мароз прыходзіў! Гэта ж ён зрабіў святочны цуд, калі ва ўсіх усё добра, ніхто нікога не крыўдзіць, усе дапамагаюць адзін аднаму. Гэта ён даў магчымасць паверыць, што дабро ў казках здольныя стварацьіх насельнікі, і ўсё насамрэч залежыць ад таго, наколькі моцна яны гэтага хочуць.

МАЛОЕ глядзела і думала, што цуды, напэўна, немагчыма заказаць і атрымаць па разнарадцы. Іх немагчыма прадказаць і чакаць у пэўны момант — бо якія ж гэта цуды? Але яны здараюцца — з тымі, хто ў іх верыць. І яны могуць быць зусім не такімі, якімі мы іх уяўлялі. Нам здаецца, што ў казкі ёсць толькі адзін раз і назаўсёды прыдуманы канец, але заўсёды бываюць варыянты... Якая дзіўная была тая зорка, што дапамагла гэта зразумець. Вось дык цуд! Хіба не дзеля гэтага цуду яна падала з неба? Малое ўсміхнулася, бо зразумела: яны з зоркай насамрэч усю гэтую ноч імкнуліся адно да аднаго.

Ля самай апошняй хаты, што стаяла на ўскрайку вуліцы, было ціха. Здалёк падавалася, што там ніхто не жыве. Аднак яе акаляла цёплае святло, дарожку выслалі празрыстыя промні. Яны вырываліся ад акенца і здаваліся такімі надакучлівымі, што амаль... знаёмымі. Малое пастукалася ў дзверы. Не было ніякіх сумненняў, хто там чакае.

Зіхатлівы камячок адчыніў дзверы і ўсміхнуўся:

— Ты хацеў казку? Калі ласка! Так не бывае, каб нехта застаўся без свята, калі яно вельмі патрэбна.

Малое здзівілася. У памяці прайшоў увесь апошні вечар, тата з мамай, браты з сястрычкамі, вершыкі і песенькі, якія яны рыхтавалі. Трэба ж бегчы, усіх пабудзіць і сказаць пра святочны цуд!

— Не спяшайся. Іх казка скончылася. Твая толькі пачалася. Цяпер яна будзе жыць асобна ў гэтай хаце. Гэта пра цябе напішуць новую кніжку, таму што твая няўрымслівая цікаўнасць і надзея зрушыла час. Гэта для цябе пачаўся новы адлік. Да цябе прыйшоў Новы год, будзем знаёміцца...

ЯНЫ сядзелі і размаўлялі ўсю ноч. Маленькі, толькі што народжаны Новы год — і чыстае сэрцам малое чалавечага роду. Той, у каго немагчыма паверыць, і тая істота, якая ўмела верыць, калі гэта здавалася немагчыма. Малое зразумела, што да некаторых у пэўныя моманты можа прыходзіць стары Дзед Мароз, калі нічога ўжо не паправіш, акрамя як цудам. А некаторыя чыстыя сэрцам, самі таго не ведаючы, могуць сустрэць яго маленькага нашчадка-анёлычыка. Малое даведалася, што зорка, якая прынесла яму Новы год, згарэла на зямлі, але замест яе абавязкова народзіцца новая. Бо колькі яшчэ жаданняў такіх жа няўрымслівых малых прыйдзецца здзяйсняць — не хопіць зорак, калі яны не будуць нараджацца зноў. Закон прыроды. Закон жыцця. Закон цуду.

Ларыса ЦІМОШЫК.

Занатоўкі мастака

СІНІЦА І ГОЛУБ

Толькі верасень пачаўся, а за маім акном з'явілася сініца. Раніцаю яна разгульвае па бляшаным падаконні або сядзіць на прыдарожнай ліпе, а заўважыўшы мяне, уздымаецца ў паветра і вісіць за шыбаю на адным месцы, машучы трапятлівымі крылцамі. Ну як такой сініцы ты не дасі пачастунак? Тым больш, калі ад мінулае зімы застаўся вялікі шкляны слоік з чорнымі семкамі. Не паспее сініца здзяўбсці пару-тройку семачак, як на падаконне апускаецца голуб. Ён праганяе маленечкую сініцу і здзёўбвае ўсе чыста семкі, а яшчэ нахабна зазірае круглым вокам у маю варэльню, маўляў, — мала яму! Верасень, у скверах і парках поўна ягад і розных семак. Можна і не карміць сініцу, можна і не частаваць галуба. Але ж як ты ім адмовіш, калі яны так настойліва просяць?

АЛЕША, ХУДЫЯ І ТОЎСТЫЯ

У часы майго дзяцінства ўсе моцна не любілі таўстуноў. Мы — худыя, вечна галодныя, а ён глядзіце-глядзіце — сыты! На гэтай нянавісці да поўных людзей Юрый Алеша выбудаваў цэлы рэвалюцыйны раман пра трох таўстуноў, якіх паскідала з тронаў народная гняўлівасць. Тады раман Алешы «Тры таўстуны» быў страшэнна папулярны, а ў кінатэатры, дзе ішла экранізацыя, выстройваліся бясконцыя чэргі. Цяпер ніякіх таўстуноў ва ўладзе няма. Таўстуны збольшага станоўчыя і ў нечым малашчаслівыя людзі. Народ пачаў шкадаваць таўстуноў. Сёння тоўстыя лічацца за добрых, а худыя — за злых, што таксама маласпраўдліва.

ГОЛУБ І ПАЛЁТ

Нават у мёртвым целе птушкі застаюцца лёгкасць і ўспаміны пра палёт... У Мінску шмат хворых і мёртвых галубоў. Хворыя птушкі выглядаюць жахліва. Такое адчуванне, што яны наведалі пекла і нейкім неверагодным чынам вярнуліся ў наш з табою звычайны свет. Птушыныя хваробы, напэўна, з'ява сезонная. Спадзяюся, што эпідэмія хутка скончыцца. Спадзяюся, бо нічым не магу дапамагчы хворым галубам, акрамя выказанага словамі спачування...

Такі запіс я зрабіў у верасні, а ў кастрычніку хворыя птушкі зніклі, што моцна мяне парадавала.

ПТУШАНЁ І САЮЗ МАСТАКОЎ

На падаконне ўпала птушанё. Некалькі імгненняў яно ляжала, нібыта мёртвае. Раптам вочка расплюшчылася і востра зіркнула на мяне праз тоўстую шыбу. Я адчыніў акно. Птушанё перапалохалася і кінулася ўніз. Я выйшаў на вуліцу, каб паглядзець... Ці не разбілася? Ці не зламала крыло? Самае горшае, што можа быць у кар'еры ваеннага лётчыка: збіццё падчас узлёта. Ты яшчэ нічога не паспеў, ты толькі-толькі... А цябе ўзялі ды збілі. Так і з птушанём... Я не хацеў, каб яно загінула падчас сваёй першай спробы ўзляцець. Птушанё знайшлося каля дзвярэй. Убачыўшы мяне, яно пырхнула і пераляцела з ганка на газон. З травы птушанё ўзнялося на дрэва... Вялікае жыццё ўзнялося на новы ўзровень для аднаго маленечкага птушаняці, што моцна мяне ўзрадавала. Маё асабістае жыццё нікуды не ўзнялося. Мяне запрасілі паспрабаваць уступіць у Саюз мастакоў, я доўга збіраў дакументы і рэкамендацыі. Сабраў. У Саюз мяне не прынялі, бо я «не грамадзянін». Рада доўга разбірала маю літаратурную творчасць, Грыша Сітніца зачытваў цытаты з кнігі «сУчаснікі» і казаў, што я кепска стаўлюся да людзей. Вова Савіч згадваў устаў Саюза, дзе гаворыцца пра маральнае аблічча ягоных членаў... Лёня Хобатаў гучна падтрымаў шматгалосае абурэнне маімі літаратурнымі опусамі. Усе выступоўцы яшчэ казалі, што я выдатны і таленавіты мастак, што гучала асабліва цёпла, пранікнёна і душэўна. Такіх літаратурных чытанняў у мяне яшчэ не было! Адзін Грыша зрабіў у кніжцы «сУчаснікі» дзясятак закладак для цытавання. І чытаў, чытаў, чытаў... Рада прагаласавала 16 на 28; большасць, зразумела, супраць майго членства. Перажыву. Перажываў і не такое. Я не птушанё, якое лёгка збіць на ўзлёце. Я ўмёю лётаць. Высока.

...У час, калі я пісаў гэты тэкст, пад Баранавічамі ўпаў і разбіўся вайсковы самалёт.

ДОКТАР ЧЭХАЎ І ЧОРТ

У апавяданні доктара Чэхава «Вядзьмарка» дзяк Ксаверый Гыкаў гаворыць жонцы, якую лічыць д'яблавай служкай: «Не, баба, хітрэй за ваш бабскі род на гэтым свеце і пачвары няма! Сапраўднага розуму ў вас — ні Божа мой, менш, чым у шпака, затое хітравання чортавага — у-у-у! Уратуй Царыца Нябесная!» Сам доктар Чэхаў у лісце да спадара Білібіна кажа: «Я ведаю, «Вядзьмарка» не ў Вашым характары, ды і шмат каму яна не спадабалася... Але што зробіш! Няма тэм, ды і чорт падпіхвае руку такія штукі пісаць...» Прачытаеш такога, і думка мільгане: «Доктар Чэхаў, як і доктар Фаўст — свалата! Геніяльная свалата — доктар Хауз, як і доктар Чэхаў!»

ПОЎНЯ І ЖВАЧКА

Пад вялізнай, абедзвюма рукамі не падняць, поўняю ішоў праз вечаровы чорна-сіні сквер. На вершалінах дубоў гучна перагаворваліся вароны. Адзін час іх не было; але скончыўся грукатлівы рамонт опернага тэатра, і вароны вярнуліся на вершаліны сваіх улюбёных дубоў ды клёнаў. На самым пачатку дубовай алеі да мяне падышлі дзве дзяўчыны. «У Вас жвачкі не будзе?» — «У Вас жвачка ёсць?» Адразу два аднолькавыя пытанні паляцелі ў мяне. Адно пытанне больш пахла алкаголем, чым тытунём. Другое было больш задымленае, чым праспіртаванае. Дзяўчыны былі такія шчаслівыя і такія вясёлыя, што мне захацелася выпіць, закурыць і застацца з імі ў восеньскім скверы пад вялікай, дзвюма рукамі не абняць, поўняю. Толькі, білі-бом-цілі-гром, жвачкі ў мяне не знайшлося.

БАСЁ І МАСКА МАЛПЫ

У Японіі існаваў звычай у час навагодняга свята вадзіць па горадзе малпу. Дзеля жартаў і весялосці на галаву малпе надзявалі маску малпы. Людзі смяяліся і не заўважалі, што і яны, апранаўшы свае лепшыя і святочныя строі, па сутнасці, зусім не змяніліся, як тая малпа ў масцы малпы. Басё так апісаў традыцыю:

У масцы малпы
малпа весяліць натоўп
штогод, як заўжды...

Адам ГЛОБУС.

Хакей. КХЛ

Спыняючы «Лакаматыў»

РЭГУЛЯРНЫ чэмпіянат КХЛ уступіў у такую фазу, калі кожны згублены бал можа каштаваць той ці іншай камандзе месца ў плэй-оф. Застаецца актуальнай барацьба за васьмёрку мацнейшых у Заходняй канферэнцыі і для беларускага прадстаўніка мацнейшай лігі Еўропы. Прыемна, што апошнімі матчамі мінскае «Дынама» яскрава прадэманстравала свой патэнцыял кубкавага ўдзельніка, здолеўшы ў гасцях перамагчы ніжагародскае «Тарпеда» і яраслаўскі «Лакаматыў».

Шостага студзеня «зубры» правялі ў Ніжнім Ноўгарадзе амаль што самы галоўны матч апошняга месяца. Мяцовае «Тарпеда» — адзін з асноўных канкурэнтаў беларусаў у барацьбе за выхад у плэй-оф. Гэты паядынак стаў адметным таксама дэбютам у складзе «дынамаўцаў» чарговага навабранца — канадца Данііэля Карсо. На жаль, адначасова з гэтым на пляцоўку не змог з-за траўмы выйсці Максім Спірыдонаў.

Беларусы распачалі матч актыўна. Ужо на першай хвіліне мог вызначыцца Плат — выратаваў галкіпер гаспадароў Бруклер. Адразу ж «Тарпеда» адказала небяспечным выхадам на вароты Мезіна. А на 9-й хвіліне гаспадары адкрылі лік. Мінчане адказалі шайбай Петра Сікоры. Другі перыяд атрымаўся весялейшым за першы. Заўзятары на трыбунах, сярод якіх быў і вялікі «дэсант» з Сінявокай, пабачылі чатыры шайбы. Спачатку хуткім дуплетам стрэлілі Плат і Стэфановіч, а пасля такой жа парай хуткіх шайб адказалі «тарпедаўцы». На трэцюю, галоўную дваццаціхвілінку, супернікі выйшлі пры ліку 3:3. І, што галоўнае для беларускіх прыхільнікаў, далей лічбы змяняліся толькі ў бок гасцей. Спачатку дубль афарміў Сікора, а потым апошні «цвік» забіў Штумпел. Славак наогул пачынае выходзіць на свой звыклы зорны ўзровень — на яго рахунку ўжо 25 галявых балаў.

Супрацьстаянне з яраслаўскім «Лакаматывам» абяцала стаць значна цяжэйшым. «Чыгуначнікі» зараз з'яўляюцца мацнейшай камандай не толькі Заходняй канферэнцыі, але і ўсёй КХЛ. Не дзіўна, што на матчы сваіх любімцаў сабралася паўнюткая (усе 9000 гледачоў) «Арэна-2000-Лакаматыў». Паглядзець сапраўды было на што. Каманды не закінулі шмат шайб, аднак прадэманстравалі роўную, напружаную гульню. Лік, у другім перыядзе, адкрыў канадзец Корса, добра выкаціўшыся на пятачок і замкнуўшы перадачу Міхалёва. Яраслаўцы ў адказ абрынулі цэлую серыю атак на вароты Мезіна, аднак галкіпер «зуброў» у гэтым перыядзе быў непрабіваемы. І толькі на 47-й хвіліне кідок Рахунэка дазволіў гаспадарам зраўняць лік і перавесці гульню ў авертайм. Праўда, у дынамаўцыў быў яшчэ шыкоўны момант на апошніх секундах асноўнага часу, аднак Мялешка не здолеў закінуць з гульні. Затое Дзмітрый выправіўся ў серыі булітаў: менавіта яго кідок прынёс «дынамаўцаў» такія неабходныя балы — 2:1 на карысць беларусаў.

Яўген ВАРАКСА.

Людзі падаюць...

У Баранавічах за выхадныя да траўматолагаў звярнуліся больш за 80 чалавек.

Усе яны атрымалі траўмы ад падзення. У асноўным, гэта немаладыя людзі, якія, як правіла, пражываюць у сельскай мясцовасці ці на ўскраінах горада, дзе вуліцы не пасыпаюцца пяском. Траўмы пераважна звязаны з пераломамі рук і ног.

Сымон СВІСТУНОВІЧ.

Беларускі вынаходнік сканструяваў новы від мотаўсюдыхода

БЕЛАРУСКІ вынаходнік, аспірант Інстытута цепла- і масаабмену Нацыянальнай акадэміі навук Віктар Саверчанка сканструяваў новы транспартны сродак для язды па непраходнай мясцовасці — глайдар.

Як расказаў малады вучоны БЕЛТА, па тэхнічных характарыстыках глайдар найбольш падобны на мапед і скутар. Аднак у адрозненне ад іх новы транспартны сродак важыць значна менш — каля 30 кг і вызначаецца большай праходнасцю. «Глайдар забяспечаны самалётным рухавіком і прыводзіцца ў рух за кошт аэрадынамічнай цягі паветранага вінта, — патлумачыў Віктар Саверчанка. — Дзякуючы гэтаму ён можа ездзіць там, дзе не можа праходзіць, напрыклад, мапед або скутар».

На глайдары можна свабодна перамяшчацца па пяску, снезе, лёдзе. Ён развівае хуткасць да 80 км у гадзіну. Высокае размяшчэнне сілавой установкі дазваляе рухацца нават у вадзе на глыбіні да 60 см. Новы від мотатэхнікі абсталяваны веласіпеднымі педалямі, за кошт чаго карыстальнікі могуць ездзіць на ім пры выключаным рухавіку. У цэлым глайдар дастаткова эканамічны і не расходуе шмат бензіну.

Паводле слоў вынаходніка, распрацаваны ім транспартны сродак можа паспяхова выкарыстоўвацца супрацоўнікамі лясной гаспадаркі і эколагамі — для патрулявання тэрыторый, супрацоўнікамі Міністэрства па надзвычайных сітуацыях. Акрамя гэтага, інавацыя можа быць запатрабаванай і спецыялістамі аператыўных службаў, асабліва ва ўмовах пробак на дарогах.

Глайдар быў прадстаўлены на Моладзевым інавацыйным форуме ў Мінску і атрымаў на ім высокую адзнаку.

«ПАДКЛАЎ»... СВІННЮ

Праваахоўнікі расшукваюць нахабніка, які ноччу выкраў з хлява 69-гадовай пенсіянеркі свойскую жывёліну.

Здарэнне, паводле звестак аддзялення інфармацыі і грамадскіх сувязяў УУС Мінаблвыканкама, мела месца ў вёсцы Замкі, што ў Крупскім раёне. Невядомы, пакуль усе спалі, свабодна зайшоў у двор, а пасля і ў хлеў, адкуль яму ўдалося забраць свінню. Між іншым, зніклая жывёліна ацэненая ў 2 мільёны рублёў. Па факце заведзеная крымінальная справа.

Ігар ГРЫШЫН.

ФАЛЬШЫЎКІ НА ДОЛАРЫ

У разлікова-касавы цэнтр філіяла аднаго з банкаў прыйшоў жыхар Светлагорска, каб абмяняць 110 000 рублёў на долары. Пры гэтым на чатырох беларускіх купюрах наміналам 20 і 50 тысяч рублёў не было вадзяных знакаў, мікравалокнаў і магнітнай паласы.

Пры аглядзе дома беспрацоўнага мужчыны, аднак, не было знойдзена аналагічных несапраўдных грашовых білетаў ці неабходнай камп'ютарнай тэхнікі. Цяпер праваахоўнікі высвятляюць, адкуль з'явіліся фальшыўкі.

ПРЫЦІСНУЎ БАМПЕРАМ

Рабочы адной са станцый тэхнічнага абслугоўвання ў Мазыры атрымаў сур'ёзныя траўмы на месцы працы.

Установлена, што кіроўца загнаў «Газэль» на яму і зрабіў запуск рухавіка, пасля чаго аўтамабіль самаадвольна крануўся з месца, з'ехаў у назіральную яму, пры гэтым пярэднім бамперам прыціснушы да сцяны спецыяліста СТА. Як паведамілі ў прэс-службе УУС Гомельскага аблвыканкама, пацярпелы дастаўлены ў бальніцу з пераломамі верхніх рэбраў, ударам грудной клеткі і пнеўматараксам. Прычыны здарэння стануць зразумелымі пасля праверкі.

Ірына АСТАШКЕВІЧ.

НА ВУЛІЦЫ ГАЯВОЙ ВЕЧАРАМ...

Позна вечарам прадавец аднаго з баранавіцкіх магазінаў вярталася дадому. На вуліцы Гаявая да яе падышлі двое і адабралі два залатыя пярсцёнкі і завушніцы. Аднаго рабаўніка аператыўнікі выявілі — ім аказаўся 17-гадовы вучань вячэрняй школы. А вось яго саўдзельніка шукаюць.

Сымон СВІСТУНОВІЧ.

20.01.2011 г. в 16.00 состоится внеочередное общее собрание акционеров ОАО «Сантехэлектромонтаж».
Повестка дня:
1. О приобретении акций ОАО «Сантехэлектромонтаж» на баланс Общества.
Собрание будет проходить по адресу: г. Гомель, ул. Троллейбусная, 8-А.
Начало регистрации участников собрания — 15.30. УНП 400052115

20.01.2011 г. в 14.00 состоится внеочередное общее собрание акционеров ОАО «Гомельжилпроект».
Повестка дня:
1. О выплате дивидендов.
Собрание будет проходить по адресу: г. Гомель, ул. Кирова, 17.
Начало регистрации участников собрания — 13.30. УНП 400022625

У **суд Кобрынскага раёна Брэсцкай вобл.** паступіла заява аб аб'яўленні памерлым Каравана Юрыя Яўгенавіча, 7 ліпеня 1959 года нараджэння, ураджэнца г. Кобрын, Брэсцкай вобл., апошняе вядомае месца жыхарства: Расійская Федэрацыя, г. Масква, вул. Вялікая Серпухаўская, д. 46/5, кв. 107, месца знаходжання якога невядомае.
Просім усіх грамадзян і юрыдычных асоб, якія маюць звесткі пра Каравана Юрыя Яўгенавіча, паведаміць суду Кобрынскага раёна на працягу двух месяцаў з моманту публікацыі.

Утерянный представительством Белгосстраха по Московскому району бланк страхового полиса по добровольному страхованию от несчастных случаев и заболеваний формы 2РН серии БН № 0380566 считать недействительным. УНП 101883943

Утерянный представительством Белгосстраха по Фрунзенскому району бланк квитанции о приеме наличных денежных средств по обязательному страхованию строений, принадлежащих гражданам, серии КО № 0434295 считать недействительным. УНП 101883943

ШАШКІ

Пад рэдакцыяй міжнароднага арбітра Мікалая ГРУШЭЎСКАГА

ЧЭМПІЯНАТ СВЕТУ

Ён праводзіўся па шашачнай кампазіцыі ў раздзеле эцюдаў-100. Залаты, сярэбраны і бронзавы медалі адпаведна заваявалі Міленка Лэпшыч (Харватыя), Аляксандр Маісееў (ЗША) і Іаган Басціянет (Нідэрланды). У ім удзельнічалі і прадстаўнікі нашай рэспублікі. Лепшы вынік сярод іх паказаў мінчанін Васіль Грабенка. Ён фінішаваў чацвёртым і выканаў норму майстра ФМЖД. Восьмае месца заняў Леанід Вітошкін (Гомель), 14-е — Іван Наўроцкі, 16-е — Барыс Іваноў, 18-е — Віталь Варушыла (усе трое з Мінска).

Паспяхова справіліся са сваімі абавязкамі арбітры В. Бяляўскас (Літва), Е. Зубаў (Расія), А. Кацюха (Украіна) і суддзя-каардынатар В. Шульга (Беларусь).

У рамках нашага **бліца-59/2** разгледзьце эцюд В. Грабенкі, які ў катэгорыі С увайшоў у першую шасцёрку, бо атрымаў добрую ацэнку — 58 ачкоў:

Белыя: дамкі 19,20, 26, 31 (4). **Чорныя:** дамкі 17, 21 (2). Выйгрыш.

АЎТАРСКІ-13

Яго працягвае гросмайстар СССР Л. Вітошкін сваімі заданнямі:



№ 3. **Белыя:** b2, b6, e7, f6, g7 (5). **Чорныя:** a7, c3, c5, d4, e5, g3 (6).

№ 4. **Белыя:** a3, c5, g5, h2, h4 (5). **Чорныя:** c3, c7, d4, e3, e5, f8 (6).

У абодвух перавага на баку белых.

Пераможцы стануць першакласнымі рашальнікамі, іх чакаюць сюрпрызы ад аўтара, а развязаўшыя ўсе заданні выканаюць альбо пацвердзяць норму другога спартыўнага разраду па шашках.

КАМБІНАЦЫЯ НА РАЗВІТАННЕ

А міжнародны гросмайстар Уладзімір Матус (Масква) свой аўтарскі конкурс-11 завяршае заданнем № 16:



Белыя: 16, 23, 24, 27, 29, 30, 31, 32, 39, 41 (10). **Чорныя:** 6, 8, 10, 12, 13, 18, 22, 26, 35 (9). Перамога белых.

* * *

Тэрм

СВЯТА НА СМАК,

ці Абавязкова паспрабуйце паўтарыць гэтыя фокусы ў дамашніх умовах

НАШЫ заходнія суседзі ў навагоднюю ноч прадбачліва бавяцца буракамі. Сытна, пажыўна, жыватворна — як любы суп. З такім цудоўным пачастункам любы святочны цуд пройдзе на ўра! Да яго абавязкова падаюць сухарыкі (нешта з прэснага цеста, карацей). Самі буракі ў польскім выкананні гушчынёй не вызначаюцца. Хутчэй, да булёнчыку падобныя. Так што бой курантаў палякі сустракаюць, можна сказаць, сёрбаннем! А ўвогуле Новы год для іх — свята больш кампанейскае, чым сямейнае: нагода для вулічных гулянняў, радаснага ўлюлюкання і канцэртаў на цэнтральных плошчах. Сёлета варшаўскую публіку парадаваў, дарэчы, Roxette.

А іспанцы, пакуль гадзіннік б'е 12, спрабуюць з'есці роўна столькі ж вінаградзінак — па адной на кожны месяц года. Просты і прыемны спосаб дадаць дзівоснасці святу.

Хочаце прасякнуцца магіяй па-італьянску? Тут не абысціся без сапраўднага чараўніка. Але ж хіба не бывае цудаў у святы?! І вось ён перад вамі — та-дам! — італьянскі шэф-повар Іньяцыа РОЗА. Той, хто гатаваў для Клінтана і Павароці, цяпер робіць гэта і для чытачоў «Звязды». Так-так, з яго чарадзейнымі парадамі кожны з вас стане чараўніком... прынамсі ў кулінарыі. У гэтым пераконваемся падчас адмысловага майстар-класа для журналістаў, арганізаванага Philips.

Вуаля! Сапраўдны чарадзей ад кулінарыі Іньяцыа Роза дзеліцца з чытачамі «Звязды» сакрэтам сваіх гастранамічных «фокусаў».

Усё, да чаго ні дакранецца майстра, ператвараецца ў шэдэўр — так бы мовіць, і для вока, і для страўніка. І нягледзячы на тое, што мяса ён запякае гадзінамі (пры нізкіх тэмпературах — каб не высушвалася і не страчвала сваю сакавітасць), часу дарма не губляе. Усё гатуе паралельна: адна рука ля качкі, другая — ля бараніны. Па кухні лётае бы маланка. Пры гэтым паспявае перасыпаць стравы не толькі ўласнаручна прыгатаванымі прыправамі, але і востранькімі жартамі. «Я не плачу ад цыбулі, гэта цыбуля плача ад мяне!». І рухі такія зладжаныя, адточаныя, шпаркія — таму, відаць, ад вока назіральніка хаваецца чарадзейная палачка спрытнюгі. Як інакш патлумачыць усе гэтыя фокусы? Калі як па ўзмаху рукі сухая курыная печань ператвараецца ў найдалікатнейшы мус, чырвоная цыбуля карамелізуецца і становіцца салодкім ласункам, а, здавалася б, неспалучальныя селядзец ды апельсін удала гарманіруюць? Пакуль адбываюцца ўсе гэтыя кулінарныя метамарфозы, звернем увагу на самога Іньяцыа Розу.

Халерык, схільны да роздуму. Кулінарны мэтр, для якога галоўны аўтарытэт у гастраноміі — уласная матуля. Жартаўнік, здольны на чуллівы аповед. У Беларусі Іньяцыа марыць правесці дабрачынны кулінарны фестываль і дапамагчы пацярпелым дзеткам-чарнобыльцам, а мо і адкрыць кухарскую школу для іх. Прыкіпеў, відаць, душой да нашай радзімы. Нездарма ж вечны вандроўнік, які налятаў ужо амаль 40 тысяч міль і змяніў 21 пашпарт (столькі віз там перабывала), затрымаўся ў Беларусі на тры гады і з'яджаць пакуль не збіраецца. Якасцю беларускіх харчоў задаволены — ежа, кажа, натуральная, жывёлу выкормліваюць без гармонаў. Адна бяда — захоўваць прадукты, кансервавацьды перапрацоўваць пакуль не навучыліся... Ну і нарэшце, згрэбны кухар, целаскладу якога пазайздросціць любая мадэль — самы пераканаўчы довад на карысць таго, што адмаўляцца ад ежы злачынна! Варта проста ведаць, ШТО і ЯК есці. Прынцып «сняданак з'еш сам, вячэру — аддай ворагу» ніхто не адмяняў. Солі ў вашым ужытку павінна быць на вагу золата. Рыбай ды садавіной з гароднінай можна цешыцца ўволю. Абмежаванні лепш пакінуць для мяса — асабліва чырвонага. Ялавічынай, скажам, ласавацца не часцей за два разы на тыдзень. Ну і, у рэшце рэшт, перасоўвацца крыху хутчэй! Ды не толькі па кухні.

МАГІЧНЫЯ САКРЭЦІКІ:

- гатуйце на аліўкавым алеі — здаравей будзеце
- перац, які змелеце самі, будзе духмянейшы за куплены
- выбірайце апрацоўчыя дошкі з пластмасы — драўляныя ўсё ўсмоктваюць, і вы рызыкуеце «ўмяшаць» колішнюю страву ў новую, што само па сабе несімпатычна і негігіенічна
- памятайце, што дзеці ў Афрыцы галадаюць, і згадвайце пра гэта кожны раз, як зберацеся выкінуць нейкія харчовыя рэшткі. Гароднінныя абрэзкі прыдатныя, напрыклад, для булёну, а з садавінавых можна самім гатаваць цукаты. Усё ў дом!
- Калі вы любіце пікантнасць, якую надае стравам часнок, але стараецеся пазбягаць пікантных сітуацый кшталту «І чаму гэта навакольныя падчас гутаркі ад мяне адварочваюцца?», выйсце адно — пастэрызаваць. Фокус просты: паўкіло часнаку з літрам алею — у харчовую плёнку і на гадзіну ў духоўку пры 100 градусах. Смак дае, паху аніякага, ды яшчэ і захоўваецца доўга. Казка!

Ну і, нарэшце, самыя рэальныя рэцэпты:

Патэ з курынай печані

На шырокую патэльню, палітую аліўкавым алеем, кладзём зубчыкі часнаку і цыбулю буйнымі кавалкамі. Калі падрумяняцца, далучым да іх каперсы і — нечаканасць — анчоусы (здавалася б, рыба з печанню, але ж якія тонкія адценні могуць падарыць такія нетрывіяльныя спалучэнні — карацей, даверцеся прафесіяналу). Пасля — і курыную печань. Хлеб (у Італіі гэта дражджавая факача, а ў нас на тое ёсць цудоўны батон) буйнымі кавалкамі пускаем следам. Хвілін праз 10—15 падліваем у наша кулінарнае спакушэнне белае віно. Даём нашай страве «набрацца». Перчым і заліваем смакату... ялавічным булёнам (прасякнуліся ўжо, колькі ў нас нюансаў смаку?!). Яшчэ хвілін праз 10 здымаем з агню.

Прыгатаваную пячонку — напрасцяк у блэндар, тэхніка ператворыць яе ў мяккі паштэт. Частавацца ім будзем з грэнкамі і цыбулькай — не простай, а карамелізаванай. На 1 кг чырвонай цыбулі вазьміце 150 г карычнага цукру, духмяную палачку карыцы, суквецце чабору, размарыну ды мяты. Дадайце сок, выціснуты з 100 г апельсінаў, і 150 г чырвонага сухога віна. І няхай сабе варыцца наша цыбуля ў гэтым салодкім сіропе на невялікім агні, пакуль не ператворыцца ў такую гусценькую цягучую масу. Эфект ад такой цыбулі — сапраўды магічны. Яна не проста здаецца вам цуда-слодыччу, але і быццам бы абмывае паднябенне пасля паштэту. Эх, не горш, чым у Таскане! Смакуем!

Салата з селядца і апельсінаў

І без таго малюпаценькія чэры рэжам напалам, драбнютка шаткуем чырвоную цыбулю. Апельсін вызваляем ад абцугоў лупіны і костак. Фігурна наразаем яго тонкімі долькамі, а селядзец — саломкай. Дадаем пікантныя смакавыя нюансы: арэгана, базілік, перац, кедравыя арэшкі. Запраўляем аліўкавым алеем. Такая вось простая ў прыгатаванні сіцылійская экзотыка: спрытнасць рук і ніякага махлярства. Упэўненая, яна вам прыйдзецца даспадобы. Чаруйце!



Экзатычная салата з селядца і апельсінаў гатуецца лёгка і проста.

Ала МАЧАЛАВА.
Фота Аляксея КАЗНАДЗЕЯ.

У кагосьці ёсць дзеці, у кагосьці ўжо выраслі, а побач з намі жывуць хлопчыкі і дзяўчынкі, у якіх сёння няма бацькоў. Іх мала проста любіць, ім трэба дапамагчы перажыць гора разлукі з роднымі, дапамагчы стаць самастойнымі і заняць годнае месца ў жыцці.

Сацыяльна-педагагічны цэнтр з сацыяльным дзіцячым прытулкам Маскоўскага раёна г. Мінска шукае адказных і клапатлівых прыёмных бацькоў, бацькоў-выхавальнікаў дзіцячых дамоў сямейнага тыпу, гатовых узяць на выхаванне ў сваю сям'ю дзяцей-сірот.

Бацькі-выхавальнікі заключаюць дагавор аб умовах выхавання і ўтрымання дзяцей з мясцовым выканаўчым і распарадчым органам (орган апекі і папячыцельства), прыёмным бацькам час працы залічваецца ў працоўны стаж, належыць аплатны водпуск, на ўтрыманне дзяцей — штомесячныя грашовыя выплаты. За прыёмнымі дзецьмі захоўваюцца ўсе сацыяльныя гарантыі.

Памятайце — Вы можаце падарыць нашым дзецям шчаслівае дзяцінства, а самі набудзеце такое жаданае бацькоўскае шчасце!

Па больш падрабязную інфармацыю звяртайцеся ў ДУА «Сацыяльна-педагагічны цэнтр Маскоўскага раёна г. Мінска» па адрасе: г. Мінск, вул. Рафіева, 33. Наш кантактны тэлефон 277 32 50.

УНП 190745520

У МІНСКУ НА 1000 ГАРАДЖАН ПРЫПАДАЕ 337 АЎТАМАБІЛЯЎ

У Мінску забяспечанасць стаяначнымі месцамі для аўтамабіляў складае менш за 50% ад сённяшняй патрэбнасці. Адна з прычын гэтага — высокі ўзровень аўтамабілізацыі, які ўжо сёння перавысіў прагнозны паказчык на 2015 год і складае 337 машын на 1000 гараджан. Для параўнання, у 1960—80-х гадах на такую ж колькасць мінчан прыпадала ўсяго паўсотні аўтамабіляў.

Ігар ГОЛАД, «Мінск—Навіны».

СКАНВОРД

Склаў Андрэй МІХАЙЛАЎ.



Шануй сваё

ДАЎГАДЗЮБЫ ВЯЛІКІ КУЛЁН СТАЎ БЕЛАРУСКАЙ ПТУШКАЙ ГОДА-2011

Ужо традыцыйна штогод спецыялісты грамадскай арганізацыі «Ахова птушак Бацькаўшчыны» выбіраюць птушку года. Птушкай 2011 года ў Беларусі стаў вялікі кулён.

Вялікая група кулікоў Беларусі аб'ядноўвае больш як 35 відаў птушак. У большасці яны жывуць на шырокіх прасторах балот, на вільготных лугах, часцей за ўсё заліўных, — як натуральных, так і штучных сельскагаспадарчых, — у поймах рэк і на былых тарфяніках. А вось самым буйным куліком Беларусі лічыцца вялікі кулён, паведаміў рэдакцыі **спецыяліст па экалагічнай адукацыі АПБ Руслан ШАЙКІН**.

Вага даўгадзюбага куліка часам дасягае кілаграма, прытым, што самкі крыху большыя за сваіх крылатых «мужыкоў».

Знешнасць у кулёна вельмі асаблівая. Размах яго крылаў дасягае 110 сантыметраў. Гэта нават больш, чым у добра вядомай усім шэрай вароны. Першае, што адразу кідаецца ў вочы, — гэта доўгая выгнутая данізу дзюба, якая нагадвае маленькую школьную ўказку. Менавіта гэта выгнутая «ўказка» адрознівае кулёна ад усіх іншых беларускіх кулікоў. Як і ў іншых жыхароў балот і заліўных лугоў, у кулёна доўгія ногі з шырока расстаўленымі пальцамі, што дазваляе птушцы спакойна вандраваць па розных вільготных мясцінах.

У перакладзе з нямецкай наш кулён (кроншнеп — рус.) азначае «каралеўскі кулік». І сапраўды, памеры птушкі і яго высокая постаць адпавядаюць гэтаму шляхетнаму тытулу. Блізкім сваяком вялікага кулёна з'яўляецца сярэдні кулён. Яны вельмі падобныя, толькі сярэдні крыху меншы і мае на галаве светлыя палоскі.

Вызначыць у прыродзе каралеўскага куліка па яго ўнікальнай дзюбе можа любы школьнік, аднак заўважыць гэтую птушку не заўсёды проста. Кулён вельмі пужлівы і асцярожны, таму людзей блізка да сябе не падпускае. Справа ў тым, што і сёння ў Беларусі дазваляецца веснавое паляванне. Нягледзячы на тое, што страляць «чырванакніжных» кулікоў катэгарычна забаронена, аднак часам паляўнічаму цяжка стрымацца, калі пад руку трапляе буйны кулён. Кажуць, што на мушку могуць трапіць нават кнігаўкі.

Гняздуюць кулікі на адкрытых балотах і вільготных лугах. Гнёзды будуюць на зямлі, на купіне травы або асакі, якая выступае з вады (спарадычна на астраўках сярод балот). Часам на сухіх месцах лугу недалёка ад балацін. У невялікай ямцы робіць высцілку з сухой мінулагодняй травы або асакі і некалькіх пёраў. У кладцы заўсёды 4 яйкі. Гэта грушападобныя, шэра-аліўкавыя або папяліста-жоўтыя «жывыя каменьчыкі» з нерэальна цёплым адценнем. Менавіта такімі яйкі кулікоў убачыла мая старэйшая дачка летась на журавінавым балоце. Тады Палінка своечасова заўважыла гняздо з яйкамі, аднак магла і наступіць. Так, гэта галоўная праблема, бо месцаў, дзе можа рабіць свае гнёзды кулён, становіцца ўсё менш. Калі каралеўскія кулікі пачынаюць гнездавацца недалёка ад населеных пунктаў, тады іх «хатку» з яйкамі могуць разбурыць бадзяжныя сабакі. У лесе на кладку кулёна паспяхова палююць лісіцы і янотападобныя сабакі. Даволі добра навучылася шукаць гнёзды кулікоў наша шэрая варона. У гэтым паляванні варонам дапамагаюць людзі. Пабачыўшы чалавека, кулён адразу пакідае гняздо, пачынае вакол лётаць і плаксівым голасам кліча на дапамогу. Для разумнага шэрага драпежніка плаксівая песня з'яўляецца добрым сігналам для таго, што недзе побач варона можа падхарчавацца яйкамі куліка.

Першыя кладкі ў вялікага кулёна з'яўляюцца ў апошняй дэкадзе красавіка. Потым, на працягу амаль чатырох тыдняў бацькі па чарзе грэюць кладку. Напрыканцы мая на свет вылупляюцца птушаняты, якія адразу пачынаюць «бегаць» за дарослымі птушкамі і шукаць насякомых і чарвякоў. Спачатку дзюба ў кулёнаў адносна невялікая, аднак ужо праз пару тыдняў гэтая «ўказка» вырастае ў даўжыню і моцна загібаецца ўніз. Менавіта гэтым уласным прыстасаваннем кулёны, як пінцэтам, могуць вельмі спрытна здабываць розных беспазваночных на балотах, лугах, пад каменьчыкамі і ў вадзе ўздоўж рэк і вадаёмаў. Часам могуць харчавацца нават спелымі ягадамі і насеннем.

У вырай кулёны адлятаюць ужо ў ліпені—жніўні. Мігруюць індывідуальна, часам сем'мі ці невялікімі чародкамі. Зімуюць нашы кулёны ў больш цёплых мясцінах Заходняй Еўропы, у басейне Міжземнага і на паўднёвым узбярэжжы Каспійскага мора. Некаторыя кулёны зімуюць на ўсходзе Японіі, Малайскім архіпелагу і Барнэа, на Аравійскім паўвостраве і ўзбярэжжы Афрыкі.

Колькасць вялікага каралеўскага кулёна ў апошнія дзесяцігоддзі ў Еўропе істотна скарацілася. Гэты кулік нае еўрапейскі ахоўны статус SPEC-2. Устойліва памяншаецца колькасць каралеўскіх кулікоў у многіх еўрапейскіх краінах, у тым ліку ў Вялікабрытаніі, Францыі, Швецыі, Нарвегіі, Фінляндыі, Украіне, Літве, Эстоніі, а магчыма, і ў іншых. У Беларусі колькасць кулёна складае каля 950—1200 пар на гнездаванні. Колькасць гэтая адносна стабільная, што, аднак, не выключае вялікага аптымізму, бо сустрэць вялікага кулёна яшчэ паўстагоддзя таму магчыма было амаль каля кожнай рэчкі і на ўсіх больш-менш вільготных тэрыторыях нашай краіны.

Увогуле **сумны лёс мае эскімоскі кулён**. Вядома, што ў 18 стагоддзі велізарныя чароды эскімоскіх кулёнаў з боку арктычнай тундры і адкрытых лугоў Канады і Аляскі рэгулярна мігрыравалі на зімоўку ў пампасы Аргенціны. У той час эскімоскі кулён быў самым шматлікім куліком Паўночнай Амерыкі. Колькасць іх дасягала некалькіх мільёнаў. У 70-х гадах 19 стагоддзя гэтыя кулікі актыўна здабываліся паляўнічымі. Напрыканцы 19 стагоддзя эскімоскі кулён быў цалкам знішчаны.

Нацыянальная кампанія «Птушка года» праводзіцца з 2000 года грамадскай арганізацыяй «Ахова птушак Бацькаўшчыны» (АПБ), якая з'яўляецца нацыянальным партнёрам сусветнай прыродаахоўнай асацыяцыі BirdLife International у Беларусі. Асноўная мэта кампаніі — фарміраванне грамадскага меркавання аб каштоўнасці і неабходнасці захавання птушак. Штогод выбіраецца від птушак, які мае пэўныя праблемы і патрабуе нашай увагі і дапамогі. У розныя гады «птушкамі года» станавіліся **белы бусел, белая пліска, авяльга, дамовы верабей, гарадская ластаўка, барадатая кугакаўка, кнігаўка, звычайны салавей, вялікая белая чапля, шэрая гусь, сокал-пустальга**. У рамках гэтай кампаніі праводзяцца разнастайныя конкурсы, акцыі і прыродаахоўныя мерапрыемствы. Птушкай 2011 года абвешчаны вялікі кулён.

Спецыялісты АПБ невыпадкова расказваюць нам пра тое, што эскімоскі кулён знік па віне людзей, якія не мелі меры і не ведалі спачування. Ад сябе асабіста я параіў бы паляўнічым наступнае: больш уважліва прыглядайцеся да птушак, калі вы ў чарговы раз ускідваеце стрэльбу. Доўгую дзюбу «чырванакніжнага» кулёна лёгка заўважыць. А арнітолагі і сябры АПБ просяць усіх жыхароў Беларусі адмовіцца ад веснавога палявання. Людзі і птушкі павінны жыць разам.

Сяргей КУРКАЧ.

ДАВЕДКА «ЗВЯЗДЫ»

Маецца 8 відаў кулёнаў. У Беларусі гняздуецца толькі два віды — вялікі і сярэдні. Абодва занесены ў Чырвоную кнігу Беларусі. У асобных сваякоў нашых кулёнаў праблемы значна большыя. Зусім мала засталося далёкаўсходніх кулёнаў, занесеных у Чырвоную кнігу Расіі. Практычна адсутнічае інфармацыя аб еўрапейскай папуляцыі танкадзюбага кулёна ўжо на працягу апошніх 80 гадоў. Звычайнай птушкай гэты «танкадзюбік» лічыўся ў Тунісе, Марока і Алжыры. Цяпер па крытэрыях Міжнароднага Саюза аховы прыроды статус танкадзюбага кулёна лічыцца крытычным на глабальным узроўні.

ПРАВЕРЫЦЕ, КАЛІ ЛАСКА, АДМКАЗЫ
Па гарызанталі: Багацкіе. Енка. Эрг. Апаш. Рэна. Плот. «Apri». Mari. Кварціра. Ліфнік. Акт. Трава. Сумятра. Аск. Кап. Дамка. Берэда. Бар. Гліва. Каа. Мора. Пён. Такт. Амагар. «Лада». Іван. Тона. Самагіт. **Па вертыкалі:** Сертыфікат. Рлок. Ржа. Амбат. Вёска. Мэта. Калюча. «Лю-бэ». Гуталін. Чэгаласа. Атава. Пара. Арахіда. Нікта. Ост. Тэрас. Шліць. Бак. Імжа. Домра. Рым. Танкетка. Лік. Радар. Шлюк. Сана. Атлянт.

СЁННЯ

Сонца

	Усход	Захад	Даўжыня дня
Мінск —	8.23	16.11	7.48
Віцебск —	8.20	15.54	7.34
Магілёў —	8.14	16.01	7.47
Гомель —	8.03	16.06	8.03
Гродна —	8.37	16.28	7.51
Брэст —	8.30	16.36	8.06

Месяц

Першая квадра 12 студзеня. Месяц у сузор'і Авена.

Імяніны

Пр. *Ганны, Варвары, Наталлі, Івана, Марка.*

К. *Ганараты, Марты, Мацільды, Аляксандра, Гілярыя, Фелікса.*

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

НАДВОР'Е на заўтра



11 студзеня

1563 год — надрукавана Брэсцкая Біблія. Выдадзеная ў Брэсце на сродкі аднаго з кіраўнікоў кальвінізму ў ВКЛ, берасцейскага старасты Мікалая Радзівіла Чорнага. «Брэсцкая Біблія», або «Радзівілаўская Біблія» — адно з самых поўных і лепшых выданняў таго часу ў ВКЛ і Польшчы. Гэта самая вялікая і багата аформленая беларуская друкаваная кніга XVI стагоддзя. У ёй змешчаны поўны тэкст Старога і Новага запаветаў. Практычна на кожнай старонцы маюцца каментарыі. Упершыню ў гісторыі кнігадрукавання на Беларусі змешчаны прадметны паказальнік. Пасля смерці Радзівіла Чорнага яго сын, Мікалай Радзівіл Сіротка, з'яўляючыся заўзятым католікам, загадаў сабраць пратэстанцкія брэсцкія выданні бацькі і спаліць іх — так загінула і большая частка накладу Брэсцкай Бібліі.

1919 год — у Савецкай Расіі ўведзена харчразвёрстка — абавязковая здача сялянамі «лішкаў» хлеба дзяржаве.

Цытата дня:

«Гонар мужчыны да таго адрозніваецца ад гонару жанчыны, што апошні глядзіць на першага як на ворага свайго».

Э.-П. Башэн (1748—1824), французскі пісьменнік.

150 ГАДОЎ З ДНЯ НАРАДЖЭННЯ Е. Ф. КАРСКАГА

11 студзеня 2011 года Міністэрства сувязі і інфарматызацыі Рэспублікі Беларусь выпускае ў абарачэнне канверт з арыгінальнай маркай «150 гадоў з дня нараджэння Е. Ф. Карскага». Мастак канверта і спецштэмпеля Мікалай Рыжы.

ФЛОРА. АХОЎВАЕМЫЯ РАСЛІНЫ БЕЛАРУСІ

10 студзеня 2011 года Міністэрства сувязі і інфарматызацыі Рэспублікі Беларусь выпусціла ў абарачэнне паштовая маркі «Першацвет высокі», «Ятрышнік абпалены» з серыі «Флора. Ахоўваемыя расліны Беларусі». Мастак Аляксандр Міцянін.

Усміхнемся

Амаль у кожнага пасля Новага года з'явіцца па дзве праблемы: 1. Мы хіба фатаграфаваліся? 2. Дзе той мярзотнік, у якога ўсе фотаздымкі?...

☺

— Мілы, так хочацца чагосьці цёплага, светлага...

— Піва будзеш?

☺

Злавіў Раман Абрамовіч Залатую рыбку. І з'еў...

☺

Урач пытаецца ў пацыента:

— Як спіце?

— У піжаме, без абутку і ў цемры.

☺

Вартаўнік склада энергетычных напояў не спіць ужо 17 дзён, але радыцыя ўсё адно кудысьці знікае.

☺

Парыж. У паліцэйскай машыне па радыё раздаецца каманда:

— Увага, экіпаж 4102, адпраўляйцеся на Елісейскія Палі, там па вуліцы ідзе аголеная жанчына.

Пасля невялікай паўзы:

— Усім астатнім экіпажам заставацца на месцах!

☺

Кожны кот лічыць, што рыба значна смачнейшая на дыване ў калідоры, чым у месцы на кухні!

ЗВЯЗДА
БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА
ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь
РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА.

Галоўны рэдактар У. НАРКЕВІЧ. РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: І. БАРАНОЎСКІ, С. ГРЫБ, У. ЗДАНОВІЧ (намеснік галоўнага рэдактара), Н. КАРПЕНКА, Л. ЛАХМАНЕНКА, С. ПРОТАС (намеснік галоўнага рэдактара), С. РАСОЛЬКА, Л. РЫЖАНКОВА (першы намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК, І. ШЧУЧЭНКА.

НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, падпіскі і распаўсюджвання — 287 18 36, 287 18 51, юрыдычнага — 287 19 68, скаратарыята — 292 05 82, адказных за выпуск дадаткаў: «Чырвоная змена» — 292 44 12; «Мясцовае самакіраванне» — 292 21 03, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20 37 98, Віцебску: 43 23 74, Гродне: 43 25 29, Гомелі: 40 91 92, Баранавічах: 47 71 94, Магілёве: 32 74 31; бухгалтэрыі: 292 22 03.

http://www.zviazda.by;

e-mail: info@zvyazda.minsk.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zvyazda.minsk.by

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значкам, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛД № 02330/0494179 ад 03.04.2009. 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 250 разоў на год.

Тыраж 33.310. Індэкс 63850. Зак. № 121. Нумар падпісаны ў 19.30.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12